# ВОДАР ІСЦІНЫ

*Выбраныя старонкі з татарскіх кітабаў*



Мусульманскае рэлігійнае аб’яднанне ў Рэспубліцы Беларусь

# ВОДАР ІСЦІНЫ

*Выбраныя старонкі з татарскіх кітабаў*

Укладанне, пераклад з арабскай і адаптаваны пераклад са старабеларускай і польскай мовы: Давуд Радкевіч

## Змест

Змест ..... 4

Прадмова ..... 10

Зварот да чытачоў ад складальніка Кітаба Івана Луцкевіча ..... 10

ІМАН ..... 20

1. Асновы іману ..... 22
2. Іман і справы ..... 22
3. Як трэба верыць у Бога ..... 23
4. Які Бог? ..... 25
5. Значэнне веры ў Бога ..... 26
6. Дзе Аллаг? ..... 27
7. Усё ад Бога ..... 28
8. Заступніцтва Прарока ﷺ ..... 29
9. Прадвызначанае не мяняецца ..... 29
10. Анёлы запісваюць усе ўчынкі ..... 30
11. Якая вера лепшая? ..... 30

Што павінен ведаць і ўмець рабіць вернік? ..... 31

Адказы на пытанні (існад нашага веравучэння) ..... 32

12. Усе людзі – з аднае душы ..... 34
13. Біблія пацвярджае праўдзівасць ісламу ..... 34
14. Абяцанне Божае ..... 35
15. Стаўленне да смерці ў ісламе ..... 37
14. Чалавек пазнаецца па справах ..... 37
15. Што любіш – з тым і будзеш ..... 38
16. Добрая і дрэнная смерць ..... 38

17. Радасць сыходу ........................................ 38
18. Смерць верніка ........................................ 39
19. Аб смерці няверніка ........................................ 40
20. Сіджын – месца душ нявернікаў ........................................ 42
21. ‘Ілійюн – месца душ вернікаў ........................................ 43
22. Хто будзе ў Сіджыне і ‘Ілійюне ........................................ 44
23. Табліцы Азраіля ........................................ 44
24. Час Суднага дня ........................................ 47
25. Хто не будзе мець страху ў Судны дзень? ........................................ 47
26. Адыход ад веры *(рыдда)* і вяртанне ў іслам ........................................ 48
27. Якое лякарства ад граху і нявер’я? ........................................ 51
28. Як уберагчы іман ........................................ 51
29. Што ўмацоўвае іман, а што губіць ........................................ 52
30. Не губляйце надзею ........................................ 52
ІСЛАМ ........................................ 54
1. Усім імамам трэба верыць ........................................ 56
2. Асновы практыкі ісламу ........................................ 57
3. Абавязковае для кожнага ........................................ 57
4. Катэгорыі ўчынкаў ........................................ 59
5. Важнасць чысціні ........................................ 60
6. Абавязковыя элементы малога ўмывання ........................................ 61
7. Калі гусль рабіць абавязкова ........................................ 62
8. Намаз ........................................ 62
Важнасць намазу ........................................ 62
Абавязковасць штодзённага намазу ........................................ 63

9. Вартасць суры «Фаціха» ........ 63
10. Пашана да імама і муэззіна ........ 64
Вартасць азану ........ 64
11. Вартасць джамаат-намазу ........ 65
12. Дуа пасля намазу не бывае без адказу ........ 66
13. Абавязковасць намазу і закяту ........ 66
14. Што шайтан любіць, а чаго – баіцца ........ 66
15. Дыялог Прарока ﷺ з шайтанам ........ 67
16. Сакрэт аховы ад шайтана ........ 68
17. Дапамога праз пост і намаз ........ 68
18. Пост месяцу Рамадан – абавязковы ........ 68
Час поснікання ........ 70
Каштоўнасць Рамадана ........ 71
Важнасць выплочвання фітрэ ........ 72
19. Што рабіць у дзень байраму? ........ 73
20. Святыя ночы ........ 73
21. Ухвальныя ўчынкі ........ 74
22. Як чыніць курбан ........ 75
Вартасць курбану на Судны дзень ........ 77
23. Дзень Ашура ........ 78
24. Аб шанаванні пятніцы ........ 79
Набажэнства пятніцы лепш за забавы і за гандаль ........ 79
Азан і салях ........ 80
Ці можна ў пятніцу працаваць? ........ 81
Суннаты пятнічнага дня ........ 82

25. Смерць і пахаванне ........................................................ 83
Як да канаючага чалавека прыступіць ........................................ 83
Пакінь завяшчанне родным ........................................................ 84
26. Як трэба ў шлюбе жыць ........................................................ 84
27. Што такое харам ................................................................. 85
Блуд – харам .............................................................................. 86
Харам на чужое цела глядзець .................................................. 87
28. Нельга падманваць у гандлі ................................................ 87
29. Сцеражыцеся хараму, каб выбавіцца ад Пекла! ................... 88
Ключ да Пекла і ключ да Раю ................................................... 91
30. Небяспека хараму ................................................................ 91
ІХСАН ........................................................................................ 93
1. Калі Бог цябе не забудзе? ...................................................... 93
2. У чым сэнс цяжкасцяў? .......................................................... 93
3. Як вызваліцца ад грахоў? ...................................................... 94
Бойцеся Бога ............................................................................. 94
Прабачайце людзям .................................................................. 94
4. Хто будзе ў Раі? ..................................................................... 95
5. Якая вартасць садакі? ............................................................ 96
Што губіць садаку? ................................................................... 97
Што важней за садагу? ............................................................. 98
Як лепш даваць садагу? ............................................................ 99
6. Чаму трэба шанаваць бацькоў? ............................................. 99
Калі можна не паслухацца бацькоў? ....................................... 101
7. Як шанаваць сірот? .............................................................. 102

8. Як здабыць ласку Божую? .......... 104
9. Як падоўжыць свой век? .......... 104
10. Як трэба шанаваць суседзяў? .......... 105
11. Як шанаваць гасцей? .......... 107
12. Як шанаваць старых? .......... 108
13. Чаму трэба шанаваць вучоных? .......... 109
14. Каго хоча Рай? .......... 110
15. У чым вартасць Кадыр-ночы? .......... 111
16. Як і чаму трэба шанаваць пятніцу? .......... 114
17. Як паводзіцца ў мячэці? .......... 114
18. Як іслам ставіцца да ведаў? .......... 115
Невук горш за быдла .......... 115
Ці трэба вучыць жанчын? .......... 115
Вучоны і невук .......... 116
Вучоба – абавязак кожнага .......... 117
Якая справа найкарыснейшая? .......... 117
19. Якая вартасць чытання і слухання Кур’ана? .......... 118
20. Якая вартасць ветлівасці? .......... 118
22. Бяры прыклад з лепшых .......... 119
23. Расплата за грахі .......... 120
24. Як здабыць дабро ўжо на гэтым свеце? .......... 120
25. Хто шчаслівы? .......... 120
26. Хто разумны? .......... 120
27. Хто такі мусульманін? .......... 121
28. Каго любіць Бог? .......... 121

29. Якія асноўныя чалавечыя якасці і як іх зберагчы? .......................... 121
30. Што ўпрыгожвае чалавека? ................................................................ 122
Тры гісторыі з кітабаў ................................................................................ 124
Гісторыя пра абіда ................................................................................... 124
Дыялог Мусы з Богам ............................................................................... 125
Прыпавесць пра падзяку ......................................................................... 125
Выкарыстаная літаратура ............................................................................ 126
Дадатковая літаратура для самастойнага вывучэння ................................ 126

# Прадмова

Напрод Божа імя ўспамінайма,
Мілосць у нутрах сваіх уфундуем
Першы і Астатні Ён, Вечны,
Да кожнай рэчы Моцны,
ніхто Яму непадобны, Адзіны ест.

———

*З кітаба Івана Луцкевіча*

Многія жыхары Беларусі, Літвы і Польшчы ведаюць, што акрамя хрысціян і іўдзеяў побач з імі здаўна жывуць і мусульмане. Вызнаюць іслам тут прадстаўнікі розных народаў, якія ў розныя часы абралі гэтыя краі сваім домам. Ёсць сярод нагайцы, кыпчакі, пяцігорцы (чаркесы). Татары – адзін з такіх народаў, але будзе больш дакладным казаць пра тое, што гэта агульная назва для ўсіх мусульман былога Вялікага Княства Літоўскага.

Менавіта яны сталі першымі насельнікамі-мусульманамі на нашых землях. Гэта невялікая супольнасць склалася тут у XIV – XVI стст. і даволі паспяхова інтэгравалася ў шматканфесійную і шматэтнічную сям’ю народаў ВКЛ. Татары служылі ў войску, займаліся агародніцтвам, рамізніцтвам, гарбарствам ды іншымі рамёствамі. Але не толькі сегасветныя клопаты займалі іх. Нашмат больш яны надавалі ўвагу пытанням вечнасці: вучыліся маліцца Богу самі і навучалі дзяцей, пісалі і перапісвалі рукапісы: хамаілы, тафсіры, кітабы.

Кітабы татараў-мусульман былога ВКЛ – асаблівы, ні на што не падобны від рукапісаў. Такога няма бадай што нідзе ні на Ўсходзе, ні на Захадзе – толькі ў нас, татараў Усходняй Еўропы. Што ўяўляе сабой кітаб? Звычайна гэта свайго роду энцыклапедыя ісламу для самых дапытлівых, дасціпных вернікаў, якія шукаюць адказы на свае разнастайныя пытанні: што такое іслам і хто такі мусульманін? хто мы такія наогул і дзеля чаго жывем на белым свеце? Як належыць будаваць адносіны з Богам, людзьмі і з самім сабой?

У штодзённым карыстанні дзеля практыкі ісламу пашыраны былі невялікія кішэнныя кніжачкі – хамаілы. Кітаб жа быў сродкам больш

глыбокага разумення нормаў і перакананняў ісламу, матывацыі і натхнення вернікаў.

Каротка скажам пра даследчыкаў кітабаў. Першым, хто пачаў сур'ёзна і глыбока даследаваць гісторыю татараў-мусульман на беларускіх землях, прынята лічыць вучонага-арыенталіста, які паходзіў з татарскага роду на Наваградчыне, прафесара цюркалогіі Пецярбургскага ўніверсітэта Антона Мухлінскага. Менавіта ён адкрыў навуковаму свету багацце гісторыі і культуры ісламу, і абраў новы накірунак даследавання. Яшчэ падчас наведвання ім краін мусульманскага Усходу, знаёмячыся з глыбокімі традыцыямі іслама, ён пераканаўся, што спасцігнуць іх немагчыма без ведаў пра гісторыю мясцовых татараў. Дзякуючы яго працам набылі вядомасць працы Ібрагіма Печэві і «Рысале-і татар-і лех» невядомага пілігрыма з ВКЛ, напісаныя ў Асманскай імперыі. Самая вядомая праца Мухлінскага – «Даследаванне пра паходжанне і стан літоўскіх татар», выдадзеная ў 1857 г. у Пецярбургу, стала першай працай такога роду. У канцы «Даследавання…» дадзены транслітараваныя фрагменты рукапісаў літоўскіх татар з арабскага на кірылічнае і лацінскае пісьмо. Адзін з іх прыведзены ў гэтай кнізе.

У другой палове XIX ст. гісторыю і культуру татар даследавалі Ю. Барташэвіч, А. Брукнер, Т. Нарбут і інш. У большасці сваіх прац гісторыкі, арыенталісты, этнографы гэтага часу ўжо разглядалі татар-мусульман былой Рэчы Паспалітай як самастойную этнічную групу, аб'ект навуковых даследаванняў.

Першая палова XX ст. стала пэўнай вехай у гістарыяграфіі гісторыі іслама ў Беларусі, своеасаблівым працягам даследаванняў XIX ст. 20 – 30 гг. мінулага стагоддзя сталі знакавымі для вывучэння гісторыі і культуры беларускіх мусульман, асабліва іх пісьмовай спадчыны – беларускіх арабаалфавітных тэкстаў. Славуты беларускі адраджэнец І. Луцкевіч у 1915 г. атрымаў яго ў 1915 г. у вёсцы Сорак Татар ад тамтэйшага імама Сцяпана Паўтаракевіча кітаб першай паловы XVIII ст. У 1920 г. ён паведаміў пра гэта ў друку, на што адгукнуўся славуты вучоны-беларусіст Я. Карскі.

У гэты час пэўнае месца займаюць і працы доктара Я. Станкевіча. Ён апублікаваў тэкст легенды «Мірадж» (прысвечаную выдатнай падзеі з жыцця прарока Мухаммада, больш вядомую пад назвай «аль-Ісра ўа-ль-Мі’радж»). Абагульняючай працай па гэтай тэме стала навуковая праца «Беларускія мусульмане і беларуская літаратура арабскім пісьмом».

Помнікам беларускай літаратуры арабскай графікай таксама прысвечаны матэрыялы польскіх знаўцаў і дзеячаў ісламу А. Варановіча, Я. Шынкевіча, А. Заянчкоўскага, беларускіх навукоўцаў В. Вольскага, В. Ластоўскага, вядомага рускага перакладчыка І. Крачкоўскага і інш.

У другой палове ХХ ст., у 1968 г. ў Вільні выйшла першая ў беларускім мовазнаўстве манаграфія, прысвечаная рукапісам татар-мусульман – «Беларускія тэксты, напісаныя арабскім пісьмом, і іх графіка-арфаграфічная сістэма». Яе аўтар – А. Антановіч. Гэта праца аказала вялікі ўплыў на даследаванне беларускіх і польскіх тэкстаў, паколькі дала магчымасць іншым даследчыкам перайсці да вывучэння моўнай і літаратурна-фальклорнай асновы тэкстаў. Аднак работа гэтая адрозніваецца празмерна секулярным падыходам, накіраваным на выключна мовазнаўчыя пытанні і мала закранае пытанні зместу рукапісаў.

Заходняя кітабістыка 70-х гг. дала шэраг цікавых работ. У Англіі пра кітабы пісалі Г. Мэрэдыт-Оўэнс і А. Надсана, а таксама даследчыца Шырын Акінэр. Яна пазней, у 2009 г.. выдала даследаванне кітаба з Брытанскай бібліятэкі.

У 80–90-я гг. ў Польшчы, Літве, Швейцарыі, Беларусі з’яўляюцца работы па помніках пісьменства татараў-мусульман, у якіх мяняецца кірунак навуковага даследавання: характарыстыка палеаграфіі, зместу і мовы, высвятленне фальклорнай і літаратурнай асновы кітабаў, публікацыя першасных матэрыялаў, даследаванне славянамоўнай асновы тафсіраў, увядзенне ў навуковае выкарыстанне новых, раней не апісаных рукапісаў.

На сучасным этапе (1990 – 2020-я гг.) гісторыі і культуры татараў прысвечаны працы беларускіх вучоных І. Канапацкага, С. Думіна, А.

Смоліка, З. Канапацкай. Так, у 1993 г. выйшла кніга І. Канапацкага і С. Думіна «Беларускія татары: Мінулае і сучаснасць», у 2000 г. – «Гісторыя і культура беларускіх татар» І. Канапацкага і А. Смоліка.

Польскія даследчыкі (А. Дрозд, Ч. Лапіч, Ё. Кульвіцка-Каміньска, Г. Янкоўскі, А. Канапацкі і інш.) таксама зрабілі вялікі ўнёсак у развіццё навукі пра беларускататарскае пісьменства. Падзеяй у кітабістыцы стала выданне ў 2000 г. тэксту кітаба, цалкам перакладзенага на польскую мову, «Ключ да Раю», якое падрыхтавалі Ч. Лапіч і Г. Янкоўскі.

Вывучэннем гісторыі мусульман у Беларусі сталі займацца і самі беларускія татары. Культурна-грамадскае аб’яднанне беларускіх татар-мусульман «Зікр уль-кітаб» пад кіраўніцтвам Абу-Бекіра Шабановіча у гэты час рэгулярна выдавала квартальнік «Байрам» (рэдактары Якуб Якубоўскі і Ібрагім Канапацкі), на старонках якога адлюстроўваліся пытанні гісторыі, побыту, рэлігійнай абраднасці, пісьмовай спадчыны ісламу на Беларусі. У часопісах выходзілі навуковыя артыкулы І. і З. Канапацкіх, М. Гембіцкай. Асабліва вялікі ўклад у вывучэнне гісторыі іслама ў Беларусі зрабіў Ібрагім Канапацкі – навуковец і выкладчык, аўтар вялікай колькасці навуковых работ, арганізатар і ўдзельнік многіх міжнародных навукова-практычных канферэнцый.

Пачатак XXI ст. даў шэраг новых імён даследчыкаў культурна-гістарычнай спадчыны мусульман Беларусі. У 2009 г. выйшаў шэраг важных публікацый: кніга літоўскай даследчыцы Галіны Мішкінене з публікацыяй поўнага тэксту кітаба Івана Луцкевіча (у 2022 г. выйшаў поўны пераклад на англійскую мову), пераклад на беларускую мову манаграфіі швейцарскага вучонага Паўля Сутэра («Альфуркан татарскі»), прысвечанай вывучэнню тафсіра татараў ВКЛ. У 2009 г. своеасаблівым адказам на працу П. Сутэра стала публіцкацыя даследавання беларускаіх вучоных Міхася Тарэлкі і Ірыны Сынковай, прысвечанае палемічнаму трактату мусульман ВКЛ «Адкуль пайшлі ідалы». Славуты беларускі кітабіст М. Тарэлка таксама падрыхтаваў шэраг каталогаў з апісаннем рукапісаў татар, якія захоўваюцца ў музеях, бібліятэках і прыватных кнігазборах Беларусі.

Спасылкі на некаторыя з пералічаных прац можна знайсці ў канцы гэтай кнігі.

***

*Як зямля без чалавека нічога не значыць,*
*Так і пісьмо без чалавека нічога не значыць.*
(З тафсіра беларускіх татар)

Складальнікі кітабаў імкнуліся максімальна шырока ахапіць кола пытанняў, якія мелі актуальнасць у іх час – і практычна ўсе яны застаюцца вострымі і сёння. Не можа пакінуць раўнадушным і стыль, мова кітабаў. Некаторыя радкі літаральна перанасычаны пачуццямі і эмоцыямі. А мэта адна – каб чытач сур'ёзна задумаўся над сваім жыццём, праверыў, наколькі яно асэнсаванае і правільнае з пункту гледжання вечных ісцін, ці не патануў ты ў балоце граху і нявер'я, ці правільна абраў шлях да Бога?

Вакол кітабаў склалася кола міфаў: адны кажуць, што там запісаны рэцэпты лекаў ад многіх хвароб, другія – што там схаваны веды пра будучыню, трэція – што там зашыфравана таямнічая гісторыя мінулага. Даследаваўшы толькі тое, што знаходзіцца ў даступных крыніцах, можна пераканацца, што нашы «міфатворцы» часткова маюць рацыю. Сапраўды, што-нішто з вышэйзгаданага там ёсць: невялікія экскурсы ў гісторыю чалавецтва, прадказанні будучыні (падзеяў напярэдадні Канца свету), парады для будзённых і вечных патрэб. Але ўважлівы чытач заўважыць, што кітабы закранаюць агульнаісламскія тэмы, не адхіляючыся надта далёка ад традыцыйных для шматмільённай уммы мусульман пытанняў. Менавіта ў гэтым і заключана каштоўнасць кітабаў. Яны зразумелаю, простаю мовай нагадваюць верніку, што ёсць на свеце іншая рэчаіснасць, вечная, а сегасветная мітусня рана ці позна скончыцца. І што яго сапраўдная Радзіма – *там*, а не *тут*, а гэты свет – толькі ніва для вечнасці.

Адным з найбольш вядомых рукапісаў беларускіх татараў з'яўляецца кітаб Івана Луцкевіча. Вядома, беларускі палітык і грамадскі дзеяч І. Луцкевіч сам не складаў гэты рукапіс. Ён толькі знайшоў яго ў адной з татарскіх сем'яў пад Вільняй. Але паколькі гэты

кітаб, як і іншыя, не мае ўласнай назвы, то і названы быў па імені таго, хто ўвёў яго ў навуковы абарот. Мы абапіраліся, у асноўным, на тэкст гэтага кітаба, але не абмежаваліся толькі ім. Адзін з фрагментаў, які датычыцца нормаў вітання салямам, быў узяты з артыкула знанага эксперта ў беларускай кітабістыцы Міхася Тарэлкі. Артыкул прысвечаны знаходцы аркуша з рукапіса XVII ст., які захоўваўся ў жыхара Іўя Бекіра Радлінскага. Звярнуліся мы і да некаторых іншых апублікаваных рукапісаў, у тым ліку і да тэкста, прыведзенага ў кнізе Антона Мухлінскага, а таксама фрагментаў рукапісаў, апублікаваных вучнем А. Антановіча – В. Несцяровічам – у кнізе «Старажытныя рукапісы беларускіх татар».

Прапануем вам азнаёміцца з выбранымі фрагментамі і паразважаць, разабрацца раз і назаўсёды, як было «некалі». Толькі падумайце, наколькі няпростая задача стаяла перад нашымі продкамі: ім трэба было данесці веды пра ісламскую рэлігію, яе асновы і крыніцы, не звяртаючыся ні да інтэрнэту, ні іншых сродкаў сувязі, насуперак абставінам і складаным варункам жыцця ў немусульманскім асяродку, абапіраючыся толькі на ўласную памяць і глыбіню разумення рэлігіі.

Некаторыя даўнія беларускія або польскія словы мы пераклалі або дадалі да іх тлумачэнне (праз знак «=»). Мова кітабаў – насуперак распаўсюджанаму меркаванню, не цалкам беларуская, а хутчэй беларуска-польская «трасянка», таму большасць фрагментаў давялося цалкам перакладаць на сучасную беларускую. Некаторыя словы, якія перадаюць атмасферу кітабаў, мы ўсё ж пакінулі: «семенчаваць» (узрадаваць, ад тур. sevinç – радасць), «спáсенне» (Боская узнагарода за добрую справу) і некаторыя іншыя. Да арабскага тэксту мы таксама далучылі пераклад у зносках, дзе палічылі неабходным. Імкнучыся максімальна наблізіцца да арыгінала, было абрана наступнае напісанне некаторых словаў, якія няма патрэбы калькаваць з рускай мовы: «Аллаг» (а не «Алах»), «Кур’ан» (замест «Каран»), «Сюннет» або «Сунна» (замест «Суна»), «Мухаммад» (замест «Мухамед»). Таксама былі далучаны спасылкі на крыніцы, адкуль былі ўзятыя цытаты.

Наогул, тэкст кітабаў – гэта «шматслойны» тэкст са мноствам міжкультурных спасылак, дзе адзін кароткі выраз можа вяртаць да

мноства забытых імёнаў і падзей мінуўшчыны, самастойных сюжэтаў і складаных праблем гісторыі. Таму акрамя добрай моўнай падрыхтоўкі ад чытача патрабуецца яшчэ і вялікая дапытлівасць, шырокая эрудыцыя і гатовасць да новых адкрыццяў.

Запрашаю вас, шаноўныя чытачы, у падарожжа па старонках старадаўніх кніг, каб паспрабаваць разам знайсці адказы на пытанні сучаснасці. Прашу Аллага дабраславіць гэтую працу, зрабіць яе нашым апраўданнем перад Ім і даць ад яе карысць і мне, і чытачам аж да Суднага Дня. Не забывайце мяне і ўсіх, хто працаваў над гэтай кнігай у сваіх дуа.

*Давуд Радкевіч*

## Зварот да чытачоў ад складальніка Кітаба Івана Луцкевіча

Кароткая навука до чытальнікаў, слухаючых мусульман, да тых, якія прыказ Бога любяць і ў веры мусульманскай кахаюцца. [На жаль, многія да нядобрага] звыклі праз аплошнасць і ляніўства, нібыта ў сне жывучы, прыказу Божага не трымаюць, імамаў сваіх не слухаюць. Напамін імама пра словы Пана Бога і навуку Прарока ﷺ ярмом цяжкім на шыі сваёй відзячы, не дзержаць.

Адны чыняць так, ведаючы Пісанне, а другія кажуць, частку Пісьма маючы [і непраўдзіва яго тлумачаць], а яшчэ нячыстае ўжываюць, не хочуць у парадку прыстойным постам абмежаваць сябе так, пяць вахтаў[1] намаз так павіннасць Пану Богу чыніць, як піша:

﴿ يَا أَيُّهَا الَّذِينَ آمَنُوا كُتِبَ عَلَيْكُمُ الصِّيَامُ كَمَا كُتِبَ عَلَى الَّذِينَ مِن قَبْلِكُمْ لَعَلَّكُمْ تَتَّقُونَ ﴾[2]

*«І, тыя, хто Богу верыць, мусульмане, прадпісаны вам усім пост Рамадан, загадваю посціць, як напісаў, каб аддавалі паклоны ў Каабэю на дзень па пяць раз, каб баяліся Мяне, Бога свайго»* (2:183).

Бачыце вачыма, слухаеце вушамі [словы] Пана Бога, а Пан Бог Стварыцель паважным словам Сваім мовіць:

﴿ يَا أَيُّهَا الَّذِينَ آمَنُوا أَطِيعُوا اللَّهَ وَأَطِيعُوا الرَّسُولَ وَأُولِي الْأَمْرِ مِنكُمْ ﴾[3]

[1] Пяць разоў на дзень

[2] (2:183) *"О, вернікі! Прадпісаны вам пост – так сама, як быў ён прадпісаны вашым папярэднікам, каб, вы былі богабаязнымі".*

[3] (4:59) *"О вернікі! Слухайцеся Аллага і слухайцеся Пасланца, а таксама надзеленых уладаю сярод вас".*

*«Іман пяючыя, Мне, Богу, верныя мусульмане, аддавайце [тое, што належыць] да Мяне, Бога Свайго, і да Прарока свайго Мухаммада ﷺ, верце у Кур'ан, справуйцеся паводле Кур'ану і паводле хадзісу прароцкага, слухайце вучоных, муфтэяў, якія будуць з вас навукай узвышаныя і вам будуць навуку з Кур'ану і хадзісу прароцкага [выкладаць]».*

Навуку знайце і вучоных людзей слухайце, бо гэта не імам сабе тое прыпісвае, каб яго слухалі, а Пан Бог Стварыцель загадвае, каб навукі слухалі, вучоных людзей баяліся, бо нам трудна кожнаму зразумець Боскае Пісанне.

Тады падаю пад суд ваш, усіх, хто розум мае – убачце пільна і рассудзіце, бачце, хто з [ніжэйзгаданых] людзей цнатлівейшыя? Бо ж не ад маці цнота дзіцяці прыходзіць, але з учынкаў добрых.

Ці той лепшы, хто Пана Бога баючыся, пастыраў сваіх слухае і ў парадку прыстойным трымаецца закону веры мусульманскай, прыказа Божага, ці такія, якія ўпартыя, свавольныя, імамаў сваіх не слухаюць, веры мусульманскай не трымаюцца, у грубай прастаце жывучы?

Як Пан Бог у Кур'ане піша:

﴿ إِنَّ الْأَبْرَارَ لَفِي نَعِيمٍ ﴾[4]

*«Пэўна, праўдзівыя мусульмане у Раі будуць з Прарокам ﷺ із таварышамі яго, [такімі як] Абу Бекір, 'Умар, 'Усман, 'Алі. Радуйцеся, добрыя мусульмане!»*

Да аплошных людзей Пан Бог мовіў: «Устыдайцеся, аплошныя людзі, ляніўства свайго!» Пан Бог грозіць Пеклам.

Мовіў Пан Бог:

﴿ وَإِنَّ الْفُجَّارَ لَفِي جَحِيمٍ ﴾[5]

---

[4] (82:13) *"Папраўдзе, пабожныя апынуцца ў дабрашчасці".*
[5] (82:14) *"А грэхалюбцы, папраўдзе, трапяць у Пекла".*

*«Пэўна, аплошныя людзі з кяфірамі будуць супольна ў Джахім-пекле».*

قَالَ النَّبِيُّ ﷺ : العُلَمَاءِ الصُّلَحَاءِ بِالْأَعْمَالِ

كَالْأَنْبِيَاءِ بَنِي إِسْرَائِيلَ

Прарок, яго мілосць, мовіў: «Мусульманін наўчоны, добры, із учынкамі добрымі, – такі, як прарок із сыноў Я'кубавых».

العَالِمُ بِلاَ عَمَلِ السُّوءِ الشَّيْطَان[6]

А ненаўчоны без намазу і без посту, без учынкаў добрых, і не пытаецца ў наўчоных навукі і не слухае вучоных – то такі чалавек ровен шайтану.

Прашу кожнага мусульманіна каб не мелі за злое, што я вам кожнаму прамовіў устамі ўзычлівасці маёй. Як мне, мусульманіну добраму і пастыру наўчонаму, належы павіннасць мая – слова Божае і навуку прароцкую вам апавядаць, а ваша павіннасць – слухаць.[7]

***

---

[6] араб. "Вучоны без [зробленых ім] спраў – паганы шайтан". Аўтар не перакладае гэты выраз, пераключаючы ўвагу чытача на іншае пытанне. Магчыма, мэтай гэтага было нежаданне кідаць цень на настаўніка ці на іншых імамаў, якія не заўжды маглі адпавядаць высокаму званню настаўнікаў веры.
[7] Кітаб Луцкевіча (далей – КЛ), 65Б – 67А.

# ІМАН

*Духоўная аснова ісламскай рэлігіі і светапогляду мусульманіна – гэта іма́н (вера). Іман – самае каштоўнае, што ёсць у чалавека, самы вялікі дар Бога.*

*Іман – гэта перакананасць сэрца і пацверджанне языком. Згодна пераканням асноўнай масы суннітаў, справы хоць і вельмі важныя, але не з'яўляюцца часткай іману, а толькі ўказваюць на дасканаласць веры. Але нават тыя, хто прылічваюць справы да іману, адрозніваюць сярод іх найважнейшыя і не спяшаюць з абвінавачаннем у нявер'і кожнага, хто выявіў сваю нядбайнасць у гэтых пытаннях.*

*Аднадушнае меркаванне ўсіх вучоных-суннітаў, што грахі шкодзяць іману, але не пазбаўляюць яго. Хоць грэшнік і лічыцца мусульманінам (му́'мінам), яго лічаць распуснікам (фа́сікам) Яго га́няць і выказваюць асуджэнне яго ўчынкам, але ўсё ж не адмаўляюць яму ў праве на веру, ставяцца як да верніка. І толькі той, хто ўпарта адмаўляецца быць мусульманінам, здзекуецца з асноў ісламу, прыніжае святасць мусульманскіх святыняў, адыходзіць ад іману і робіцца нявернікам (кяфірам).*

*Тым не менш, верніку не пасуе празмерна ганарыцца сваім іманам, бо вера – дар Боскі, і таму аберагаць яго сваім пакланеннем і добрымі ўчынкамі, непакоіцца пра яго захаванне – наш самы галоўны абавязак.*

*Ніжэй раскрыты пэўныя аспекты светапогляду мусульман былога Вялікага Княства Літоўскага. Як вынікае з іх, татары вызнавалі ўсе асноўныя аспекты акыды (веравучэння) сунніцкага ісламу:*

- *апоры (arkān) іману (вера ў Аллага, у анёлаў, у Пісанні, у прарокаў, у Судны дзень і прадвызначэнне) і ісламу (шагада, намаз, пост, закят, хадж);*
- *асноўныя атрыбуты (ṣifāt) Аллага згодна ашарыцка-матурыдзіцкай школе веравучэння (быццё, існаванне без пачатку і*

*канца, адзінства, адрозненне ад стварэнняў, самадастатковасць, жыццё, усёведанне, усёбачанне, слых, воля, усемагутнасць, гаворка, здольнасць ствараць);*

- *прызнанне аўтарытэту сунніцкіх мазгабаў і асобная пашана да ханафіцкага мазгабу;*
- *паняцце пра выхад з ісламу (riddah) і вяртанне да яго.*

*Можна з упэўненасцю сказаць пра даволі высокі ўзровень рэлігійнай самасвядомасці мусульмансих інтэлектуалаў былога ВКЛ, іх здольнасць папулярна выкласці асновы ісламскага крэда і права для шырокага кола чытачоў, падрыхтаваць іх да міжканфесійнага дыялогу, перасцерагчы ад фанатызму, патраплення ў грэх і выхаду з ісламу, а таксама матываваць да набыцця ведаў, маральнага і духоўнага самаўдасканалення.*

*Таму не існуе аніякай розніцы і супярэчнасці паміж артадаксальным ісламам і традыцыйнай спадчынай мусульман Беларусі, Літвы і Польшчы, і можна казаць пра пераемнасць паміж рознымі пакаленнямі мусульман, насяляючых наш рэгіён.*

## 1. Асновы іману

Толькі добрасць і збавенне [тым], хто верыць у Пана Бога і Дзень Апошні, і ў анёлаў Божых, і ў Кнігі, пасланыя ад Пана Бога, – Таўрат, Інджыль, Забур, Фуркан (=Тора, Евангелле, Псалтыр, Кур’ан) – адна роўная другой, – і ў прарокаў Божых верыць.[8]

***

Калі спытаюць: «Што такое іман?» Ты моў: «Вера ў Пана Бога Адзінага і ў прарока Мухаммада ﷺ, і ўсе Яго загады, што Пан Бог праз анёла, праз [Святыя] Кнігі і праз усіх прарокаў перадаў».

А іман на тым свеце перад Панам Богам мае быць пэўным (=надзейным) сведкам. Языком і нутром (=сэрцам) Пана Бога ўспамінай, Божае адзінства вызнавай; у Пасла, Мухаммад-прарока, яго міласць, праўдзіва вер. У Рай і Пекла, і Сырат-мост, і ва ўставанне з мёртвых і ў здаванне справаў перад Панам Богам у Судны дзень, і ва ўзважванне ўчынкаў[9] добрых і злых, і у магільны допыт, і ў пытальнікаў, што будуць пытаць у магіле, і што памерлы – з мёртвых устане, ва ўсё гэта верыць – фарз[10], павіннасць.[11]

***

Іман – наша суцяшэнне, карона і зброя.[12]

## 2. Іман і справы

Калі хто многа добрага ўчынку чыніць, то ў тым чалавеку іман паўнавартасны будзе. А калі трохі ўчынку добрага ўчыніць – то ў ім іману трохі будзе.[13]

***

[8] КЛ, 6А.
[9] тагасветныя шалі, на якіх будуць узважаны ўчынкі кожнага чалавека
[10] Фарз, або фард – абавязковае ў Шарыяце (ісламскім Законе).
[11] КЛ, 39А.
[12] КЛ, 39Б.
[13] КЛ, 39Б.

Хто мусульманіна спалохае або заўстыдзіць (без віны), у тым іман гіне.

اَلْحَيَاءُ مِنَ الإِيمَان[14]

Хто ўстыдлівы (сціплы) – у таго іман.

اَلصَّبْرُ نِصْفُ مِنَ الإِيمَان

Хто цярплівы – у таго палавіна іману.

اَلْإِقْرَار مِنَ الْإِيمَان

У каго вернасць, хто пры слове, пры праўдзе – у таго іман і вера[15].

مَنْ لاَ لَهُ عَهْداً لَيْسَ لَهُ دِيناً[16]

Хто не аднаслоўліў, пры слове сваім не стаіць, у таго чалавека іману і веры няма.[17]

### 3. Як трэба верыць у Бога

Ведай, Хто такі Стваральнік, Пан Бог, [і] як павінен Яго загады выконваць і [згодна ім] чыніць.

﴿ وَلاَ فِي الأَرْضِ وَهُوَ السَّمِيعُ البَصِيرُ ﴾

«Пану Богу няма падобнай ніводнай рэчы на нябёсах, ані на зямлі, а Ён – чуе і бачыць усё».

---

[14] Араб. "Сарамлівасць (сціпласць) – ад веры". Частка хадзіса, які перадаюць Бухары, Муслім і інш. У версіі, якую прывёў імам Бухары ў кнізе "Адаб аль-муфрад" (пад № 1314), прыводзіцца працяг: "Сціпласць – ад веры, а вера [прыводзіць да асалоды] у Раі; брыдкаслоўе ж – ад грубасці, а грубасць [прыводзіць да пакуты] у Пекле".

عَنِ النَّبِيِّ صلى الله عليه وسلم قَالَ: الْحَيَاءُ مِنَ الإِيمَانِ، وَالإِيمَانُ فِي الْجَنَّةِ،
وَالْبَذَاءُ مِنَ الْجَفَاءِ، وَالْجَفَاءُ فِي النَّارِ

[15] у рукапіснай традыцыі словам "вера" абазначалі рэлігію.
[16] Хто не выконвае дамову – у таго няма рэлігіі.
[17] КЛ, 58Б.

﴿ لَمْ يَلِدْ وَلَمْ يُولَدْ وَلَمْ يَكُن لَّهُ كُفُوًا أَحَدٌ ﴾[18]

Ні ад каго не нарадзіўся і ад Яго ніхто не нарадзіўся, няма Яму падобнаго на свеце нікога. Чысты Ён ад усяго таго, што кяфіры (=нявернікі) мовяць і прыпадабняюць. Ён – Моцны і Дужы.

﴿ إِنَّ اللَّهَ عَلَى كُلِّ شَيْءٍ قَدِير ﴾[19]

﴿ وَهُوَ سَمِيعٌ بَصِيرٌ ﴾[20]

Папраўдзе, Пан Бог на ўсялякія рэчы дужы і моцны, і на ўсе стараны чуе і відзіць.

إِنَّ اللَّهَ عَلِيمٌ بِذَاتِ الصُّدُورِ[21]

Папраўдзе, Пан Бог ведае ўнутраныя умыслы.

Хоць бы [яшчэ] не мысліў, а [толькі] меўся мысліць, Пан Бог ведае перш, чым чалавек памысліць. У Кур'ане чытаеш, то разумееш.

І чыніце адпаведна загаду Божаму паводле Кур'ана Святога ад Пана Бога праз Джабраіля Мухаммаду-прароку ﷺ пасланы Кадыр-ночы ад Мухаммад-прарока ﷺ да нас, уммéтаў[22] усіх, мусульман.

У Кур'ане паведаміў Ён, як нам трэба Пана Бога вызнаваць, як маем Яму павіннасць, паклоны-паслугі аддаваць.[23]

---

[18] (112:3-4) *"Не нарадзіў Ён і не быў народжаны, і не быў роўны да Яго ніхто"*
[19] (2:103) *"Аллаг мае ўладу над ўсім існым"*
[20] (42:11) *"І Ён – чуе і бачыць усё"*
[21] (3:119) (5:7) *"Папраўдзе, Аллаг ведае пра змесціва сэрцаў"*
[22] Уммет (араб. умма) – супольнасць вернікаў-мусульман.
[23] КЛ, 75А-75Б.

## 4. Які Бог?

Калі спытае хтосьці: «Бога ці знаеш?» Кажы: «Знаю».

Калі скажа: «Якім чынам знаеш?» Ты моў: «Чысты Бог, нікому Бога надаваць раўнёю не маюць, Богу раўні няма ў аніводнай рэчы. Чысты ад шлюбу і нараджэння, ад сыноў, ад дачок – ад усяго Чысты».[24]

***

﴿لَيْسَ كَمِثْلِهِ شَيْءٌ﴾[25] فِي الأَرْضِ وَلاَ فِي السَّمَاءِ

﴿وَهُوَ السَّمِيعُ الْعَلِيمُ﴾[26]

Той Стварыцель, Якому няма падобнага ні ў чым ні на зямлі, ані на нябёсах. Ён усё чуе і ведае ўсё. Ніхто Яго, Бога, выявы мець не можа.[27]

***

Ведай, кожны мусульманін, пра тое, што Пан Бог ведае ўсе рэчы, унутраныя і тайныя замыслы, і Ён ведае ўсе мовы.

Як сказана ў Кур'ане:

﴿إِنَّ اللَّهَ عَلِيمٌ بِذَاتِ الصُّدُورِ﴾[28]

«Папраўдзе, Пан Бог ведае ўмыслы нутраныя».

---

[24] КЛ, 37Б.
[25] (42:11) *"Няма нічога падобнага да Яго".*
[26] (2:137) *"А Ён – чуе і ведае ўсё".*
[27] КЛ, 7А.
[28] (3:119) *"Папраўдзе, Аллаг ведае пра змесціва сэрцаў"*

Тады, чалавеча, усялякімі языкамі, усялякімі галасамі павінен Пана Бога прасіць, ведаць Пана Стварыцеля свайго, шчырым сэрцам у чыстасці і з абдэсем[29].[30]

## 5. Значэнне веры ў Бога

﴿ مَا أَنزَلْنَا عَلَيْكَ الْقُرْآنَ لِتَشْقَى * إِلَّا تَذْكِرَةً لِّمَن يَخْشَى ﴾[31]

«О Мухаммад, не паслалі Мы табе Кур’ан, каб ты з-за яго пакутаваў, а толькі каб умеў хваліць Пана Бога той, хто баіцца Яго.

﴿ تَنزِيلًا مِّمَّنْ خَلَقَ الْأَرْضَ وَالسَّمَاوَاتِ الْعُلَى ﴾

Паслана [Кніга] ад Таго, Каторы зладзіў зямлю і нябёсы высокія,

﴿ الرَّحْمَنُ عَلَى الْعَرْشِ اسْتَوَى ﴾

А Сам – Бог Ласкавы, Міласэрны на Аршу-майстаце ўпанаваўся поўнаю моцай Сваёю.

﴿ لَهُ مَا فِي السَّمَاوَاتِ وَمَا فِي الْأَرْضِ وَمَا بَيْنَهُمَا وَمَا تَحْتَ الثَّرَى ﴾

Яму належыць усё, што ў нябёсах і што ў зямлі і на зямлі, і што паміж імі, і што-кольвек пад фундаментам зямлі.

﴿ وَإِن تَجْهَرْ بِالْقَوْلِ فَإِنَّهُ يَعْلَمُ السِّرَّ وَأَخْفَى ﴾

А хто яўнымі словамі хваліў, або таемна, пэўна Ён і таемна (моўчыкам) пахвалёны, і найтаемней.

---

[29] Абдэсь – малое рытуальнае ўмыванне (ар. *вуду́*), мыццё твару, рук да локцяў, праціранне валасянога покрыва галавы вільготнымі рукамі і мыццё ног да костачкі (гл. Кур’ан, 5:6).
[30] КЛ, 85Б.
[31] Тут і далей – тафсір першых аятаў суры Та-Га (20:2-8)

﴿ اللَّهُ لَا إِلَهَ إِلَّا هُوَ لَهُ الْأَسْمَاءُ الْحُسْنَى ﴾

Аллаг і ёсць Бог, няма бога іншага, толькі Ён, і Яго імёны найлепшыя».[32]

## 6. Дзе Аллаг?

﴿ وَإِذَا سَأَلَكَ عِبَادِي عَنِّي فَإِنِّي قَرِيبٌ
أُجِيبُ دَعْوَةَ الدَّاعِ ﴾[33]

(2:186) «Калі ў цябе, Прарочa, слугі мае пра Мяне, Бога, спытаюць, скажы ім, што Я – блізка, прымаю просьбы, хто просіць, калі будзе шчыра Мяне прасіць.

﴿ فَلْيَسْتَجِيبُوا لِي وَلْيُؤْمِنُوا بِي لَعَلَّهُمْ يَرْشُدُونَ ﴾[34]

(2:186) Няхай просяць аб прыняцці [сваіх дуа] Мяне і няхай шчыра вераць, а Я іх пастаўлю на дарозе праўдзівай».[35]

***

І не кажы так: «Бог у адным месцы»[36], або «У Бога месца няма».

«Дзе Стварыцель?» – [калі хто] спытае, то знойдзеш, у Кур’ане піша:

﴿ وَهُوَ اللَّهُ فِي السَّمَاوَاتِ وَفِي الْأَرْضِ

[32] Пераклад згодна тэксту з дадатку кнігі А. Мухлінскага “Исследование о происхождении и состоянии литовских татар”, 1857 г., с. 62-64.

[33] (2:186): *“Калі рабы мае спытаюць цябе пра Мяне, то Я – папраўдзе, паблізу, адказваю на заклік таго, хто кліча Мяне”.*

[34] (2:186): *“Хай жа і яны адказваюць адказваюць Мне і вераць у Мяне, каб маглі пайсці прамым шляхам”.*

[35] КЛ, 15А.

[36] Напрыклад, на небе, ці на Троне.

يَعْلَمُ سِرَّكُمْ وَجَهْرَكُمْ وَيَعْلَمُ مَا تَكْسِبُونَ ﴾[37]

«Пан Бог як на небе, так [і] на зямлі, ведае таямніцы вашы і ведае ўсе справы вашы, што справуеце»[38].[39]

## 7. Усё ад Бога

У Кур'ане так пішацца: «Пан Бог мовіў: «Я – Бог з ласкі і волі Маёй Боскай даю радасных пацех раскошу; [і Я таксама] даю многа людзям з волі і прапушчэння Майго жаляў вялікіх і нягод, шкод, стратаў – гэта ўсё з волі Маёй Божай робіцца.

Як Я, Бог, хачу, так мае быць. Таму вырак Мой Божы такі:

1) каму Я што дам, пажыткі, радасці, пацехі – і за тое хто бы Мне, Богу, хвалы і падзякі не чыніць, – і

2) каторым людзям Я, Пан Бог, жалі і прыгоды-смуткі дам і прапушчу з волі Маёй Божай, а чалавек бы цярплівасць не меў,

тыя людзі абое няхай сабе іншага бога шукаюць, [а] Я ад іх адракаюся».

Яшчэ пішацца ў Кур'ане, пацвярджаючы:

«Чалавеча кожны, ведай пэўна, што з цябе волас адзін не ўпадзе без волі Маёй Божай. Так жа і з дрэва ліст не спадзе без волі і ведамосці Маёй, Божай. Гэта ўсё з дазволу і з ведама Майго, Божага. Як і душа з чалавека з дазволу Майго Божага выйдзе, без волі Маёй Божай нідзе смерці няма. Дзе воля Мая і суд (=вырак) каму прыйдзе – нідзе не скрыецца і не ўцячэ».[40]

---

[37] (Кур'ан, 6:3): *"Ён – Аллаг на нябёсах і на зямлі; ведае Ён ваша таемнае і яўнае, і ведае, што вы набываеце"*. Г.зн. Богу пакланяюцца вернікі, якія жывуць на нябёсах (анёлы) і на зямлі (людзі і джыны), а Сам Ён існуе без месца і не мае ні ў чым аніякай патрэбы.

[38] Маецца на ўвазе не месцазнаходжанне Бога, не што Бог паўсюдна, а што толькі Бог варты пакланення як на небе, так і на зямлі, і ведае ўсё, што робіцца паўсюль. А ў гэтым аднадушныя ўсе мусульмане.

[39] КЛ, 138Б.

[40] КЛ, 136Б – 137А.

## 8. Заступніцтва Прарока ﷺ

Хто ў Пана Бога Адзінага і ў прароцтва Мухаммада праўдзіва верыць, то прычыну (=заступніцтва) ад Прарока ﷺ будзе мець. Бо Пан Бог Мухаммад-прарока ﷺ да сябе прычынцаю (=заступнікам) зрабіў. Яго заступніцтва мусульманам лякарства і збавенне душаў.

Як Пан Бог у Кур'ане піша:

﴿ وَلَسَوْفَ يُعْطِيكَ رَبُّكَ فَتَرْضَىٰ ﴾[41]

«Над кім тваё прароцкае заступніцтва будзе, над тым Мая ласка Божая будзе».[42]

## 9. Прадвызначанае не мяняецца

Прарок ﷺ мовіў:

«Гэта загад Пана Бога:

«Хто прыдзе на гэты свет – потым пакіне яго. Для кожнага надыдзе свой час аддаць душу – без суда (вырашэння) смерці няма ні для каго. Кожнаму адпаведна рызку[43] назначаны век яго».[44]

---

[41] (93:5) *“Аллаг абавязкова надзеліць цябе дабром, і будзеш ты задаволены”*.

[42] КЛ, 57А. Вера ў *шафаат* (заступніцтва) прарока Мухаммада ﷺ за ўсіх мусульман, асабліва за тых, хто рабіў нават вялікія, цяжкія грахі з'яўляецца адной з асноў ісламскага веравучэння. У кітабах такое заступніцтва завецца “прычына”, а самаго Прарока называюць “прычынцаю” (заступнікам). Таму вернікі не павінны легкадумна грашыць, спадзеючыся на прароцкае заступніцтва на тым свеце. Наадварот, яны мусяць каяцца за свае грахі і імкнуцца захаваць свой іман (веру). І таксама, калі здарыцца ненаўмысна саграшыць, вернікам нельга адчайвацца і губляць надзею на лепшае, на дараванне Боскае і заступніцтва Прарока ﷺ. І яшчэ. Заступніцтва заслугоўваецца выкананнем суннатаў (дадатковых добрых спраў па прыкладзе Прарока ﷺ). Таму, спадзеючыся на шафаат, хай кожны зірне на сваё выкананне тых спраў, якія рабіў сам і вучыў рабіць іншых наш Прарок ﷺ.

[43] Рызк – доля, пажытак, тое, што вылучана Богам для чалавека на час яго зямнога жыцця.

[44] КЛ, с. 105Б.

## 10. Анёлы запісваюць усе ўчынкі

﴿ فَمَن يَعْمَلْ مِثْقَالَ ذَرَّةٍ خَيْرًا يَرَهُ ﴾[45]

«Хто на пыл добрага ўчынку учыніць, усё тое Пан Бог прыйме»

﴿ وَمَن يَعْمَلْ مِثْقَالَ ذَرَّةٍ شَرًّا يَرَهُ ﴾[46]

«Хто на пыл учыніў злога, то ўсё тое ў Пана Бога ў веданні запісана».

Два анёлы ад Пана Бога ёсць пры кожным чалавеку, якія ўчынкі вашы ўсялякія ведаюць і пішуць, як Пан Бог мовіў:

﴿ كِرَامًا كَاتِبِينَ * يَعْلَمُونَ مَا تَفْعَلُونَ ﴾

*Кіра́ман-кяцібі́н* – два анёлы пры Пану Богу, высакародныя пісары. Ведаюць тыя пісары, што вы чыніце, усе людскія ўчынкі. Пішуць хто што ўчыніць: або спасенне (узнагарода), або грэх.[47]

## 11. Якая вера лепшая?

Так піша:

﴿ إِنَّ الدِّينَ عِندَ اللَّهِ الْإِسْلَامُ ﴾[48]

«Папраўдзе, найлепшая вера ў Пана Бога – мусульманская».[49]

---

[45] (99:7) *“І хто зробіць на вагу парушынкі добрага, убачыць яго”*
[46] (99:8) *“А хто зробіць на вагу парушынкі злога, убачыць яго”*
[47] КЛ, с. 76Б-77А.
[48] (3:19) *“Папраўдзе, рэлігія перад Аллагам – іслам”*.
[49] КЛ, с. 39А.
Слова “іслам” азначае ў перакладзе з арабскай мовы “мір, дабрабыт, пакорлівасць Богу”. Іслам азначае зварот чалавека да Аллага без усялякага прымусу, па сваёй волі і жаданні, са шчырай адданасцю, безумоўнае прыняцце Яго запаветаў і забарон. Чалавека, які прымае іслам як рэлігію і выконвае яго правілы, называюць мусульманінам. Іслам з’яўляецца апошняй рэлігіяй, пасланай Усемагутным Аллагам праз апошняга прарока, шаноўнага Мухаммада ﷺ. Гэта бездакорная сістэма веры, пакланення і этыкі, якая застанецца да самага Суднага дня. Паколькі папярэднія рэлігіі былі зменены людзьмі, Госпад паслаў іслам, каб ізноў нагадаць чалавецтву пра Боскія законы.

## Што павінен ведаць і ўмець рабіць вернік?

Павінен кожны мусульманін ведаць, што [такое] вера мусульманская, і якія пункты калі будзеш знаць і ў іх верыць, мець моцна ўсялякае набажэнства.

Калі спытаюць: «Колькі відаў пакланення, на якіх вера мусульманская грунтуецца?», адкажы: «Шэсць рэчаў маеш знаць і верыць, і языком мовіць, пільнаваць і чыніць:

Найперш Пана Бога Адзінага павінен знаць.

Другое – гусюль-абдэсь браць.

Трэцяе – пяць раз на кожны дзень намаз кланяцца.

Чвартае – Рамазан-месяц поснікаць.

Пятае – з чаго закят-дзесяціну даваць.

Шостае – да хаджу ісці.

Хто не мае з чаго закят даваць або да хаджу ісці [можа не рабіць гэтага], але абавязкова трэба верыць, што нам Пан Бог фарзам прыказа́ў гэтыя шэсць рэчай».

Калі хто гэтых шэсць рэчай не прызна́е і не верыць [у іх], і не чы́ніць, дык усе добрыя учынкі, іман, з жаной нікях, хоць бы і да хаджу хадзіў – то ўсе тыя рэчы утраціш.

Юнак і панна, калі тых рэчаў не знаюць, у малжэнства (=да шлюбу) не дазволена [аддаваць] такіх людзей. Іншых рэчаў нямала ёсць, датычных веры мусульманскай, але гэтыя шэсць рэчаў найпатрэбнейшыя.[50] [51]

---

Адрозненне ісламу ад іншых рэлігій у тым, што ён звяртаецца да ўсяго чалавецтва і будзе дзейнічаць да апошняга дня гэтага свету. Прарокам ісламу з'яўляецца шаноўны Мухаммад ﷺ, а яго галоўнай Кнігай – Святы Кур'ан. Пасля ісламу больш не будзе іншай рэлігіі, пасля Мухаммада ﷺ не будзе іншага прарока, а пасля Святога Кур'ана не будзе іншага Святога Пісання.
Усе прынцыпы ісламу заснаваны на захаванні чалавека і натуральнай раўнавагі, створанай Аллагам. Мэта ісламу ў тым, каб дапамагчы чалавеку ўсталяваць здаровыя адносіны з самім сабой, сваім Госпадам і іншымі людзьмі. Такім чынам будзе забяспечаны як індывідуальны, так і сацыяльны мір, а на зямлі запануюць справядлівасць і міласэрнасць. *(Паводле кнігі "Што такое Іслам?")*

[50] Падрабязней гл. раздзел "Іслам".

[51] КЛ, 45А-45Б.

## Адказы на пытанні (існад нашага веравучэння)

Калі спытаюць: “Чыйго ты народу?”

Ты моў: “Адам-прарока, яго міласці, народу”.

Калі спытаюць: “Чыйго ты люду?” Ты моў: “Нуха-прарока люду”.

Калі спытаюць: “Чыйго ты закону?” Ты моў: “Ібрагім-прарока, яго міласць, я закону”.

Калі спытаюць: “Чыйго ты уммету (=уммы)?” Ты моў: “Мухамада Мустафы, мілосніка Божага, ласка Божа над нім, я яго ўммету”.

Калі спытаюць: “Чыёй ты навукі?” Ты моў: “Імама вялікага[52], айца Ханіфея Куфейскаго, сына Сабітовага[53], я навукі, ласка Божая над ім”.

Калі спытаюць у цябе: “Усіх навук (=мазгабаў) колькі?” Ты моў: “Чатыры: першая навука імама вялікага, айца Ханіфея Куфейскаго – праўдзівай веры мусульманскай, імам усіх навук ён ест; а другая навука – імама Шафі’і[54]; а трэцяя навука – імам[а] Малік[а][55]; чвартая навука – імама Ахмада Ханбалія[56]. Чатыры імамы, ласка Пана Бога Адзінага над імі ўсімі, чатырох навук праўдзівых”.

[52] Літаральны пераклад арабскага звання Абу Ханіфы “Імам А’зам”.

[53] Абу Ханіфа ан-Ну’ман ібн Сабіт аль-Куфі (араб. ابو حنيفة النعمان بن ثابت بن الكوفي ; 699-767) – ісламскі багаслоў, правазнаўца і мухаддзіс, заснавальнік і эпонім адной з чатырох сунніцкіх правазнаўчых школ – ханафіцкага мазгаба.

[54] Абу Абдуллаг Мухамад ібн Ідрыс аш-Шафі’і (араб. محمد بن إدريس الشافعي ; 767-820) – ісламскі багаслоў, правазнаўца, хадзісазнаўца, заснавальнік і эпонім сваёй сунніцкай прававой школы – шафііцкага мазгаба.

[55] Абу Абдуллаг Малік ібн Анас аль-Асбахі, больш вядомы як імам Малік (араб. مالك ابن أنس الأصبحي ; 713-795) – правазнаўца, мухаддзіс, заснавальнік і эпонім малікіцкага мазгаба.

[56] Абу Абдуллаг Ахмад ібн Мухаммад ібн Ханбаль аш-Шайбані, больш вядомы як Ахмад ібн Ханбаль (араб. أحمد بن محمد بن حنبل ; 780-855) – ісламскі багаслоў, правазнаўца, хадзісазнаўца. Заснавальнік і эпонім ханбаліцкага мазгаба.

Калі спытаюць: “Імам Абу Ханіфа навукі ад каго вучыўся?” Ты моў: “Ад імама Хамма́да”[57].

Калі спытаюць: “Імам Хамма́д ад каго навукі вучыўся?” Ты моў: “Ад імама Алькамы[58] вучыўся”.

Калі спытаюць: “Імам Алькам[а] ад каго вучыўся?” Ты моў: “Ад імама Ібрагіма[59] вучыўся”.

Калі спытаюць: “Імам Ібрагім ад каго вучыўся?” Ты моў: “Ад Абдуллаг-імама вучыўся”.

Калі спытаюць: “Імам Абдуллаг ад каго вучыўся?” Ты моў: “Ад сына Мас’удавага[60] вучыўся”[61].

Калі спытаюць: “Сын Мас’удаў ад каго вучыўся?” А ты моў: “Ад Мухамад-прарока, яго міласць, вучыўся”.[62]

---

[57] Абу Исм’аіль Хаммад ібн Абу Сулейман аль-Куфі (араб. حماد بن أبي سليمان ; VII ст.-737) – іракскі багаслоў, праваназнаўца, хадзісазнаўца. Вучань Ібрагіма ан-Нахаі і настаўнік Абу Ханіфы.

[58] Абу Шыбль ‘Алькама ібн Кайс ан-Наха’і, вядомы як Алькама ібн Кайс (араб. علقمة بن قيس; пам. 681) – ісламскі багаслоў, каментатар Карана, хадзісазнаўца, праваназнаўца з пакалення табіінаў (паслядоўнікаў сахабаў). Вучыўся ў Ібн Мас’уда *(гл. далей)*.

[59] Абу́ ‘Імран Ібрагім ібн Язід ан-Наха’і (араб. إبراهيم بن يزيد النخعي; 666-714) – ісламскі вучоны-багаслоў пакалення табіінаў, самастойны праваназнаўца (муджтагід), адзін з муфціяў Куфы і заснавальнікаў іракскай школы ісламскай юрыспрудэнцыі.

[60] Літаральны пераклад імя “Ібн Мас’уд”. Абу Абдуррахман Абдуллаг ібн Мас’уд (араб. أبو عبد الرحمن عبد الله بن مسعود ; 594-650) – паплечнік Прарока (мір над ім), выдатны мусульманскі вучоны, каментатар Кур’ана і праваназнавец.

[61] Тут адбылася блытаніна ў прачытанні першакрыніцы, калі імя Абдуллага ібн Мас’уда было разбіта на два асобныя. Ланцужок вучоных ханафіцкай школы у акадэмічнай перадачы выглядае так: Абу Ханіфа – Хаммад ібн Абу Сулейман – Ібрагім ібн Язід ан-Наха’і – аль-Алькама ібн Кайс ан-Наха’і – Абдуллаг ібн Мас’уд (паплечнік Прарока, мір над ім). Але сам факт прывядзення існаду гаворыць пра разуменне яго значнасці і неабходнасці. Бо веды нельга браць выключна з кніг, патрэбен настаўнік, які ўсебакова валодае сваім прадметам.

[62] КЛ, 37Б – 38Б.

## 12. Усе людзі – з аднае душы

﴿ يَا أَيُّهَا النَّاسُ اتَّقُوا رَبَّكُمُ الَّذِي خَلَقَكُم مِّن نَّفْسٍ وَاحِدَةٍ

وَخَلَقَ مِنْهَا زَوْجَهَا وَبَثَّ مِنْهُمَا رِجَالًا كَثِيرًا وَنِسَاءً ﴾ [63]

«І, людзі, бойцеся Бога вашага, Які стварыў вас з душы адной», – гэта значыць: «з аднаго Адама, з яго цела і духа «, – «жонка яму Хава, [Бог] стварыў яе, а з іх двух – рассыпаў людзей на ўвесь свет, мужчын і жанчын» (4:1).[64]

## 13. Біблія пацвярджае праўдзівасць ісламу

…Пан Бог праз Мусу-прарока (мір над ім) вызваліў з Егіпта тых сыноў Ізраіля, дваннаццаць разоў па сто тысячаў люду (Другая кніга Майсея, раздзел дванаццаты, верш сорак першы).

І загадаў Ён ім, каб не рабілі дзесяць рэчаў (Другая кніга Майсея, раздзел дваццаты):

«Першае – не майце сабе богоў іншых перада Мною;

другое – тое, каб не рабіў абраза́ (іконы), ані балвана (ідала) ніводнага, ані нябеснага, ні зямнога, ані птушынага, ані рыбнага, бо Я – Бог Гнеўлівы, буду за гэта караць неміласэрна;

трэцяе – не бажыся і не праклінай Мною, Богам тваім, марна, бо не пакіне, не пакараўшы, Бог таго, хто бажыўся марна;

чацвёртае – каб шабат святкаваў (=святы дзень шанаваў);

пятае – каб айца і маці шанаваў;

шостае – не забівай;

сёмае – не пералюбнічай;

восьмае – не крадзі;

дзявятае – не сведчы непраўдзіва (ілжыва);

---

[63] (4:1) *“О людзі! Бойцеся Госпада вашага, Які стварыў вас з аднае душы і стварыў з яе другую да па́ры, а з іх абедзьвюх рассеяў мноства мужчын і жанчын”.*

[64] КЛ, с. 98Б.

дзясятае – не пажадай дому бліжнего твайго, ні жонкі, ні нявольніка, ні нявольніцы, ні быка, ні асла, ні чаго-небудзь (іншага) ягонага».[65][66]

## 14. Абяцанне Божае

*…Вачыма відзеў таго Чыстага*
*Пана Бога, Каторы мяне стварыў.*
*Скора ўбачыў, саджэдэ[67] учыніў зараз,*
*У тым часе сеў [чытаць] ат-тахіят[68].*
*Пан Бог мовіў: «І, После, узнімі галаву,*
*Што табе трэба, ўсё ў Мяне гатова,*
*І, После, чаго жадаеш, прасі.*
*Дам табе, чаго будзеш жадаць ад Мяне!»*
*Мовіў я: «І, Божа, просьба мая – уммет мой!*
*Адпусціш ім грахі – такое ад Цябе жаданне маё».*
*Мовіў Пан Бог: «Хто будзе трымаці справы твае,*
*Я яму учыню ласку Сваю.*
*Таксама той ма́е быць тваім умметам,*

---

[65] Тэкст складзены на падставе Дэкалога (дзесяці запаветаў) ў 20-м раздзеле Другой кнігі Майсея. Пра гэта гаворыцца ў самім кітабе [Луцкевіча] (с. 100Б, радок 15). З той прычыны, што тэкст моцна перапрацаваны, цяжка сказаць, які менавіта пераклад Бібліі быў узяты татарскім кніжнікам за аснову. Наяўнасць слова *шабат* указвае на знаёмства татараў са старажытна-габрэйскай мовай (праз выкарыстане нейкіх крыніц або праз знаёмства са сваімі суседзямі-габрэямі?). Ні ў лацінскай, ні ў грэцкай мове няма гука “ш”, таму мы маем “субота”, палякі – “sobota”. Нават Сымон Будны, хоць ён і рабіў пераклад са старажытнагабрэйскай мовы, перадаў гэты тэрмін як Sabat, наблізіўшы яго да той формы, якая была ўжо знаёмая яго патэнцыйным чытачам. Тэкст, безумоўна, вельмі цікавы, бо паказвае, як татарын-мусульманін, жыхар Беларусі, глядзеў на біблейскія запаветы, з чым пагаджаўся, з чым – не, што хацеў бы дадаць, а што выдаліць. – *Заўв. М. Тарэлкі.*
[66] КЛ, 100Б-101А.
[67] *саджда* – зямны паклон, які выконваецца падчас намазу – рытуальнай малітвы, а па-за ёй – у якасці ўдзячнасці Богу за Яго даброты.
[68] *ат-тахіят* – “вітанне” з Богам падчас намазу, асаблівая малітва падчас сядзення.

*Хто да смерці не будзе адпускаць Сюннет твой!*
*Твой Сюннет калі будзе трымаць, а Мой фарз,*
*То Я яму харамам учыню Пекла. <…>*
*Хто пяць вахтаў намаз заўжды кланяецца,*
*У Раю пакоі вышнія будзе мець.*
*Хто ў Мяне непахісна верыць,*
*Яшчэ лепшы пакой расшыру.*
*І рызку*[69] *ім спаўна дам,*
*Калі захоча скарбу – іх надзялю.*
*Скора скарбу пабольшае – да хаджу пойдзе.*
*Другі учынак – будзе закят даваць;*
*Калі ён адзін раз дасць – Я яму дзесяць дам.*
*У Раі яму адзенне дам:*
*Хто б Маіх халопаў галодных карміў,*
*Або голаму кашулю даў, альбо надзеў,*
*Такім людзям даравацъ буду*
*Райскім адзеннем і каронаю,*
*За галоднага кармленне тысячу ўзнагарод дам.*
*Калі чаго баяцца будзе – вызвалю.*
*– Я, – мовіць той, – Божа, убогі, што маю чыніць?*
*Пан Бог мовіў: «Зікір-паклон няхай чыніць».*
*Хто да такой рэчы ніет учыніць,*
*Сказаўшы: «Што маё – то табе даю»,*
*Таго Я добра ведаю*
*І ўчыню яго умметам тваім.*
*Хто адзін раз саляват спяе табе,*
*Пякельны Агонь харамам учыню яму.*
*За каго ты будзеш заступацца,*
*Я ўчыню ад пякельнага Агню вольным.*[70]

---

[69] *Рызк* – надзел, пажытак, доля. Даброты, прызначаныя чалавеку ад гэтага свету, прыкладам, ежа, пітво, нашчадкі.
[70] КЛ, с. 120Б-121Б.

## 15. Стаўленне да смерці ў ісламе

إِنَّ اللَّهَ سَرِيعُ الْحِسَابِ[71] الْمَوْتُ رَاحَتُ الْمُؤْمِنِ ،

Смерць – раскоша мусульманская. Праўдзіва, Пан Бог з добрых мусульман лёгка лічбу (=разлік) здыме і да Раю правядзе.[72]

<…>

تُحْفَةُ الْمُؤْمِنِ الْمَوْتُ ، الْمَوْتُ رَاحَتُ الْمُؤْمِنِ

Добраму мусульманіну ад Пана Бога падарунак – смерць. Шчыраму мусульманіну раскоша – смерць.[73]

## 14. Чалавек пазнаецца па справах

مَنْ كَانَ لَهُ وَلِدٌ صَالِحاً فَهُوَ حَيٌّ بَعْدَ الْمَوْتِ فِي قَبْرِهِ[74]

Хто добрым чалавекам уродзіцца, то ён і па смерці жывы да магілы пойдзе да ласкі Божай, як у сад увойдзе.

مَنْ كَانَ لَهُ وَلِدٌ فَاسِقاً فَهُوَ مِسْكِينٌ بَعْدَ الْمَوْتِ فِي قَبْرِهِ[75]

Хто ўродзіцца чалавекам ліхім, лотрам (=нягоднікам), будзе прыказанне Божае ламаць, не слухаць, то ён памрэ – ад ласкі Божай аддалены будзе, ад магілы пойдзе на му́ку.[76][77]

---

[71] араб. “Смерць – гэта выгода верніка, а Аллаг – скоры на разлік”.
[72] КЛ, с. 35Б.
[73] КЛ, с. 36А.
[74] “У каго будзе пабожны нашчадак, той будзе жывы (атрымліваць асалоду) ў сваёй магіле пасля смерці”.
[75] “У каго будзе распусны нашчадак, той небаракам будзе пасля смерці ў сваёй магіле”.
[76] Дадзены ўрывак мае падвойны сэнс: бо, калі дзіця вырасце пабожным, то і бацькі ў яго былі адпаведна добрыя; а калі дзіця будзе распусным – то і бацькоў нельга лічыць добрымі.
[77] КЛ, с. 35Б.

## 15. Што любіш – з тым і будзеш

Як кажуць:

«Хто што любіць на гэтым свеце і што чы́ніць – добрае альбо злое, – з тым і памрэ, і з тым у магіле будзе ляжаць, і з тым на Судны дзень устане».[78]

## 16. Добрая і дрэнная смерць

Калі чалавек пяць вахтаў намаз пастаянна выконваў і добрыя ўчынкі чыніў на гэтам свеце, дык памрэ такі чалавек, нібыта ў госці паехаў – душа яго пойдзе да чыстай ласкі Божай. А калі хто, не выстарчаўшы пяць вахтаў намазу, без пакаяння памрэ, – барані́ Божа! – горай магільнай пакуты [нічога] няма.[79]

## 17. Радасць сыходу

Аббас[80] святы ад Прарока ﷺ мовіў: «Калі б мусульманін з гэтага света сыходзіў, аддаўшы Пану Богу павіннасць і загад Яго выканаўшы, Пана Бога Найвышшага, такі чалавек не ўмірае, але да ласкі Божай вячыстай на пацехі і раскошы райскія ідзе».

قَالَ النَّبِيُّ ﷺ : الْمُؤْمِنُونَ لَا يَمُوتُونَ

بَلْ يَنْقَلِبُونَ مِنْ دَارِ الْفَنَاءِ إِلَى دَارِ الْبَقَاءِ[81]

Прарок, яго міласць мовіў: «Мусульманін не памрэ – толькі сыдзе з гэтага света на той вечны свет да раскошаў і пацех райскіх».[82]

---

[78] КЛ, с. 53А.
Прыклад таго, што ўжо па зямным стане можна меркаваць пра прадвызначэнне, для пякельнай кары або для райскіх раскошаў ты створаны. Хоць, вядома, канчатковае рашэнне за Аллагам, таму хай не заспакойваецца пабожны і хай не адчайваецца грэшны.
[79] КЛ, 51Б.
[80] Аббас ібн Абу Таліб – дзядзька Прарока, мір над ім, і яго паплечнік, хай будзе задаволены ім Аллаг.
[81] Вернікі не памруць, не вярнуўшыся з прыстанку нябыту (сегасветнага жыцця) да прыстанку вечнасці. – Р.Д.
[82] КЛ, с. 55А.

## 18. Смерць верніка

Калі век мусульманіну кончыцца, [надыдзе час] з гэтага света сысці, тады да яго ‘Азраіль[83] з анёламі хараша, ласкава прыйдзе, *селя́м* яму дадуць, скажуць яму:

﴿ يَا أَيَّتُهَا النَّفْسُ الْمُطْمَئِنَّةُ ﴾[84]

*«Чыстая душа, удзячнай ты была да Бога, удзячная і цяпер прыказанню Божаму, служыла Яму».*

﴿ ارْجِعِي إِلَى رَبِّكِ ﴾

*Варачайся, адкуль выйшла, да Пана Бога свайго і да натуры[85] сваёй*

﴿ رَاضِيَةً مَّرْضِيَّةً ﴾

*Будзеш удзячнай да Пана Бога, а Пан Бог аддзячыць табе*

﴿ فَادْخُلِي فِي عِبَادِي * وَادْخُلِي جَنَّتِي ﴾[86]

*Чыніла ты паслугі Яму, ідзі ж цяпер, уступай да Раю і ў раскошы яго на векі вечна! Бо на гэтам згіблым свеце няма ні пажыткаў, ані клопатаў табе».*

А душа, тое ўчуўшы і ўвідзеўшы, радуючыся, з цела выйдзе і над целам стане. Аж пакуль пахаваюць, душа пры целе будзе. Як пахаваюць, душа да цела ўвойдзе. Скора пахаваюць, адыйдуць людзі ад магілы, тады ажыве. Нікога пры ім не будзе, жаласна ўздыхне. Будзе клікаць жонку, дзяцей сваіх, блізкіх, крэўных,

[83] Анёл смерці.
[84] 89:27 *“О душа, якая прыдбал супакой у ісціне”* (Паводле тафсіру Мунтахаб)
[85] Магчыма, маецца на ўвазе фітра, чыстая натура чалавека, якая імкнецца да ісціны, альбо праўдзівая радзіма.
[86] Гэты і два папярэднія ўрыўкі: (89:28-30) *“Вярніся да свайго Госпада задаволенай і заслужыўшай задаволенасць! Увайдзі ў круг Маіх рабоў! Увайдзі ў Мой Рай!”*

суседзяў сваіх – там яму ніхто не адзавецца, ні ад каго голасу не пачуе. Тады крывавымі слязамі заплача, тады прыдуць пытальнікі да яго, Мункар і Накір.

[Пытальнікі], прыйшоўшы

وَيَقُولُ مَنْ رَبُّكَ وَمَا دِينُكَ وَمَا نَبِيُّكَ[87]

скажуць да яго: «Хто твой Бог? Што за вера твая? Хто твой Прарок?» А ён ім так адкажа: *«Раббы́м Аллаг, дзі́ніль-Ісля́м, кітáбуль-Кур'ан, набі́йю Мухáммад расýлю-Ллагі, сáлля-Ллагу алéйгі ўа сáллем»* – «Паверыў я ў Пана Бога Адзінага, вера мая мусульманская, а ў кнігу – Кур'ан, а ў прарока – Мухаммада, Пасла Божага, ласка Божа над ім. То мая вера».

А ў тым яму́ магілу найлепшы і найхарошшы палац Пан Бог Міласцівы з моцы-ласкі Сваёй учыніць. Яму потым па правай старане адны вароты адчыняцца райскія. З тых варот аж да Суднага дня пахі і пажыткі райскія таму *мейіту* прыходзіць будуць. Потым яму з яго добрага ўчынку аднаго анёла Пан Бога створыць, добрым пахам, харошым тварам той учынак яго аж да Суднага дня пры ім будзе ў магіле, як з наймілшым другам да Суднага дня цешыціся з яго будзе.[88]

## 19. Аб смерці няверніка

﴿ فَسَبِّحْ بِسْمِ رَبِّكَ الْعَظِيمِ ﴾[89]

[87] "Скажуць: "Хто твой Госпад? І што за вера твая? І што за прарок у цябе?" Падобны хадзіс:

يُحَدِّثُ عَنِ الْبَرَاءِ، عَنِ النَّبِيِّ ﷺ فِي قَوْلِ اللَّهِ : ( يُثَبِّتُ اللَّهُ الَّذِينَ آمَنُوا بِالْقَوْلِ الثَّابِتِ فِي الْحَيَاةِ الدُّنْيَا وَفِي الآخِرَةِ ) قَالَ " فِي الْقَبْرِ إِذَا قِيلَ لَهُ مَنْ رَبُّكَ وَمَا دِينُكَ وَمَنْ نَبِيُّكَ " .

(Сунан ат-Цірмізі, 3120 (3411).

[88] КЛ, 51Б-52Б.

[89] (56:74) *"Услаўляй імя Госпада свайго Вялікага".*

Пан Бог тым Сваім вялікім іменем паведамляе, калі кяфірын умірае, або п’яніца без пакаяння, або каторы Пану Богу застаў вінен намазаў або постаў, або якіх-кольвек павіннасцей Пану Богу не аддаўшы, умірае, да таго чалавека Азраіль прыдзе з мукара́мі пякельнымі. Прынясуць бічы агняныя, строгімі, страшнымі пакажуцца з левага боку, возьмуць душу, будуць рваць ды торгаць.

Яго душа, той страх і пакуту відзячы, з цела выйсці не захоча, па частках цела будзе хавацісяя. Многа цяжкасці дадуць, душа не выйдзе. Потым Азраіль скажа: «І, душа, ідзі з цела хутка, на свеце болей злога чыніць не будзеш! Калі не пойдзеш, Божая кляцьба над табою будзе!»

Душа тое пачуе, цяжка з цела выйдзе і над целам стане. Пакуль да магілы цела ўложаць, душа пры целе мае быць. А па пахаванні ў цела ўвойдзе, «Ах, вах!»– скажа і жаласна ўздыхне. Мункар і Накір прыйдуць, пытальнікі – два ангелы, вельмі строгія, страшныя. Твары ў іх чорныя, вочы вялікія, сінія, самі страшныя, з рота ў іх агонь палае, з носа ў іх дым вялікі, як з коміна ідзе, у руках вялікія булавы агняныя.

وَيَقُولُ مَنْ رَبُّكَ وَمَا دِينُكَ وَمَا نَبِيُّكَ[90]

Скажуць да яго: «Хто твой Бог? Што за вера твая? Хто Прарок твой?» Ён да іх так скажа: «Вы мае богі!»

Ударацьяго тымі агнянымі булавамі сем разоў, яго далей у зямлю ўваб’юць. Скажа ім: «Прашу вас, не біце мяне, я многа хварэў». Скажа: «Акром вас, Бога не знаю». Зноў яго ўдарацьаж нагу ў нагу ўваб’юць. Потым з леваго боку браму пякельную адчыняць, вужы-га́дзіны да яго прыйдуць яго цела есці. З тых вужоў калі б адзін на гэты свет дыхнуў, то бы на свеце навекі нічога не радзіла.

Потым на бо́льшую жаль яго і на смутак у галавах яго адчыняць браму райскую, пакажуць пажыткі райскія. Скажуць яму:

[90] “Скажуць: “Хто твой Госпад? І што за вера твая? І што за прарок у цябе?”

«Чалавеча, калі б ты на свеце будучы, добрыя ўчынкі чыніў, то гэтыя пажыткі і роскашы ўжываў бы таксама!»

Ужо ён будзе каяціся, уздыхаць, скажа: «Калі б мне Пан Бог знову на свет выпусціў – ужо ўчынкі добрыя чыніў бы!»

Потым тыя вароты райскія зачыняцца, а ў магіле ўчынак яго ліхі, смярдзючы страшным, глухім і сляпым зрабіўшы, ля яго пакінуць.

Потым яго тымі булавамі яшчэ раз ударац так моцна, што душу яго аж да Сіджыну[91] ўваб'юць. А той яго ўчынак аж да Суднаго дня ля яго будзе сядзець і яму пакуту будзе чыніць. Прасіць будзе яго – не пачуе, кланяцца будзе яму – не ўбачыць. Горай магільнай пакуты няма!..[92]

## 20. Сіджын – месца душ нявернікаў

Прарок, яго міласць, мовіў: «У Сіджыне пад сямю землямі – у тым Сіджыне ёсць адна пячора з агню. Душы памерлых нявернікаў да неба не панясуць; на неба іх не прымуць, назад вернуць. Зямля іх не прыме, да Сіджыну ўкінуць. У тым Сіджыне ёсць адно чорнае дрэва, на тым дрэве імёны шайтанскія напісаныя».

Прарок, яго міласць, мовіў: «Пан Бог стварыў адну пячору ў Пекле. У той пячоры галава прыкрытая, а імя той пячоры – Фэлек[93]. У Сіджыне ёсць адна пячора, верх непрыкрыты, там кяфірскія душы. Там жа і рэестры, напісаныя на жалезнай дошцы».

﴿ وَمَا أَدْرَاكَ مَا سِجِّينٌ * كِتَابٌ مَّرْقُومٌ * ﴾[94]

Тыя рэестры – у месцы Сіджыну, дзе напісаны імёны нешчаслівых, грэшных людзей, тыя рэестры – рэестры злых

---

[91] *Сіджын* – (ар. سِجِّين , “вязніца, турма”) – тут: месца пад сёмай зямлёй, дзе знаходзіцца кніга з учынкамі грэшнікаў, д'яблаў і нявернікаў, вузкае і цеснае месца. Узгадваецца ў Кур'ане (83:7-9).

[92] КЛ, с. 53А-54А.

[93] араб. فَلَق

[94] (83:8-9) *“А адкуль табе ведаць, што такое Сіджын? Кніга напісаная, (дзе запісаны злачынствы пякельных жыхароў)”.*

учынкаў. Пан Бог іх схаваў і тое збудаваў для шайтанскіх, кяфірскіх, ліхадзейскіх душ учынкаў іх запячатаныя там, але хто убачыць [гэтыя словы] – няхай ведае, што там дабра няма.

﴿ ثُمَّ إِنَّهُمْ لَصَالُو الْجَحِيمِ *
ثُمَّ يُقَالُ هَذَا الَّذِي كُنتُم بِهِ تُكَذِّبُونَ * ﴾[95]

І пагоняць усіх кяфіраў, не маючых іману, да Пекла палаючага на цяжкую пакуту. І мовяць да іх: «Тут маеце [быць] з-за сваёй нявернасці, цяпер каштуйце напраўду пякельны Агонь і горыч пякельную, ці смачная?!»[96]

## 21. ‘Ілійюн – месца душ вернікаў

Як у Кур’ане піша:

﴿لَفِي عِلِّيِّينَ﴾[97]

«Ідуць мусульманскія душы да ‘Іліййін-мейсца[98]«.

Прарок, яго міласць, мовіў: «’Іліййін знаходзіцца над сямю нябёсамі – пад ‘Аршам з перла (жэмчугу) дошка павешана. Рабы Божыя і паклоны іх на той табліцы напісаныя».

Ка’б аль-Ахбар[99] мовіў: «На правай старане ‘Аршу».

---

[95] (83:16-17) *“І потым яны будуць гарэць у агні, а пасля будзе сказана: “Гэта тое, што вы зняпраўджвалі!”*
[96] КЛ, 54А-55А.
[97] (83:18)
[98] *‘Ілійюн* – спіс, дзе занатаваны добрыя справы мусульман, а таксама месца, дзе захоўваецца гэты спіс. Знаходзіцца яно вышэй за сёмае неба, ля Лотасу крайняе мяжы (Сідратуль-мунтага), дзе сканчаецца мяжа створанага Сусвету.
[99] Абу Ісхак Ка’б аль-Ахбар (араб. كعب الأحبار) – еменскі іўдзей, які прыняў іслам і стаў адным з аўтарытэтных каментатараў (муфасіраў )Кур’рану. Передаваў шмат іўдзейскіх паданняў *(ісраіліят)*.

Даххак[100] мовіў: «Гэта *Сі́драту-ль-мунтага́*[101]«. Што гэта такое, ведай – у Раі ёсць адно дрэва. Ад усходу аж да заходу голле таго дрэва, а тое дрэва завецца *Сідрату-ль-мунтага*. Называюць [так] таму, што гэта канец шляхоў анёльскіх, далей за яго анёлы не ходзяць, і ўсялякае стварэнне ведае толькі [пра тое, што знаходзіца] да таго месца. А далей што дзеецца, ніхто не ведае, акрамя Пана Бога.[102]

## 22. Хто будзе ў Сіджыне і ‘Ілійюне

Пан Бог мовіў: «Як разумееш, і, Мухаммад, месца Сіджын? Гэта месца шайтанаў і кяфіраў (=нявернікаў), лотраў (=ліхадзеяў), чараўнікаў, блуднікаў, каторыя айцоў-матак не шануюць, людзей скупых, зайздроснікаў, тых, хто ў суседстве нядобра жыве, зводцаў, перагаворнікаў (=пляткароў) – усе яны ў Сіджыне павінны быць.

А хто будзе ў ‘Іліййюне – твары іх ясныя, як поўня-месяц, бо яны намаз чыталі, пост поснікалі, закят-садаку давалі, курбаны чынілі, да хаджу хадзілі, у чыстасці кахаліся і да джамаату[103] ішлі».[104]

## 23. Табліцы Азраіля

*[Прарок Мухаммад] мовіў:*
*«Што гэта за табліца, і, Азраілю?»*
*Ён мовіў: «Паслухай, будзеш ведаць:*
*Што Пан Бог з Адама душы стварыў,*

---

[100] Абу Мухаммад ад-Даххак ібн Мазахім аль-Гіляліі (الضحاك بن مزاحم الهلالي, пам. у 102, 105 ці 106 г. гіджры) – табіін, муфасір, адзін з распавядальнікаў хадзісаў Прарока, мір над ім. Ад яго перадавалі хадзісы аўтары чатырох збораў хадзісаў (Абу Давуд, Цірмізі, Насаі, Ібн Маджа). Паходзіў з Балха. Суф’ян ас-Саўры казаў: “Перайміі тафсір у чатырох: Са’іда ібн Джубэйра, Муджагіда, ‘Ікрымы і ад-Даххака”.

[101] Сідрату-ль-мунтага (араб. سدرة المنتهى – Лотас крайняй мяжы) – у ісламскай традыцыі лотасавае дрэва на сёмым небе ля Прастола (‘Арш) Аллага.

[102] КЛ, 55А-55Б.

[103] супольнае набажэнства – джамаат-намаз.

[104] КЛ, 55Б.

*То на той табліцы іх імёны.*

*Пан Бог чалавеку скора надасць аблічча,*
*У пакаленне яго на свет пусціць.*
*То на той табліцы ўсе імёны,*
*А на тым дрэве паказаны век і рызк (=пажытак)*

*Як толькі жанчына дзіця народзіць,*
*То на тым дрэве лісток вырасце.*
*Пакуль дзіця расце – лісток расце.*
*Рызк і век яго на тым лістку напісаны.*

*А як рызку не стане – смерць прыйдзе, –*
*То лісток адарвецца і перада мною ўпадзе.*
*А я гляну ў той лісток, убачу,*
*Што за чалавек, чый сын быў – пазнаю,*
*І пашлю анёлаў маіх да яго.*

*І, Прароча, паслухай, што табе скажу:*
*І зыйдуць яго душу браць,*
*Людзям смутак – успамін настаўляць.*
*Калі мусульманін – з правага боку прыйдуць,*
*Калі кяфірын – з левага боку прыйдуць.*

*І так яго ўсе возьмуць,*
*І сціснуць, аж да горла душа прыйдзе;*
*Потым ду́шы я бяру ў іх.*
*Пан Бог што загадае, то і ўчыню.*

*Правай рукой бяру душы мусульманскія,*
*Левай рукой бяру душы кяфірскія.*
*І з радасцяй направаджу да Пана Бога,*
*Такія ўвойдуць мусульмане да Раю.*

*Кяфіраў укідаю ў пекла Джаганнам*[105]*,*
*Хто злосць чыніць – добрасці не будзе мець.*

*Я мовіў: «Ці ты возьмеш і гэтую душу?*
*У зямлю ўложыш гэтае цела?»*
*Мовіў: «Так і ёсць, я бяру душы!*
*Нічым учыню [усіх, хоць бы былі і] якія вялікія паны-султаны!*

*Як многа пакояў раблю без гаспадара!*
*Душу вазьму вялікім страхам так.*
*Як многа замкаў раблю пустымі!*
*І ты не будзь такім, каб аддаць [сваё] нутро гэтаму свету!*
*Як многа тых, каторыя мовілі: «Мой свет!»*
*Усім тым я адняў уладу!*

*Тыя рэчы ўспамянуўшы, заўжды пла́чу.*
*З неба ступіўшым з зямлёй змяшаюся.*
*Вось таму заўжды пла́чу,*
*Гэтую атруту відзячы, не засмяюся.*

*Ведаю, што і я так памру,*
*І сам сваю душу буду браць.*
*Вечны Пан Бог застанецца навек,*
*Стварыцель усё мае знежывіць.*

*Створаныя памруць усе анёлы.*
*Ані зямлі не застанецца,*
*ані неба,*
*ані людзей,*
*ані анёлаў».*[106]

[105] рус. Геенна
[106] КЛ, 125Б-127А.

## 24. Час Суднага дня

Мовіў Пан Бог (85:3):

﴿ وَشَاهِدٍ وَمَشْهُودٍ ﴾

Назначанага Суднага дня ніхто не ведае, калі прыдзе, то гэта смутны дзень. «Гатовыя там сведкі праўдзіва сведчыць будуць адзін другому»: а па-належачаму называе Прарок ﷺ *«шáгід»*[107] – пятніца, а *«машгýд»*[108] – Арафа, бо Судны дзень у пятніцу будзе, [а] іншыя кажуць – пятнічнай ночы будзе.[109]

## 25. Хто не будзе мець страху ў Судны дзень?

Хто бы меў мусульманіна ў доме сваім частаваць дзень і валасы яму пагаліць, за тое яму Пан Бог дасць на Судны дзень яснасць[110], а па Судзе Божым увойдзе да Раю.[111]

***

Як піша (2:262):

إِنَّ ﴿الَّذِينَ يُنفِقُونَ أَمْوَالَهُمْ فِي سَبِيلِ اللَّهِ ثُمَّ لَا يُتْبِعُونَ مَا أَنفَقُوا مَنًّا وَلَا أَذًى لَّهُمْ أَجْرُهُمْ عِندَ رَبِّهِمْ وَلَا خَوْفٌ عَلَيْهِمْ وَلَا هُمْ يَحْزَنُونَ﴾[112]

«Каторыя для Мяне, Бога, чыняць, садаку даюць і з людзьмі добра жывуць – такім у Судны дзень ніводнай пакуты і страху не будзе».[113]

---

[107] Шагід – літ. "сведка".
[108] Машгуд – літ. "засведчанае".
[109] КЛ, 33А.
[110] Маецца на ўвазе асаблівае становішча, альбо азнака гасціннага гаспадара.
[111] КЛ, 31А.
[112] "Хто ахвяруе на шляху Аллага, і пасля не кідае ўслед за гэтым дакоры і абразы, атрымаюць узнагароду ў Госпада свайго. Няма над імі страху і не будуць яны засмучаны".
[113] КЛ, 9А.

***

Абу Гурайра, удзячнасць Божая над ім, паведамляе ад Прарока, яго мілосці: «Суднаго дня траім людзям страху няма:

першыя – каторыя пастаянна Кур’ан пяюць;

другія – каторыя слугі прыказу Божы належнае аддаюць і прыказу гаспадара свайго слухаюць;

трэція – што для ўдзячнасці Божай да намазу азан пяюць».[114]

## 26. Адыход ад веры *(ры́дда)* і вяртанне ў іслам

Хто бы меў іман і веру мусульманскую вызнаўшы, прыняць, трэба ад грахоў сваіх учыненых каяцца, іман наноў прыняць, мусульманінам застацца. Потым трэба ад няве́р’я высцерагацца, ад слова нявернага, каб кяфірынам (=нявернікам) не стаць.[115]

***

Хто бы [і] ў жартах слова нявернае вымавіў, то ў Пісьму (=Кур’ане) піша, [што] да таго часу што чыніў, учынкі добрыя, пабожныя, хоць бы колькі дзясяткаў год, – то за тое слова ўсе ўчынкі добрыя ў ніштo абернуцца і жонка яму харамам стане.

Так трэба шкадаваць, плакаць, таму граху каяцца і зноў іман пець (=вяртацца да веры), з жонкаю шлюб браць. А калі таго не меў чыніць – той кяфірыну роўны, а калі памрэ – навекі ў Пекле застанецца.

Хоць бы і да Ка’бэю хадзіў – ад таго спасення няма, страціў, зноў хадзіць трэба[116].

Хоць бы і жонка так вымавіла, то ўчынкі траціць, як і мужчына. Трэба іманы пець, мусульманкай стаць і з мужам [ізноў] шлюб браць, ад таго граху каяцца, мовіць: «Стварыцелю Божа, да Цябе, Адзінаго Бога, уцякаю ад тых паганых учынкаў».

Ад няверных слоў гэта дуа трэба пець рана і ўвечар, іншага лякарства няма:

---

[114] КЛ, 88Б.

[115] КЛ, 137А.

[116] Г.зн., нават калі выканаў хадж, узнагароду за яго страціў з-за сваёй рыдды.

اَللّٰهُمَّ إِنِّي أَعُوذُ بِكِ أَنْ أُشْرِكَ بِكَ شَيْئًا وَأَنَا أَعْلَمُ وَأَسْتَغْفِرُكَ لِمَا لاَ أَعْلَمُ ، إِنَّكَ أَنْتَ عَلَّامُ الغُيُوب[117]

Пан Бог таго чалавека ад няверных слоў асцеражэ.[118]

***

Няверных слоў многа, не можам вылічыць. Толькі каротка напісалі няверных слоў, на якія чалавек, глянуўшы, каб ад іншых высцерагаўся.

Найперш – хто б меў Богу Адзінаму што-кольвек прыраўнаваць (=палічыць раўнёю), асобу нейкую: або айца, або матку, або сына, або які шлунак (=частку цела) меў прыраўнаваць; або мовіў: «Бога ждаў», або мовіў: «У Бога за дзвярыма быў» або «[У Бога за дзвярыма] не быў»; або мовіў, [што] Бог есць або спіць. Або якую рэч нягожую меў бы ўяўляць, чаго Богу не годна мець. Ніхто не можа ведаць, у якой постаці [Бог] ест.

А другое – хто бы меў Божага фарзу з прыказу адно зга́ніць (=не прызнаў бы абавязковым які-небудзь рэлігійны абавязак).

А трэцяе – хто бы меў [хоць] аднаму прароку прыпісаць няпраўду.

Чвартае – хто бы меў з анёлаў [хоць] аднаго не паважаць.

Пятае – хто бы меў з вучоных людзей [хоць] аднаго без прычыны не паважаць.

---

117 *“О Божа! Папраўдзе, я шукаю прытулку ў Цябе, каб не надаваць Табе раўні хоць штосьці, ведаючы гэта, і прашу прабачэння ў Цябе ад таго, чаго я не ведаю. Папраўдзе, Ты – Знаўца таемнага!”*. Гэтую дуа Прарока, мір над ім, супраць пападання ў шматбожжа *(шырк)* перадаюць імам аль-Бухары ў кнізе “Аль-Адаб аль-муфрад” (716), Ібн ас-Сунні ў кнізе “’Амаль аль-яўм валь-лейля” (381), Ібн Батта ў кнізе “аль-Ібана” (6 / 53/2). Хадзіс варты даверу *(сахіх)*.

118 КЛ, 137А-137Б.

Шостае – навуку Божую ўлехца мець (=сумнявацца або адмаўляць).

Сёмае – вучоных людзей рашэнне з навукі, каторая рэч ест халяль есці-піць, хто бы за харам або за заваду (=шкоду) лічыў.

Восьмае – хто бы меў харамныя пажыткі або напітак харамны халялем назваць або лякарствам; або хто нявернае слова вымавіў, а другі стаў бы там смяяцца – такія абодва кяфірамі стануць.[119]

***

У «Фетваю»[120] піша: «Хто бы меў таемныя рэчы угадаваць, чаго яму Бог не даў ведаць, казаў бы [не маючы ведаў, што] дождж будзе або пагода; або ўраджай, або неўраджай; або [што] падарожны тады і тады прыедзе, або не прыедзе; або фал[121] глядзіць – не ўгадае або ўгадае, як бы Богу раўнаваўся. Хто бы меў такія рэчы казаць, а другі меў б таму верыць – абодва кяфірамі застануць».

الْعِلْمُ عِنْدَ اللهِ ، لاَ يَعْلَمُ الغَيْبَ إِلاَّ اللهُ[122]

***

Хтобы меў [штосьці] з прароцкіх сюннетаў пераіначыць – справу зганіць, نَعُوذُ بِاللهِ مِنْ ذَلِكَ[123].[124]

---

[119] КЛ, 138А-138Б.

[120] Маецца на ўвазе адна з кніг-збораў фетваў, рэлігійна-праравых рашэнняў, такіх, як "Фатава-Гіндзія" альбо "Фатава Кады-хан" і інш.

[121] Разнавіднасць варажбы

[122] "Усе веды – у Аллага, не ведае таемнага ніхто, апроч Аллага". Параўн. Св. Кур'ан, 27:65:

﴿ قُل لَّا يَعْلَمُ مَن فِي السَّمَاوَاتِ وَالْأَرْضِ الْغَيْبَ إِلَّا اللَّهُ وَمَا يَشْعُرُونَ أَيَّانَ يُبْعَثُونَ ﴾

*"Скажы: "Аніхто ні ў нябёсах, ні на зямлі не ведае таемнага, акрамя Аллага, і ніхто не ведае, калі будзе ўваскрэшаны".*

[123] араб. "Просім ратунку ў Аллага ад гэтага" (параўн. бел: "Хай Бог бароніць")

[124] КЛ, 138Б. Усе пералічаныя справы могуць вывесці чалавека з ісламу. Але канчатковае рашэнне аб тым, хто выйшаў з ісламу, а хто не, павінен выносіць кампетэнтны чалавек, вучоны або ўпаўнаважаны мусульманскім кіраўніком

## 27. Якое лякарства ад граху і нявер'я?

Пэўна, Пан Бог мовіў: «Усялякі грэх калі чалавек учыніць, вялікая атрута яму самому той грэх. На помач і лякарства тых грахоў – каята і пакута. Бо чалавек дзе грэх учыніць, потым убачыш – за гэты грэх пакаецца, жалюе (=шкадуе) за той учынак ліхі, што чыніў, Пан Бог з ласкі Сваёй [грэх] адпусціць».

Яшчэ Пан Бог мовіў: «Учынкі добрыя, спасёныя чыніць, каторыя удзячныя Мне, Пану Богу, тыя чыні – усе грахі зыйдзе ў чалавека з ласкі Божай»[125].[126]

## 28. Як уберагчы іман

І вельмі ў сабе іман сцеражы, бо іман не ў кожным [ёсць]. Аднак на пяць раз намаз з джамаатам кланяючыся – у тых людзей іман вялікі, а ў іншых – меншы.

А людзі, каторыя сумысля намаз не кланяюцца, у тых людзей іману няма, نَعُوذُ بِاللهِ مِنْ ذَلِكَ خِذْلاَنٍ[127]

– абарані Божа ад такой нягоды.

Людзі, якія з іманам сыдуць – без пытання, без пакуты ўвойдуць да Раю, а без іману ўмерлыя – пойдуць проста да Пекла. А хто хоць бы на адну парушынку *іману* меў і памёр, у рэшце рэшт з Пекла выйшаўшы, да Раю ўвойдуць.[128]

---

суддзя. Звычайны прыхаджанін альбо нават імам мячэці такія выракі выносіць не павінен. Задача любога верніка – дапамагчы свайму брату, растлумачыць яму тыя пытанні, якія выклікалі яго сумневы або складанасці. Прынамсі, калі сам вернік не ведае, як дапамагчы, ён павінен адвесці свайго брата да знаўцы ісламу.

[125] Алюзія на Кур'ан, 11:114: *"Папраўдзе, добрыя справы выдаляюць дрэнныя ўчынкі"*.

﴿ إِنَّ الْحَسَنَاتِ يُذْهِبْنَ السَّيِّئَاتِ ﴾

[126] КЛ, 137А.

[127] *на'узу бі-Ллягі мін залікя хызлян* (ар. "Шукаем прытулку ў Аллага ад такога пакідання без дапамогі").

[128] КЛ, 39Б. Звярніце ўвагу, перад людзьмі, якія легкадумна кажуць: "Ну і што, памучаюся-памучаюся, і ў Рай патраплю", – стаяць дзве складанейшыя перашкоды. Па-першае, ім (як і ўсім нам) трэба пражыць з *іманам*, быць вернікамі і памерці, маючы веру ў сэрцы (і хай Бог дасць гэта). Па-другое, ім трэба

## 29. Што ўмацоўвае іман, а што губіць

Ведай, праз што іман набудзеш, а праз што загубіш. Бо з іманам хоць бы малыя ўчынкі чыніў, то ў ласцы Божай будзеш. А без іману хоць бы і надта ўчынкі добрыя чыніў, [усё адно] ласкі Божай не будзеш мець.

Веры апора – намаз, пост, закят, дзесяціна[129], чыстасць, гусюль, абдэсь, у адзіноства Божае верыць [і пераканана] ведаць, Прарока Мухаммада, яго міласць, паслом Божым праўдзівым вызнаваць, таго Прарока, якога Пан Бог Мустафою[130] назваў.[131]

## 30. Не губляйце надзею

﴿ قُلْ يَا عِبَادِيَ الَّذِينَ أَسْرَفُوا عَلَىٰ أَنفُسِهِمْ ﴾

(39:53) «Скажы, Мухаммад, слугам Маім: «І, слугі Божыя, якія век свой празмерна трацілі на пажадлівасць хосці (=нізкай натуры, нафса) сваёй,

﴿ لَا تَقْنَطُوا مِن رَّحْمَةِ اللَّهِ ﴾

не трацьце надзеі на міласэрнасць Божую.

---

рыхтавацца да Пекла, якое яны сабе так спакойна прысуджаюць. А пакаранне там – не тое саме, што тут, на гэтым свеце. Калі спытаць любога разумнага чалавека, ці хоча ён хоць на кароткі час патрапіць у вязніцу нават на кароткі час, той абавязкова адкажа: “Не!” Калі ж кажуць пра пакуты на тым свеце, яго розум недзе прападае і ён без усялякага вагання пагаджаецца на пякельныя пакуты і сорам у Судны дзень перад усімі людзьмі.

[129] ‘Ушр – закят з сельскагаспадарчых прадуктаў.

[130] араб. مُصْطَفَى – “абраннік Божы”.

[131] КЛ, 56 Б. Кожны добры ўчынак можа стаць мастом у вечнасць. А кожны выкананы абавязак (перад Богам і Яго стварэннямі) – гэта крок да задавальнення Божага і выратавання ў вечнасці. І для дасягнення гэтых жаданых мэтаў звычайна патрэбен мінімум часу, высілкаў і цярпення. Вынікам жа такой дыхтоўнасці і пастаянства ў выкананні абавязкаў стане спакой душы і сэрца, развіццё адказнасці і дысцыпліны, імкненне да новых вышынь і поспехаў. Карацей кажучы, калі чалавек хоча лічыцца сапраўдным вернікам, ён павінен быць непахісным у сваёй практыцы.

﴿ إِنَّ اللَّهَ يَغْفِرُ الذُّنُوبَ جَمِيعًا ﴾

Праўдзіва, Пан Бог [здольны] адпусціць вашы грахі ўсе вам.

إِنَّهُ هُوَ الْغَفُورُ الرَّحِيمُ

Праўдзіва, Ён, Бог – Міласэрны».[132]

***

Як піша ў Кур’ане (25:70):

﴿ إِلَّا مَن تَابَ وَآمَنَ وَعَمِلَ عَمَلًا صَالِحًا فَأُولَئِكَ يُبَدِّلُ اللَّهُ

سَيِّئَاتِهِمْ حَسَنَاتٍ وَكَانَ اللَّهُ غَفُورًا رَّحِيمًا ﴾[133]

Пан Бог мовіў: «Толькі пакайцеся, Мне, Богу, верце, учынкі добрыя чыніце – Я вашы грахі спасеннем учыню. Пан Бог – грахі адпусклівы, Ласкавы».[134]

---

[132] КЛ, 36А.

[133] (25:70) *Гэта (пакаранне) не адносіцца да тых, якія раскаяліся, паверылі і рабілі дабро. Іх злыя ўчынкі Аллаг заменіць добрымі, бо Аллаг – Прабачлівы, Міласэрны.*

[134] КЛ, 46А.

## ІСЛАМ

*Слова «іслам» у вузкім сэнсе абазначае рэлігійную практыку. Ён уключае ў сябе пяць асноўных дзеянняў, якія кожны вернік абавязаны прызнаваць асабістым абавязкам: шагада (сведчанне веры);*

*штодзённы пяціразовы намаз;*

*пост (устрыманне ад ежы, пітва і блізкасці з жонкай у светлы час содняў падчас месяца Рамадан);*

*закят (міласціна, роўная 1/40 долі ад маёмасці, якая стабільна прыносіць прыбытак);*

*хадж (паломніцтва ў святыя мясціны Меккі ў першай палове месяца Зуль-хіджа).*

*Іслам як рэлігія падзяляе ўсе дзеянні здаровых, разумных і дзеяздольных мусульман на некалькі катэгорый:*

***Фарз (фард)** – неабходныя (якія прадпісаны Кур'анам), напрыклад: пералічаныя вышэй намаз, пост і інш., выкананне правоў бацькоў, суджэнцаў, пахаванне нябожчыка і інш. Хто выконвае фарз – заробіць узнагароду ад Бога. Хто не выконвае – робіць цяжкі грэх, хто адмаўляе абавязковасць фарзу – перастае быць мусульманінам, трапляе ў нявер'е і павінен пакаяцца ад сваёй адмовы.*

***Ва́джыб** – абавязковыя, надзвычай важныя (прадпісаныя Прарокам, мір над ім, і цесна звязаныя з фарзам па значнасці). Хто выконвае ваджыб – будзе ўзнагароджаны Аллагам. Хто не выконвае і адмаўляе яго важнасць – робіць грэх.*

***Су́нна (сюннет)** – пажаданыя (рэкамендаваныя Прарокам, мір над ім, дзеянні, якія ён стараўся выконваць як мага часцей). За выкананне сунны – будзе ўзнагарода, а невыкананне – не лічыцца вялікім грахом, хоць і вартае няўхвальнага стаўлення, бо Аллаг спытае і за гэта.*

***Мустаха́б** – дадатковыя пажаданыя (дзеянні, якія Прарок, мір над ім, ра́дзіў выконваць, але сам рабіў іх зрэдчас). Хто выконвае*

*мустахаб, атрымае Боскую ўзнагароду, а хто не – той не панясе ні граху, ні адказу за гэта.*

***Мубáх*** *– нейтральнае дзеянне, якое можна рабіць альбо не рабіць без наступстваў у вечнасці – за яго няма ні ўзнагроды, ні граху (напрыклад, есці ў меру, ужываць мяса зарэзанай паводле шарыяту дазволенай жывёлы, піць напоі, якія не адурманьваюць і г.д.).*

***Макрýг*** *– непажаданыя ўчынкі, якія Прарок, мір над ім, не рабіў і не рэкамендаваў рабіць іншым. Хто свядома адмаўляецца зрабіць такое, баючыся трапіць у грэх – атрымлівае ўзнагроду ад Бога, а хто робіць – атрымае малы грэх. Хто адмаўляе грахоўнасць такіх учынкаў – лічыцца грэшным, але ўсё ж вернікам.*

***Харáм*** *– катэгарычна забароненае (Кур'анам і Прарокам, мір над ім). Хто пазбягае хараму ў рэчах, справах і словах, маючы магчымасць учыніць яго – атрымае ўзнагароду ад Аллага. Хто займаецца харамам – робіцца вялікагрэшнікам. А хто адмаўляе яго забароненасць – трапляе ў нявер'е і павінен як мага хутчэй пакаяцца і вярнуцца да ісламу.*

## 1. Усім імамам трэба верыць

Ведайце, што Пан Бог Кур'анам, аятам альбо праз Джабраіля, яго міласці, [паведаміў] альбо Прарок, яго міласць, або сахабэі прароцкія мовілі, – таму ўсяму верыць трэба. Абавязак кожнага, калі імам Абу Ханіфа[135] святы, або імам Шафі'і[136], або імам Малік[137], або імам [Абу] Юсуф[138], альбо іншыя імамы казалі [па пытаннях рэлігіі], то любога імама словы пачуўшы, трэба верыць і дзяржацца таго.

Навука Абу Ханіфы-імама больш пэўная, бо ў яго памылкі няма, а ў іншых імамаў [можа быць] памылка[139]. Бо імам Абу Ханіфа, яго мілосць, у восемдзясят год пасля Прарока, яго міласці, радзіўся, а тыя імамы, іх міласць, ласка Божая над імі ўсімі, ад імама Абу Ханіфы навукі вучыліся. Потым у іншых імамаў вучыліся, а потым мала розніцы і спрачання з яго міласцю, тыя імамы з імамам Абу Ханіфам маюць. І хоць тое спрачанне з волі Пана Бога стала, аднак жа Абу Ханіфы-імама, яго міласці, словаў трымацца – спасення болей будзе.[140]

---

[135] Абу Ханіфа ан-Ну'ман ібн Сабіт аль-Куфі (араб. ابو حنيفة النعمان بن ثابت بن الكوفي ; 699-767) – ісламскі багаслоў, правазнаўца і мухаддзіс, заснавальнік і эпонім адной з чатырох сунніцкіх правазнаўчых школ – ханафіцкага мазгаба.

[136] Абу Абдуллаг Мухамад ібн Ідрыс аш-Шафі'і (араб. محمد بن إدريس الشافعي ; 767-820) – ісламскі багаслоў, правазнаўца, хадзісазнаўца, заснавальнік і эпонім іншай сунніцкай прававаой школы – шафііцкага мазгаба.

[137] Абу Абдуллаг Малік ібн Анас аль-Асбахі, больш вядомы як імам Малік (араб. مالك ابن أنس الأصبحي ; 713-795) – правазнаўца, мухаддзіс, заснавальнік і эпонім малікіцкага мазхаба у суннізме.

[138] Абу Юсуф Якуб ібн Ібрагім аль-Ансары аль-Куфі (араб. أبو يوسف الأنصاري ; 731-798) – правазнаўца (факых), адзін з найбольш вядомых вучняў Абу Ханіфы. Пасля смерці Абу Ханіфы ўзначаліў яго школу. Быў вярхоўным суддзёй *(кады аль-кудат)* халіфата, спрыяў распаўсюджванню поглядаў ханафіцкага мазгаба.

[139] Вядома, памылкі маюць усе людзі. Аўтар хоча сказаць, што для паслядоўніка любога мазгаба (які не з'яўляецца экспертам у шарыяцкіх навуках) падыход яго мазгаба больш правільны за іншыя (паколькі ён не здольны адэкватна ацэньваць абгрунтаванасць прававых пастановаў). Пазіцыя сунніта, які абраў сабе мазгаб, такая: мой мазгаб правільны, але можа мець памылкі, а мазгаб іншых памылковы, але можа быць і правільны.

[140] КЛ, 69А.

## 2. Асновы практыкі ісламу

Як мовіў Пан Бог:

[141]﴿ قُلْ كُلٌّ مِّنْ عِندِ اللَّهِ ﴾

(4:78) *«Такі загад ад Пана Бога, то ўсяму верыць павінен мусульманін»*:

أَشْهَدُ أَنْ لاَ إِلَهَ إِلاَّ اللَّهُ

«Вызнаю, што Пан Бог – акрамя Яго іншага Бога няма, толькі Бог Стварыцель,

وَأَشْهَدُ أَنَّ مُحَمَّدًا عَبْدُهُ وَرَسُولُه

і вызнаю, што слуга і пасланец Божы праўдзівы – Мухаммад-прарок ﷺ».

وَإِقَامُ الصَّلَوةِ وَإِيتَاءِ الزَّكَوةِ وَصَوْمُ الشَّهْرِ رَمَضَانَ

وَحَجُّ ﴿الْبَيْتِ مَنِ اسْتَطَاعَ إِلَيْهِ سَبِيلًا ﴾

Кланяйцеся на кожны дзень па пяці раз намаз
і выдавайце са скарбаў сваіх закят і дзесяціну,
поснікайце месяц Рамадан
і да хаджу ідзіце, *«хто мае магчымасць»* (3:97), – Пан Бог кажа так чыніць.[142]

## 3. Абавязковае для кожнага

*‘Айн-фарз* [143] – тое, што Пан Бог Кур’анам прыказаў, [напрыклад]: іман; абдэст-гусюль браць, пяць раз на дзень намаз

---

[141] (4:78) “Скажы: “Усё [што адбываецца] – ад Аллага”.
[142] КЛ, 6Б-7А.
[143] Фарз-айн – асабісты абавязак кожнага верніка. Хто яго не выконвае – робіць грэх.

кланяціся, Рамазан-месяц поснікаць, закят і дзесяціну даваць, каму стае́, багатаму, да Каабэю ісці. А *кіфае-фарз*[144] – гэта [напрыклад] джаназе-намаз пець, кожнаму, хто мае патрэбу, чалавеку дабро чыніць і зычыць дабра, і хворых людзей наведваць».[145]

***

﴿ يُقِيمُونَ الصَّلَوٰةَ وَيُؤْتُونَ الزَّكَوٰةَ ﴾[146]

وَالصَّوْمُ شَهْرُ رَمَضَان

Пан Бог учыніў фарзам на дзень пяць вахтаў намаз і са скарбаў сваіх выдаваць закят і з пашы дзесяціну, [а таксама] поснікаць месяц Рамазан.[147]

***

Калі спытаюць: «Да веры мусульманскай спосабаў колькі?» (=колькі абавязкаў у кожнага мусульманіна). Кажы: «Дванасце:

Першае – Пана Бога Адзіным павінен вызнаваць, Мухаммад-прарока ﷺ – паслом Божым праўдзівым вызнаваць, з людзьмі добра жыць.

Другое – абдэсь браць.

Трэцяе – пяць раз на дзень намаз кланяцца.

Чвартае – закят даваць.

Пятае – да хаджу ісці.

Шостае – Рамазан-месяц поснікаць.

Сёмае – гусюль браць.

---

144 Фарз-кіфая – калектыўны абавязак супольнасці вернікаў. Калі хоць некалькі вернікаў ці нават хтосьці адзін яго выконвае – такому запісваецца ўзнагрода, а грэх знімаецца з усіх астатніх вернікаў гэтай мясцовасці, а калі не выканае ніхто – грэх запісваецца ўсім.

145 КЛ, 41Б.

146 (5:55): "[тыя вернікі], хто выконвае намаз, выплочвае закят"… "і [трымаюць] пост месяца Рамадан".

147 КЛ, 14Б.

Восьмае – [падчас вайны] з кяфірамі (=няверанікамі) за веру біціся.

Дзявятае – усялякі Божы прыказ знаць і дзяржаць.

Дзясятае – ад злога высцерагаціся.

Адзінаццатае – любоў да мусульман мець.

Дванаццатае – звычай мусульманскі перасцерагаць[148]«.[149]

## 4. Катэгорыі ўчынкаў

Што б Пан Бог у Кур’ане ні сказаў, таму ўсяму трэба верыць. Павінны мы шчыра верыць Кур’ану. Што ў Кур’ане Пан Бог загадаў, то ўсё фарз-павіннасць, а што без аяту кур’аннага, ад прарока Мухаммада ﷺ загаданае, – гэта сюннет. Спасенне (=узнагарода) – што сюннет, што фарз чынячы, – ласкі Божай годзен будзеш. А не чынячы [фарз, лічыць яго не абавязковым] – кяфірынам будзеш, на вякі пакуту будзеш мець. Калі ж пакаецца, а болей таго не стане чыніць, то Пан Бог змілуецца.[150]

***

Да імамаў і чытальнікаў кожных, і кожнаму імаму, і чытальніку трэба ведаць, шлях да чыстасці і намазу, [а таксама] што такое фарз, ваджыб, сюннет або мустахаб.

Ведай, фарз – гэта тое, што Пан Бог у Кур’ане паведаміў: іман, абдэсь, гусюль браць, пяць вахтаў намаз кланяцца, Рамадан-месяц поснікаць, закят-дзесяціну выдаваць, хто мае спосаб, да Ка’бэю іці і курбан чыніць.

А ваджыб – гэта тое, што Пан Бог загадаў: ваджыб-намаз[151] пець і зільхіджа-месяц дзевяць дней поснікаць і фітрэ даваць, джаназе-намаз пець.

Існуе два віды загадаў Божых: іншае – фарз, іншае – ваджыб.

---

[148] Ставіцца да рэчаіснасці адпаведна нормаў ісламу, заўжды падтрымліваць ісламскія традыцыі і нормы.

[149] КЛ, 42А.

[150] КЛ, 45Б-46А.

[151] маецца на ўвазе вітр (дадатковы начны намаз)

Фарз – гэта тое, калі пакінеш, а не ўчыніш, то будзеш мець пакуту вялікую і кяфірынам будзеш. А ваджыб калі пакінеш і не ўчыніш, пакуту будзеш мець, толькі кяфірынам не будзеш.

А сюннет – гэта тое, што Прарок, яго мілосць, многа раз чыніў. Сюннет хто чыніць – спасенне многа мае мець, а сюннет хто не чыніць, мукі за тое не будзе, ані кяфірынам не будзе, толькі пpароцкая прычына (=заступніцтва Прарока ﷺ, *шафа'ат*) аддаліцца.

А мустахаб хто чыніць – спасення многа будзе, а нечынячы мустахаб кяфірынам не будзе і прароцкая прычына не аддаліцца, толькі спасенне меншае.

Мустахаб-нафіле: гэта намаз-нафіле, пост у чацвяргі-панядзелкі і садакі даванне – гэта нафіле.[152]

## 5. Важнасць чысціні

Ведай жа, што такое тагрэт, або гусюль, або абдэст. Ведай, што такое гусюль, Пан Бог у Кур'ане піша:

﴿ وَإِن كُنتُمْ جُنُبًا فَاطَّهَّرُوا وَإِن كُنتُم مَّرْضَىٰ أَوْ عَلَىٰ سَفَرٍ
أَوْ جَاءَ أَحَدٌ مِّنكُم مِّنَ الْغَائِطِ أَوْ لَامَسْتُمُ النِّسَاءَ
فَلَمْ تَجِدُوا مَاءً فَتَيَمَّمُوا صَعِيدًا طَيِّبًا فَامْسَحُوا بِوُجُوهِكُمْ
وَأَيْدِيكُم مِّنْهُ ۚ مَا يُرِيدُ اللَّهُ لِيَجْعَلَ عَلَيْكُم مِّنْ حَرَجٍ وَلَٰكِن
يُرِيدُ لِيُطَهِّرَكُمْ وَلِيُتِمَّ نِعْمَتَهُ عَلَيْكُمْ لَعَلَّكُمْ تَشْكُرُونَ ﴾[153]

---

[152] КЛ, 67Б-68А

[153] (5:6) "О вернікі! Калі стаеце на малітву, умыйце вашы твары, памыйце рукі да лакцей, абатрыце галовы і вымыйце ногі да костачкі. Калі вы ў стане нечыстасці, то выкупайцеся цалкам. Калі ж вы хворыя ці ў дарозе, ці калі хтось з вас вярнуўся з прыбіральні (справіўшы патрэбу), ці меў блізкасць з

«Калі будзеце нячыстыя, ачысціце ўсё цела сваё. Калі будзеце хворыя або ў дарозе, альбо прыйдзе хто з вас з надвора, альбо даткнецеся да жанчыны (уступіўшы ў блізкасць), а не будзе вады – таямум бярыце. У пясок чысты [апусціце рукі], пагладзьце пяском твары і рукі. Не хацеў Пан Бог учыніць вам труднасці, але хацеў вас ачысціць. Аддаў спаўна ласку Сваю над вамі, каб хвалу Богу аддавалі ў чыстасці».[154]

## 6. Абавязковыя элементы малога ўмывання

Абдэсь у чатырох рэчах – фарз (абавязковы). Як Пан Бог у Кур'ане загадаў:

﴿ يَا أَيُّهَا الَّذِينَ آمَنُوا إِذَا قُمْتُمْ إِلَى الصَّلَاةِ فَاغْسِلُوا وُجُوهَكُمْ وَأَيْدِيَكُمْ إِلَى الْمَرَافِقِ وَامْسَحُوا بِرُءُوسِكُمْ وَأَرْجُلَكُمْ إِلَى الْكَعْبَيْنِ ﴾[155]

*«Іман пяючыя, Мне, Богу, верныя мусульмане! Калі будзеце ставаць да намазу, мыйце твары вашы і рукі вашы да лакцей, пагладзьце вадою галовы, мыйце вашы ногі, мыйце да костак».*[156]

***

﴿ وَثِيَابَكَ فَطَهِّرْ ﴾[157]

---

жонкай і не знайшоў вады, то пайдзіце да чыстае зямлі і пратрыце ёю вашы твары і рукі. Не жадае Аллаг ускладніць вам, а зычыць вам ачышчэння і давядзення да дасканаласці вам Сваёй ласкі, каб вы былі ўдзячнымі".

[154] КЛ, 69Б.

[155] (5:6) *"О вернікі! Калі вы маецеся выканаць намаз, то памыйце вашы абліччы і рукі да локцяў, правядзіце [мокрай рукой] па галаве і памыйце ногі да шчыкалатак"*

[156] КЛ, 72А-72Б.

[157] (74:4) "Адзенне сваё ачысці"

Павінны мусульмане адзежу чыстую мець да намазу, каб паганых рэчаў асцерагаліся.[158]

## 7. Калі гусль рабіць абавязкова

Гусюль фарз ведай пасля чаго: пасля *хэйізу*[159], пасля *ніфасу*[160], пасля *джунуб*[161]. Бо *джунуб* – гэта калі малжэнскі ўчынак учыніш. *Хэйіз* у жанок кожнага месяца, а *ніфас* – пасля нараджэння дзіцяці. <…> Калі чалавек будзе п'яны, што памяці не меў, то гусюль браць *ва́джыб*.[162]

## 8. Намаз

### Важнасць намазу

Хто Кур'ан пяе, а намазу не кланяецца, той не будзе [паўнавартасным] мусульманінам, [паўнавартаснага] іману ў яго не будзе, і такі – бліжэй да нявер'я[163]. Намаз – гэта ўхвальны учынак веры.

Хто Кур'ан пяе і намаз кланяецца, тому чалавеку Бог іман прыспорыць[164].[165]

***

[158] КЛ, 74А.
[159] Араб.-тур. аплавы, месячныя.
[160] Пасляродавы крывацёк.
[161] Палавое апаганьванне, стан нечысціні пасля інтымнай блізкасці.
[162] КЛ, 69Б.
[163] Паводле некаторых прававых школ (напрыклад, ханбаліцкай), сістэматычнае невыкананне пяціразовых намазаў лічыцца праявай нявер'я і той, хто не выконвае намаз, лічыцца нявернікам. Астатнія школы (мазгабы) так не лічаць, аднак адзінагалосна згодны, што **той, хто мяркуе, што намаз не абавязковы, робіцца нявернікам**. Мяркуем, што аўтар кітабу прыводзіць дадзены выраз у выхаваўчых мэтах. Ён мае на ўвазе, што чытальнікі Кур'ану, якія прынцыпова не выконваюць намаз, парушаюць прамы загад Аллага, і, такім чынам, не з'яўляюцца паўнавартаснымі мусульманамі, рызыкуючы страціць самае каштоўнае – веру.
[164] Памножыць, павялічыць перакананасць у веры.
[165] КЛ, 1А.

Ведайце, мусульмане: у кожным намазе кланяючыся, з Панам Богам размову чыніш і для сябе просьбу чыніш.[166]

### Абавязковасць штодзённага намазу

Пан Бог нам пяць вахтаў[167] прыказаў намазу фарзам. Пан Бог мовіў:

﴿ حَافِظُوا عَلَى الصَّلَوَاتِ وَالصَّلَاةِ الْوُسْطَى

وَقُومُوا لِلَّهِ قَانِتِينَ ﴾[168]

Сцеражыце час, вахт намаза і намаз кажны паводле вахту кланяйцеся. Вахт не апушчайце (=не ўпускайце час), пільнуйце. <…>

Пан Бог Стварыцель усе тыя намазы Мухаммад-прароку, яго мілосці, і нам, умметам яго, фарзам прыказаў (зрабіў абавязковым), каб мы ад злых выпадкаў і прыгод свецкіх пазбыўшыся, ласкі Божай годнымі сталі. Дай, Пане Божа, спосаб нам усім, каб мы ніводнага вахту не пакінулі![169]

## 9. Вартасць суры «Фаціха»

Мусульманін, які купляе зброю і рыштунак, і з тым пачынае пасвіць авечак, а воўк пры такой ахове авечку скрадзе, [то] не назавуць яго рыцарам. Так, чалавеча, Пан Бог табе [даў] *Альхамду-сюрэй*[170], зброяй-рыштункам, [у якой] адна літара – дзіда, а другая літара – шабля, а яшчэ літара – тарч (=шчыт), а яшчэ літара – страла.

---

[166] КЛ, 1А.

[167] Тэрмін "вахт" – цікавае спалучэнне заходняга і ўсходняга ўплыву. У польскай мове слова "wachta" ("варта, караул")" прыйшла з нямецкай мовы, дзе ёсць дзеяслоў wachen – "вартаваць, ахоўваць". У арабскай жа мове "вакт" (وَقْتٌ), як вядома азначае "час, перыяд, адрэзак часу".

[168] (2:238) "Аберагайце малітвы [выконваючы іх належным чынам], асабліва сярэднюю з іх (намаз аср), і стойце перад Аллагам ціхмяна"

[169] КЛ, 80Б.

[170] Суру "аль-Фаціха"

І [калі] з такой абаронай іман свой шайтану аддасі – не будзеш рыцарам.[171]

***

Мовіў Пан Бог Высокі: «Як Я ест праўдзівым Панам Богам вашым, хто бы меў *«Бісмі-Лляг»* вымавіўшы, шчырым і пакорным сэрцам *«Альхамду-сюрэй»* перапеў, анёлы, будзьце вы на то сведкамі, што Я такому кожнаму грахі іх адпусціў. Пякельны мост як маланка, так шпарка перайдзе, да Раю ласкі Маёй вячыстай Божай увойдзе [такі чалавек], а на гэтым свеце – Пан Бог [яму] пажытку халяльнага[172] дасць».[173]

***

Бо Фаціха-сюрэй усялякім рэчам ест лякарствам, ад размаітых прыгод ест моцна абарона: ад магільнай мукі і Суднаго дня страху Пан Бог абароніць і ласкі Божай годзен будзеш. Бо Фаціха-сюрэй сем аятаў: хто Фаціху пяе – ад сямі пякельных мук волен будзе. Бо у Фаціха-сюрэю многа хвалы і просьбы ад Пана Бога.[174]

## 10. Пашана да імама і муэззіна

Ведайце, мусульмане, некаторых азанчэяў дзякуючы азану ў Рай упусцяць. Як Прарок, яго мілосць, паведамляе: «Мне Рай указалі, у Раі відзеў мінбар. Пытаў ў Джабраіля, мовіў: «І, Джэбраілю, гэтае мейсца для каго ест?» Джабраіль мовіў: «Із твайго уммету каторыя азан пявалі, для ўдзячнасці Божай імамства чынілі».[175]

### Вартасць азану

Хто бы ні меў чыніць павагу азану і слухаць, як азан пяюць, таму вялікае спасенне абяцана. Мусульмане, азану і ікамату чыніце павагу, сюннет – спасенне вялікае ест. <…>

---

171 КЛ, 1Б-3Б

172 Халяль – дазволенае, прыдбанае дазволеным шляхам.

173 КЛ, 3А

174 КЛ, 85А

175 КЛ, 90Б

Ведайце, мусульмане, азану як чыніць павагу. <…> «Калі муэззін азан пяе, трэба ісці да джамаату, за імамам намаз кланяцца». Ад Прарока, яго мілосці, паведамляецца: «Хтобы азану чыніў павагу, Пан Бог таму чалавеку Рай халялем учыніць, вялікае спасенне набудзе»

Так, мусульмане, калі муэззін азан пяе, то хто мусульманін, сегасветныя словы не гаварыце. Калі будзеш, ідзі адну гадзіну або часіну, стаўшы слухай, азану павагу чыні, а потым чыні, што табе трэба. Хто бы навукаю быў заняты, чытаннем або Кур’ан пеў, а ў тым часе голаса азанны учуў, тады трэба стаяць, азану павагу чыніць. Потым што трэба чыні.

Азан пеючы, салям не давайце і не прымайце.

فَصْلٌ فِي قَضَاءِ الإِجَابَةِ الأَذَان وَالإِسْتِمَاعِهَا[176]

Хто бы меў чыніць павагу азану і слухаць, як азан пяюць, таму вялікае спасенне абяцана. Мусульмане, азану і ікамату чынеце павагу, за сюннет – спасенне вялікае.[177]

## 11. Вартасць джамаат-намазу

مَنْ سَمِعَ الأَذَان وَلَمْ يَحْضُرُونَ الجَمَاعَةِ حَرَام لَهُ الجَنَّةِ[178]

Хто бы учуўшы азан, не гатаваўся да джамаату – харам яму Рай.

Кожны мусульманін, учуўшы азан або ведаючы [пра надыход часу намазу], да джамаату ідзіце, ласкі Божай заслугуйцеся.[179]

[176] Раздзел пра адказ на азан і слуханне яго

[177] КЛ, 92А-92Б

[178] Хто пачуў азан, а на супольным намазе не прысутнічаў, забаронены яму [уваход у] Рай.

[179] КЛ, 46А

## 12. Дуа пасля намазу не бывае без адказу

Пан Бог мовіў:

﴿ فَإِذَا فَرَغْتَ فَانصَبْ ۞ وَإِلَى رَبِّكَ فَارْغَبْ ﴾[180]

«Скора па намазе прасіце ў Мяне, Бога, жадана, а Я, Бог, вашу просьбу прыму і вам дам. Хто перада Мной што добрае або злое ўчыніць, Пан Бог усё чуе і відзіць, і ведае».[181]

## 13. Абавязковасць намазу і закяту

Як Пан Бог у Кур'ане паведаміў:

﴿ وَأَقِيمُوا الصَّلَاةَ وَآتُوا الزَّكَاةَ ﴾[182]

«Па пяць раз на дзень кланяйцеся намаз і выдавайце на кожны год закят і дзесяціну»[183].

## 14. Што шайтан любіць, а чаго – баіцца

***Ведайце, што чатыры рэчы ўгодныя шайтану:***

першы – хмельны напітак упіўшыся, ляжаць,

другое – хто вучоных не любіць і навукі (настаўленняў) не слухае,

трэці – пышны (пыхлівы), га́рды (пагардлівы), убогіх не любіць,

чварты (чацвёрты) – хто Кур'ан пяе, а намазу не кланяецца.

Гэтыя чатыры чалавекі шайтану [стануць] таварышамі.

***Толькі чатырох рэчаў шайтан баіцца і ўцякае:***

першае – ад гуку азана,

другое – ад пабожных зікраў (=памінання Бога) голасу,

---

180 (94:7-8) "Таму, як толькі вызвалішся [ад сегасветных заняткаў], заставайся чынным у пакланнені, і да Аллага імкніся"

181 КЛ, 76Б

182 (2:43), (24:56) і інш. "Выконвайце намаз і выплочвайце закят"

183 КЛ, 75Б-76Б.

трэцяе – ад гэтых слоў:

أَعُوذُ بِاللهِ مِنَ الشَّيْطَانِ الرَّجِيمِ

*«э'узу бі-Лягі мін аш-шайтані-р-раджім»*
(«Шукаю прыстанку у Аллага ад выклятага д'ябла»),
чвартае – ад чытання *Альхамду-сюрэю* (суры «Фаціха»)[184].

## 15. Дыялог Прарока ﷺ з шайтанам

Прарок ﷺ пытаў: «Шайтане, тваe «святыя вялікія, наўчоныя» людзі хто?»

Шайтан сказаў: «Каторыя хмельны напітак шынкуюць (прадаюць) і тыя, што разбіраюць, – тыя мае «наўчоныя», «вялікія святыя», «шэйхі». Хто ўпіўшыся, крычаць – то мае «азанчэі».

Прарок ﷺ пытаў: «Шайтане, каторых ты людскіх учынкаў не любіш, не хочаш, каб людзі чынілі?»

Шайтан адказаў: «Таго я ўчынку вельмі не люблю, калі чалавек ***заўсёды кушлук-намаз[185] кланяецца, паводле навукі багамольства чыніць***, бо я тых ніколі не магу звесці, тыя людзі ад мяне волныя будуць. Я дзяцей сваіх пасылаю, кажу пільнаваць, дзе купцы тавары прадаюць, каторыя фальшыва важаць. Локця не дамерыць, пашню мерачы, не дамерыць, – мае дзеці то сабе возьмуць. А таму, хто фальшыва мерыць-важыць – у карысць не пойдзе, спору *(=баракяту)* яму не будзе з тае прадажы, толькі грэх будзе».[186]

---

[184] КЛ, 1А
[185] Маецца на ўвазе духа́-намаз, які можна выконваць ад узыходу сонца да надыходу зеніта (за 30 хвілін да зугр-намазу).
[186] КЛ, 60А-60Б

## 16. Сакрэт аховы ад шайтана

…Прарок ﷺ пытаў: «Шайтане, маім таварышам, умметам маім дай навуку і параду, каб да іх не меў прыступу зводзіць іх?» <…>

Сказаў шайтан: «Прароча Мухаммад і таварышы прароцкія, ад мяне вам навука такая: скора пазнаеце час намазу, да якога вы шпарка пойдзеце і будзеце намаз кланяцца, а калі зараз не пойдзеце – апусціце на заплату (=зробіце пазней, не своечасова). Потым я свой тарч (=шчыт) прылажу паміж намазу [і чалавекам], чалавек ужо да смерці сваёй не заплаціць (=не здолее выкупіць прапушчаную малітву), бо ***[своечасовы] намаз – учынак найлепшы***. Да Пана Бога калі будзеце вахтам (=своечасова) намаз кланяцца, то я да вас не прыстану, вас звесці не магу».[187]

## 17. Дапамога праз пост і намаз

﴿ يَا أَيُّهَا الَّذِينَ آمَنُوا اسْتَعِينُوا بِالصَّبْرِ وَالصَّلَاةِ

إِنَّ اللَّهَ مَعَ الصَّابِرِينَ ﴾

(2:153): «І, тыя, каторыя ўверылі, прасіце помач ў Пана Бога праз пост, цярплівыя, і праз намаз – пэўна, Пан Бог заўжды з цярплівымі».[188]

## 18. Пост месяцу Рамадан – абавязковы

﴿ شَهْرُ رَمَضَانَ الَّذِي أُنزِلَ فِيهِ الْقُرْآنُ هُدًى لِّلنَّاسِ وَبَيِّنَاتٍ

مِّنَ الْهُدَىٰ وَالْفُرْقَانِ ﴾[189]

---

[187] КЛ, 61Б.

[188] КЛ, 7А.

[189] (2:185): “Рамадан – месяц, падчас якога быў пасланы Кур’ан – настаўленне для людзей, ясныя азнакі прамога шляху і адрозненне”.

«Месяц Рамадан, у якім пасланы Кур’ан, дарога праўдзівая для людзей, азнака праўдзівай дарогі і адрозненне халялю ад хараму».[190]

***

Пра пост у Рамадане ведай:

﴿ يَا أَيُّهَا الَّذِينَ آمَنُوا كُتِبَ عَلَيْكُمُ الصِّيَامُ كَمَا كُتِبَ عَلَى الَّذِينَ مِن قَبْلِكُمْ لَعَلَّكُمْ تَتَّقُونَ ﴾[191]

(2:183): «Тыя, каторыя ў Адзінага Бога верыце, напісаў Ён вам фарзам пост Рамазан, як напісаў тым, каторыя перад вамі былі, – каб былі вы баязнікамі Божымі і трымаліся Яго загаду»[192].

***

﴿ فَمَن شَهِدَ مِنكُمُ الشَّهْرَ فَلْيَصُمْهُ ﴾[193]

Хто ўбачыць месяц Рамазана і людзям засведчыць, няхай поснікаюць.

﴿ وَمَن كَانَ مَرِيضًا أَوْ عَلَى سَفَرٍ فَعِدَّةٌ مِّنْ أَيَّامٍ أُخَرَ ﴾[194]

Хто бы быў хворы альбо ў дарозе, няхай есць. І столькі ж дзён іншых павінен адпоснікаць.

﴿ يُرِيدُ اللَّهُ بِكُمُ الْيُسْرَ وَلَا يُرِيدُ بِكُمُ الْعُسْرَ

---

[190] КЛ, 14Б.

[191] (2:183): *“О, вернікі! Прадпісаны вам пост – так сама, як быў ён прадпісаны вашым папярэднікам, каб вы былі богабаязнымі”.*

[192] КЛ, 14Б.

[193] (2:185): *“Той з вас, каго застане гэты месяц, няхай поснікае”.*

[194] (2:185): *“А калі хто захварэе ці будзе ў дарозе, то няхай адпоснікае столькі ж дзён у іншы час”.*

وَلِتُكْمِلُوا الْعِدَّةَ وَلِتُكَبِّرُوا اللَّهَ عَلَى مَا هَدَاكُمْ

وَلَعَلَّكُمْ تَشْكُرُونَ ﴾[195]

Хацеў Пан Бог для вас учыніць палёгку, не хацеў хворых і падарожных затрудніць. Даводзьце да паўнаты лік месяца Рамадана – дней трыццаць. Калі байрамны месяц не пакажацца з пагодай, то апірайцеся на падлікі (=адлічвайце 30 дзён). І хваліце Пана Бога, што ўсправадзіў вас на праўдзівую дарогу...[196]

### Час поснікання

Пан Бог кажа:

﴿ وَابْتَغُوا مَا كَتَبَ اللَّهُ لَكُمْ وَكُلُوا وَاشْرَبُوا حَتَّى يَتَبَيَّنَ لَكُمُ

الْخَيْطُ الْأَبْيَضُ مِنَ الْخَيْطِ الْأَسْوَدِ مِنَ الْفَجْرِ

ثُمَّ أَتِمُّوا الصِّيَامَ إِلَى اللَّيْلِ ﴾

«Прасіце Пана Бога, каб Ён вам напісаў добрае патомства і тое вам дазволіў у Рамазан уночы. Ешча-піце, аж пакуль будзе адрозніваццa нітка чорная [ноч] ад белай [досвітку] – да світання, потым трымайце пост аж да вечара, да ахшаму, [а пасля заходу сонца] ад харамнага ядзення-піцця высцерагайцеся»[197].

---

[195] (2:185): *"Аллаг зычыць вам палёгкі, а не цяжкасці; даводзьце да канца дні посту і ўзвялічвайце Аллага за тое, што Ён наставіў вас на прамы шлях, каб, вы былі ўдзячныя"*.

[196] КЛ, 14Б-15А

[197] КЛ, 15Б-16А

## Каштоўнасць Рамадана

Прарок, яго міласць, мовіў: «Калі б мае умметы ведалі ласкі Божай за шанаванне Рамазан-месяц, прасілі б Пана Бога, каб быў заўжды месяц Рамазан».[198]

***

Так мусульманін кожны ведай, як настане месяц Рамазан, тады Пана Бога неперастанна усхваляй. *«Куль гува-Ллагу»* многа пейце, Кадыр-ноч не спіце, Пана Бога вызнавайце.

Як Пан Бог не раз паведаміў (11:114):

إِنَّ الْحَسَنَاتِ يُذْهِبْنَ السَّيِّئَاتِ[199]

«Пэўна, добрасць звядзе грахі».[200]

***

Хто бы меў паводле Божага прыказання захаваўшы Рамазан-месяц у прыстойным шанаванні, у чыстасці намазам быў пільны, а после Рамазана памрэ, то [памрэ як] шагід. А шагід без пакуты, без пытання да ласкі Божай пойдзе.[201]

---

[198] КЛ, 23Б

[199] (11:114) *“Папраўдзе, добрыя ўчынкі выдаляюць дрэнныя”.*

[200] КЛ, 23Б

[201] КЛ, 24А

### Важнасць выплочвання фітрэ

**Ведайце, як фітрэ аддаваць.** Як пятнаццаць дней Рамазана-месяца перайдзе аж да байрам-намазу, фітрэ давайце. А па байрам-намазе фітрэ недаходна, хіба толькі на садаку даць[202].[203]

***

Як у Кур'ане піша:

﴿ قَدْ أَفْلَحَ مَن تَزَكَّىٰ ﴾[204]

«Пэўне, вызвалены тыя людзі, каторыя ачышчаць будуць цела сваё ад грахоў і маёмасць сваю фітрэем, закятам, дзесяцінаю».[205]

***

Прарок, яго міласць, прыказвае: «Закят і фітрэ ачысціць ваш пост ад перагавору. Калі ў посце вашым у чым-кольвек недахоп

---

[202] Параўн. хадзіс ад Абу Давуда, 1609; Ібн Маджы (1827) і аль-Хакіма (1/409): "Ібн Аббас распавёў: "Пасланец Божы ﷺ абавязаў выплочваць закят-аль-фітр таго, хто поснікаў (цягам месяца Рамадан), каб ачысціцца ад усякага непрыстойнага ўчынку ці пустой размовы і з мэтай забяспечыць ежай галодных. Ён прымаецца як закят для чалавека, які плаціць яго перад святочнай малітвай, і гэта садака (г.зн. добраахвотная міласціна) для чалавека, які плаціць яго пасля гэтай малітвы".

وَعَنِ اِبْنِ عَبَّاسٍ رَضِيَ اَللَّهُ عَنْهُمَا قَالَ: { فَرَضَ رَسُولُ اَللَّهِ ﷺ زَكَاةَ اَلْفِطْرِ; طُهْرَةً لِلصَّائِمِ مِنَ اَللَّغْوِ, وَالرَّفَثِ, وَطُعْمَةً لِلْمَسَاكِينِ, فَمَنْ أَدَّاهَا قَبْلَ اَلصَّلَاةِ فَهِيَ زَكَاةٌ مَقْبُولَةٌ, وَمَنْ أَدَّاهَا بَعْدَ اَلصَّلَاةِ فَهِيَ صَدَقَةٌ مِنَ اَلصَّدَقَاتِ. }

رَوَاهُ أَبُو دَاوُدَ, وَابْنُ مَاجَهْ, وَصَحَّحَهُ اَلْحَاكِمِ

[203] КЛ, 21Б

[204] (91:9) *"Здабыў плён (поспех) той, хто ачысціў яе (г. зн. душу)"*.

[205] КЛ, 18А

знойдзецца са слоў і ўчынкаў вашых, садаку і фітрэ хто аддае, выкуплены будуць тыя недастаткі» [206].[207]

## 19. Што рабіць у дзень байраму?

Мухаммад-прарок Мустафа ﷺ мовіў: «Старанне чыніце байрамнага дня фітрэ аддаваць, садаку даваць, намаз кланяцца, тасбіх-зікер[208] пейце, такбір[209] чыніце. Той дзень – з ліку байрамных дзён, калі Пан Бог маім умметам усе грахі адпусціць, іх тасбіхі-зікіры прыме да ласкі Сваёй, ласкавы пагляд на яго будзе мецьʼ». [210]

## 20. Святыя ночы

Аб начах святых ведай:

Першая ноч Раджаба першага чацвярга напярэдадні першай пятніцы – Рага'іб. А Ша'бан-месяца пятнаццатая ноч – Бара'ат. Рамазана-месяца дваццаць сёмая ноч – Кадыр. Напярэдадні байрама – [першая] 'Арафа, напярэдадні Курбан-байрама – [другая] 'Арафа. Мухарэм-месяца адзінаццатая ноч – 'Ашура. [211]

---

[206] Параўн.: "Ібн Аббас сказаў: "Пасланец Божы ﷺ вызначыў закятуль-фітр, як ачышчэнне посту чалавека ад марных размоў і непрыстойнасцей і для кармлення бедных. Той, хто заплаціць фітрэ перад святочнай малітвай, гэта прыняты закятуль-фітр, а той, хто плаціць пасля малітвы, гэта – звычайная міласціна".

عَنِ ابْنِ عَبَّاسٍ، قَالَ فَرَضَ رَسُولُ اللَّهِ صلى الله عليه وسلم زَكَاةَ الْفِطْرِ طُهْرَةً لِلصَّائِمِ مِنَ اللَّغْوِ وَالرَّفَثِ وَطُعْمَةً لِلْمَسَاكِينِ فَمَنْ أَدَّاهَا قَبْلَ الصَّلاَةِ فَهِيَ زَكَاةٌ مَقْبُولَةٌ وَمَنْ أَدَّاهَا بَعْدَ الصَّلاَةِ فَهِيَ صَدَقَةٌ مِنَ الصَّدَقَاتِ

[207] КЛ, 20Б.

[208] Тасбіх – чытанне асаблівых словаў *"Субхáна-Ллаг"*, зікр – любое ўзгадванне Аллага з пашанай. Прыкладамі такіх зікраў могуць быць словы: *"Субхáна-Ллáгі ўа біхáмдзігі"*, *"Альхáмду лі-Лля́гі"*, *"Аллáгу áкбар"* ці *"Ля хáўля ўаля́ кýўўата іллí бі-Лля́г"*, *"Ля іля́га íлля-Ллáг"*.

[209] асаблівы святочны зікр, які чытаецца шматкроць: *"Аллáгу áкбару-Ллáгу áкбар, ля іляга ілля-Ллагу ўа-Ллагу акбар. Аллагу акбар ўа лі-Лляґі-ль-хамд"*.

اَللهُ أَكْبَرُ اللهُ أَكْبَرْ، لاَ إِلَهَ إِلاَّ اللهُ وَاللهُ أَكْبَرْ، اَللهُ أَكْبَرْ وَلِلَّهِ الْحَمْدُ

[210] КЛ, 20Б–21А

[211] КЛ, 22А. У гэтыя ночы пажадана, чытаць тагадджуд, Кур'ан, адрабляць прапушчаныя намазы, чытаць ду'а і зікры. Але адмысловага набажэнства не на

Як [надыдзе час] начэй святых: Рага’іб, Бара’ат, Кадыр, Арафа другое напярэдадні Курбан-байраму, Арафа, Мухарэм, адзінаццаая ноч – Ашура – [то] не спі, Бога малі[212].[213]

## 21. Ухвальныя ўчынкі

Праз увесь месяц так мусульманін айца-матку і крэўных сваіх часта ўспамінай, Кур’ан-хатым[214] за іх душы паручыся і пей, магілы іх наведвай.

زِيَارَةُ الْقُبُورِ كَفَّارَةُ الذُّنُوبِ[215]

За наведванне магіл адпушчоныя грахі ім і табе будуць.

Калі б пры мусульманскіх магілах, Бога просячы, гадзіну сядзеў, лепей, чым Кур’ан-хатым пеў.[216]

***

Абдуллаг святы, сын Мас’удаў ад Прарока, яго міласць: «Кажа Пан Бог паважнасць чыніць тым дням: ‘Арафа, і пятніцы, і байраму».[217]

гэтыя ночы ў шарыяце не прадугледжана. Практыка некаторых мясцін чытаць у такія ночы тасбіх-намаз паасобку альбо па прыкладзе імама (не калектыўна!) – дпаушчальная.

[212] Асноўная ноч і безумоўна святая, вядома, толькі адна – Кадыр-ноч. Але не забараняецца праводзіць і іншыя ночы ў малітве і пакланенні, пры наяўнасці жадання і настрою.

[213] КЛ, 21Б

[214] Хатым – прачытанне ўсяго тэксту Кур’ану.

[215] араб. “Наведванне магіл – ачышчэнне ад грахоў”.

[216] КЛ, 22А–22Б

[217] КЛ, 25Б

## 22. Як чыніць курбан

Як курбан чыніць, ведайце:

[218] قَالَ النَّبِيُّ عَلَيْهِ السَّلاَمُ ضَحُّوا فَإِنَّهَا سُنَّةُ أَبِيكُمْ (إِبْرَاهِيمَ)

Прарок, яго міласць, мовіў: «Чыніце дабро сабе, чыніце дабро душам сваім і крэўным сваім, курбаны і аброкі[219], *фі сабíлі-Ляя́гі,* на Божую дарогу».

<…> Прарок, яго міласць, мовіў: «Чыніце курбаны, як найлепшыя, і найдарожшыя, і сыцейшыя»; як у Кур’ане піша (3:92):

لَن تَنَالُوا الْبِرَّ حَتَّىٰ تُنفِقُوا مِمَّا تُحِبُّونَ

«Не прынята будзе подлая (=нягодная) ахвяра і спасення (Боскай узнагароды) няма. Тое ахвяруйце, што вам самім міла і люба».

وَمَا تُنفِقُوا مِن شَيْءٍ فَإِنَّ اللَّهَ بِهِ عَلِيمٌ

«Не ахвяруйце подлых рэчаў, пэўна, Пан Бог –Усёведны».

Пан Бог мовіў: «Халопы мае, Божай ласкі Мае не будзеце мець, Мне, Богу, не чыніўшы ўдзячнасці, аброкі-садакі не даўшы, убогіх

---

[218] араб. “Мовіў Прарок, мір над ім: “Прыносьце ахвяры, папраўдзе, гэта звычай (сунна) айца вашага” (маецца на ўвазе прарок Ібрагім).
Гл. хадзіс ад Ібн Маджы:

قَالَ أَصْحَابُ رَسُولِ اللَّهِ ـ صلى الله عليه وسلم ـ يَا رَسُولَ اللَّهِ مَا هَذِهِ الأَضَاحِيُّ قَالَ " سُنَّةُ أَبِيكُمْ إِبْرَاهِيمَ " . قَالُوا فَمَا لَنَا فِيهَا يَا رَسُولَ اللَّهِ قَالَ " بِكُلِّ شَعَرَةٍ حَسَنَةٌ " . قَالُوا فَالصُّوفُ يَا رَسُولَ اللَّهِ قَالَ " بِكُلِّ شَعَرَةٍ مِنَ الصُّوفِ حَسَنَةٌ " .

«Паплечнікі Пасланца Божага ﷺ спыталі: “О Пасланец Аллага, чым з’яўляюцца гэтыя ахвяры?” Ён аказаў: “Гэта сунна вашага айца Ібрагіма”. Яны сказалі: “Што там нам будзе за іх, о Пасланец Божы?” Ён мовіў: “Нават за кожны волас – адна асобная ўзнагарода”. Яны сказалі: “І за поўсць, о Пасланец Аллага?” Ён сказаў: “І за кожны волас поўсці гэтаксама адна ўзнагарода” (Сунан Ібн Маджа, № 3247).

[219] Відавочна, абяцаныя Богу ахвярапрынашэнні – *назр-курбан* – калі нейкая задуманая справа (паездка, купля або продаж) скончыцца паспяхова

у даму сваім не карміўшы, не абдарыўшы, курбан не рэзаўшы – то ласкі Маёй не будзе».

Прарок ﷺ мовіў: «Рэжце тлустыя курбаны, пэўна, тыя курбаны праз Сырат-мост перанясуць вас».

Таго часу пасля намазу байрамнага аж да астатняга дня дасканалых авечак і [і таго, якое дасягнула ўзросту] двух гадоў быдла і козы.

Кожнае быдла заплаці за душу адну, а вярблюд – заплаці за сем душ, так [і] вол, бык, карова – за сем душ ідзе. Калі барану альбо авечцы не будзе шэсць месяцаў, то на курбан не гожа (=не падыходзіць); а бык або ялавіца (карова) калі двух год не мае, то на курбан не гожа.

Курбан чынячы, трэба глядзець, каб не храмое і не сляпое было, ні на якому шлунку не абранена (=ні на якой частцы цела не было раны), акром таго, што ўмысле рэжуць альбо зна́чаць (=ставяць пазнаку, кляймо, клеймяць), тое не ва́дзіць (=не перашкаджае ахвярапрынашэнню). А калі знявечана або мае якую ва́ду (=загану), то на курбан не гожа, не прынята і гнеў Божы выкліча.

Рэжучы, адвярні да палудня носам і ўспомні імя Божае, што рэжаш [ахвярную жывёлу дзеля Бога]. Дуаі пей, тры нагі звяжы, а правую заднюю – не вяжы. <…>А рэжучы моў *«Бісмі-Лляг, Аллагу акбар».*

Зарэзаўшы, падзяліць мяса на трое. Трэцюю частку, мяса і скуру – імаму аддаць, [яшчэ адну traціну] – аддайце садакою ўбогім, і трэцюю часць – ешце самі, і дзеці, і чэлядзь няхай ядуць.[220]

І пільнуцеся прыказання Божага, жывіце ў баязні, то вам лепей будзе.

---

[220] Гэта пажаданы варыянт дзялення курбана. Дазволена, аднак, цалкам пакінуць мяса курбана сабе і таксама дазволена раздаць усё мяса маламаёмным.

﴿ لَن يَنَالَ اللَّهَ لُحُومُهَا وَلَا دِمَاؤُهَا وَلَٰكِن يَنَالُهُ التَّقْوَىٰ مِنكُمْ كَذَٰلِكَ سَخَّرَهَا لَكُمْ ﴾

(22:37) «Не патрабуе Пан Бог мяса, а ні крыві, толькі патрабуе баязні вашай, калі пільнуеце прыказання Яго і з таго, што вам даў у моц вашу быдла»

﴿ لِتُكَبِّرُوا اللَّهَ عَلَىٰ مَا هَدَاكُمْ ﴾

«абы прасілі Бога за тое, што вас правёў на дарогу праўдзівую»

﴿ وَبَشِّرِ الْمُحْسِنِينَ ﴾

«семянчуй (=узрадуй) , Прароча, мусульман Раем».[221]

## Вартасць курбану на Судны дзень

Прарок, яго міласць, мовіў: «Хто курбан магчымасць меў чыніць, а не чыніў – то не мой уммéт. На Судны дзень усім прарокам коні будуць, а маім умметам, толькі тым, хто рабіў курбан, коні з Раю прывядуць. Тыя людзі, курбан чынячыя, на Судны дзень на тыя коні ўссеўшы, Сырат – пякельны мост – як маланка блісне, так хутка пяройдуць». [222]

[221] КЛ, 25Б–27А.
[222] КЛ, 25Б

## 23. Дзень Ашура

Алей святы мовіў ад Прарока, яго міласці: «Мухаррэма-месяца першых дней дзесяць – ‘Ашура, паважныя дні. Павагу і шанаванне тым паважаным дням чыніце. <…>

Так Пан Бог тыя дні над іншымі шануе, [бо] у тых днях усялякае набажэнства вельмі паважае і ўдзячна прымае. Хто б у тыя дні гусль узяўшы, Бога маліў, акрамя жанчыны (падчас аплаваў), тыя дні шануючы і паважаючы, Пан Бог такіх людзей ад грахоў абараніўшы, [яшчэ і] цягам году ад хвароб і бед абароніць.

Бо Пан Бог у тых днях сем нябёсаў і сем зямляў, ‘Арш[223], Курсь[224], Ляўх[225], Калем[226] стварыў, горы, скалы, мора, усялякую светласць у тых днях стварыў, Адама-прарока і Хаву;

Ібрагім-прарок ﷺ у тыя дні нарадзіўся і ад агню Немрудавага ў тых днях абараніўся;

Ісмаіл-прарок у тыя дні нарадзіўся, многа іншых [людзей] прарокамі ласкаю Сваёю зрабіў;

Мусу-прарока ў тыя дні ад Фараона абараніў;

Юнуса-прарока з рыбнага нутра Пан Бог у тыя дні вынес. <…>

Калі ўчынак добры ў тыя дні зрабіў без хібы (=без недахопу або памылкі), Пан Бог удзячна прыме. Хто б у тыя дні хворага наведаў, Пан Бог яму ўсе грахі адпусціць. У тыя дні Пан Бог на уммет Мухаммада-прарока ﷺ, на мусульман, ласкай Сваёй глядзіць.

Так тыя дні ‘Ашура шанаванымі завуць, таму што Пан Бог ласкаю Сваёю [асабліва ў гэтыя дні] на мусульман глядзіць.[227]

---

[223] ‘Арш – трон Божы, знаходзіцца вышэй за Рай; самае вялікае стварэнне Аллага.
[224] Курсі – стварэнне Аллага, якое ахоплівае нябёсы і зямлю, і знаходзіцца ніжэй за Арш.
[225] Ляўх аль-Махфуз – захаваная скрыжаль, дошка, на якой запісана ўсё, што будзе адбывацца да Суднага дня.
[226] Калям – самае першае стварэнне Аллага, прылада, якой было загадана напісаць усё на Ляўх аль-Махфузе.
[227] КЛ, 27А–28А. Такім чынам, у рукапісе няма ні слова пра тое, што Ашура – гэта байрам, свята. Толькі падкрэсліваецца яго адмысловы статус і пашана.

## 24. Аб шанаванні пятніцы

У сюрэю «Джуму'а» Пан Бог мовіў (62:9):

﴿ يَا أَيُّهَا الَّذِينَ آمَنُوا إِذَا نُودِيَ لِلصَّلَاةِ مِن يَوْمِ الْجُمُعَةِ فَاسْعَوْا إِلَىٰ ذِكْرِ اللَّهِ وَذَرُوا الْبَيْعَ ذَٰلِكُمْ خَيْرٌ لَّكُمْ إِن كُنتُمْ تَعْلَمُونَ ﴾

«І, вернікі Божыя, мусульмане, калі будуць азан пець дня пятніцы да джума-намазу, ідзіце хутка да аддавання хвалы Богу і да зікру Божага, пакінуўшы таргоўлю. Тое вам лепей будзе, калі б вы ведалі!»[228]

***

Шчаслівыя людзі, якія ў пятніцу гусюль-абдэсь бяруць і да джума-намазу ідуць.[229]

***

Прарок, яго міласць, мовіў:

«Хто зара́з тры пятніцы джума-намаз не кланяўся, у Дзень Судны на твары яго напісана будзе: «Гэты чалавек без ласкі Божай».[230][231]

### Набажэнства пятніцы лепш за забавы і за гандаль

﴿ فَإِذَا قُضِيَتِ الصَّلَاةُ فَانتَشِرُوا فِي الْأَرْضِ وَابْتَغُوا مِن فَضْلِ اللَّهِ وَاذْكُرُوا اللَّهَ كَثِيرًا لَّعَلَّكُمْ تُفْلِحُونَ ﴾

(62:10) «А калі адкланяецеся намаз, разыйдзіцеся па зямлі, жадаючы ласкі Божай і рызку сабе, і зікр пейце многа, Пана Бога ўспамінайце. Надзея ад Пана Бога, што вы будзеце вызвалены ад грахоў, такія людзі».

---

[228] КЛ, 28А.

[229] КЛ, 29Б.

[230] Параўн. хадзіс ан-Насаі, 1370 (1378): "Хто прапусціць тры джума-намаза з-за нядбайнасці, Аллаг запячатае яго сэрца".

مَنْ تَرَكَ ثَلَاثَ جُمَعٍ تَهَاوُنًا بِهَا طَبَعَ اللَّهُ عَلَى قَلْبِهِ

[231] КЛ, 28Б.

﴿ وَإِذَا رَأَوْا تِجَارَةً أَوْ لَهْوًا انفَضُّوا إِلَيْهَا وَتَرَكُوكَ قَائِمًا قُلْ مَا عِندَ اللَّهِ خَيْرٌ مِّنَ اللَّهْوِ وَمِنَ التِّجَارَةِ وَاللَّهُ خَيْرُ الرَّازِقِينَ ﴾

(62:11) «Калі ўбачыце пажытачныя таргі альбо ігры музыкі, а вы з-за таго кідаеце Прарока ﷺ стаяць на мінбары, скажы, Мухаммад да сваіх сахабэеў, што набажэнства вам лепшае ад іграў музыцкіх, ад таргоў вашых, бо Пан Бог Добры рызк вам дае».[232]

***

Прарок, яго міласць, мовіў: «Калі б адзін чалавек із маіх умметаў наўмысля джума-намаз не кланяўся, то такія людзі – не з майго уммету. Такіх людзей у веку іх (жыцці) і ў маёмасці спору (=дабрабыту, баракяту) не будзе; хіба пакаецца, тады да ласкі Божай і да майго заступніцтва годныя будуць. А не пакаецца – то не будзе годны».

Прарок Мухаммад ﷺ, прыяцель Божы, мовіў: «Да джума-намазу або да джамаату гатовы будзьце. Такіх людзей грахі аддалены будуць і спасенне (узнагароду Божую) сабе набудуць, спор ім ад Пана Бог прыбудзе, ад Пекла вольныя будуць, а ў Раі месца ўзвышанае будзе».[233]

## Азан і салях

Калі ўчуеш азан[234], ідзі да намазу, пакінуўшы[235] свае работы і таргоўлі. Калі азан пяюць – [гэта] сюннет гожы і спа́сенне. Пакінуўшы работы-таргоўлі, усялякія забавы сегасветныя пакінуўшы, да джума спяшайцеся, ідзіце.

[232] КЛ, 28Б.
[233] КЛ, 29А.
[234] Заклік да намазу
[235] Пакінуўшы

Калі салях[236] пецьбудуць, таргоўлі-работы пакідаць не трэба, толькі як сюннет. Калі азан будуць пець, тады работы сегасветныя [рабіць] – *харам* (забаронена), пакуль [не] адкланяешся джума-намаз. Пасля [намазу]-джума работы рабіць – *халяль* (дазволена).

Паводле гэтага аяту справуйцеся (=дзейнічайце):

﴿ فَإِذَا قُضِيَتِ الصَّلَاةُ فَانتَشِرُوا فِي الْأَرْضِ

وَابْتَغُوا مِن فَضْلِ اللَّهِ ﴾

(62:10) «Калі скончыце намаз, разыдзіцеся па зямлі, жадаючы ласкі Божай і рызку сабе ад Пана Бога».[237]

***

Прарок ﷺ мовіў: «Мне многа саляват пейце ў пятніцу. Той дзень сведчыць будзе, ангелы будуць гатовы для тых людзей, каторыя мне саляват пяюць».[238]

## Ці можна ў пятніцу працаваць?

Такі ёсць хадзіс адзін: «Любую работу [у пятніцу] рабіць харам». Адказвае імам Шафіі: «Я хадзісу таму тлумачэнне зразумеў так, што ў пятніцу сегасветную работу рабіць *дазволена*, а *вось* дарма сядзець – харам. Да таго ж хрысціянін нядзелю, а іўдзей – суботу – святкуе, работы не робяць, святкуюць-гуляюць. А мусульманам у пятніцу, не рабіўшы, святкаваць – то падобны будуць хрысціянам і іўдзеям».

قَالَ النَّبِيُّ ﷺ : مَنْ فَعَلَ يَوْمَ الْجُمُعَةِ اثْنَى عَشَرَ شَيْءٍ عُقُوبَاتٍ

[236] Саляват, узвялічванне Прарока Мухаммада, мір над ім. Чытаецца голасна ў пятніцу прыблізна за гадзіну да набажэнства, дзеля напаміну вернікам, каб збіраліся ў мячэць як мага раней.
[237] КЛ, 32А.
[238] КЛ, 33А.

Прарок, яго міласць, мовіў: «Хто бы ў пятніцу меў работу рабіць, **пакінуўшы**[239] **намаз**, за тое яму Пан Бог дванаццаць мук учыніць:

ثَلَاثَة فِي الدُّنْيَا وَثَلَاثَة فِي سَكَرَ عَنِ المَوْتِ وَثَلَاثَة فِي قَبْرِهِ

وَثَلَاثَة يَوْمَ القِيَامَة

Тры – на гэтым свеце, тры – у часе смерці, тры – у магіле, тры – на Судны дзень. На гэтым свеце – што намаз пакінуў, будзе праца тая харам і пажытак той харам. Не прыйме Пан Бог каяту, без намазу калі ў пятніцу работу робіш».

<…> А пры смерці, першае – будзе паміраць без *іману*. Другое – учынак будзе пры ім злы, страшны. Трэцяе – будзе душа выходзіць з цела з вялікімі сегасветнымі мукамі.

<…> У магіле першае – прыдуць Мункар і Накір, страшныя пытальнікі. Другое – горшая, цяжэйшая пакута магільная. Трэцяе – цемра магільная.

<…>А што на Судны дзень тры дадатковыя пакуты: першая – з кяфірамі [з мёртвых] паўстане, другое – будзе мець свіны лыч[240], трэцяе – пойдзе да Пекла без помачы».[241]

***

Так мусульманін кожны не толькі работу рабі, але ў пятніцу без намазу не рабі – аж да ікендэю-намазу, і ў дарогу не выязджай, як найбольш Бога прасі, Кур’ан-хатым пей.[242]

### Суннаты пятнічнага дня

Хто бы ў пятніцу як мае быць чыстасць узяўшы (=зрабіўшы гусль), ні з кім не гаворачы, да мячэці прышоўшы, да вушэй рукамі дакрануўшыся, два ракяты намаз пеў, Пан Бог аж да другой пятніцы грахоў кажа не пісаць.

---

[239] прапусціўшы, не выканаўшы своечасова

[240] Паводле перакладу Г. Мішкінене

[241] КЛ, 33Б – 34Б.

[242] КЛ, 34Б. Апошні выраз можна зразумець як рэкамендацыю.

Хто бы ў пятніцу валасы галіў, ногці рэзаў, гусль узяўшы, чыстае адзенне надзеў, у чыстасці з намазам будзе пятніцу шанаваць, Пан Бог такога чалавека аж да другой пятніцы ад бед, хвароб, грахоў абароніць.[243]

## 25. Смерць і пахаванне

### Як да канаючага чалавека прыступіць

Так наўчоны кожны ведай, якім спосабам маеш да канаючага чалавека прыйсці або ўмерлага мыць, калі хворы вельмі.

Няхай [той, хто мае памерці] гусюль возьме, а калі вельмі хворы, няхай *гаргарэ*[244] і *абдэсь* возьме, мусульманін, валасы паголіць, ногці пастрыжэ. Часта да яго прыходзь, кажы яму:

لاَ إِلَهَ إِلاَّ اللَّهُ ، مُحَمَّدٌ رَسُولُ اللهِ

*(Ля іляга ілля-Ллаг, Мухаммад расулю-Ллаг)*

і яшчэ кажы:

أَشْهَدُ أَن لاَ إِلَهَ إِلاَّ اللَّهُ وَحْدَهُ لاَ شَرِيكَ لَهُ
وَأَشْهَدُ أَنَّ مُحَمَّدًا عَبْدُهُ وَرَسُولُه

*(Ашгаду алля іляга ілля-Ллагу, ва́хдагу ля шары́ка ляг,*
*ва ашгаду анна Мухаммадан ʻабдугу ва расулюг)*

Гэта яму пей пры кананню, на правы бок палажыўшы, да палудня тварам павярні, Ясень-сюрэй пей. Жанок і малых дзяцей хай там не будзе, плачу-крыку хай не чыняць. Наўчоныя няхай пры ім будуць, бо дзеля [пашаны] наўчоных, пабожных, дзеля іх просьбаў і ўчынкаў добрых і іншым людзям грахі адпусціць Пан Бог, а з-за ненаўчоных, *джа́гіляў*, то і на іншых людзей гнеў Божы падае.

Па просьбе наўчоных усе грахі сцірае Пан Бог, адпусціць і тым, за каго Пана Бога просяць наўчоныя.

---

[243] КЛ, 32Б – 33А.
[244] Паласканне вады з прапусканнем часткі вады ў горла

Як Пан Бог у Кур’ане яўна паведаміў (36:33):

﴿ وَآيَةٌ لَّهُمُ الْأَرْضُ الْمَيْتَةُ

أَحْيَيْنَاهَا وَأَخْرَجْنَا مِنْهَا حَبًّا فَمِنْهُ يَأْكُلُونَ ﴾

«Пан Бог зямлёю сухою учыніць, з каторай людзі пажытку не спадзяваюцца, Я тады, дажджом ажывіўшы, дам з яе пажытак».

Кажуць наўчоныя, [што Пан Бог мае на ўвазе]: «[Вобраз дажджу] – гэта азнака наўчоных, чые просьбы і малітвы за тых грэшных, што ўжо і не спадзяваліся на ласку, Я пачую, тым грэшным грахі адпушчу і да ласкі Сваей Божай прыму».[245]

### Пакінь завяшчанне родным

Так мусульманін кожны сам сабе пры сваім жыцці дабро чыні. Калі ў аплошнасці (нядобра) век свой праводзіў, то пры кананню смерці сваёй чыні тастамент, каб тваёй душы дабро чынілі. Але лепей, калі сам пры жыцці дабро душы сваёй учыніш.[246]

## 26. Як трэба ў шлюбе жыць

﴿ نِسَاؤُكُمْ حَرْثٌ لَّكُمْ فَأْتُوا حَرْثَكُمْ

أَنَّىٰ شِئْتُمْ وَقَدِّمُوا لِأَنفُسِكُمْ وَاتَّقُوا اللَّهَ وَاعْلَمُوا أَنَّكُم مُّلَاقُوهُ

وَبَشِّرِ الْمُؤْمِنِينَ ﴾[247]

«Жоны вашы – пашня вашая. Ідзіце да пашні сваёй, адкуль хочаце. Абярыце ўперад імя Божае і чыніце даволі пажады сваім і бойцеся Пана Бога. Ведайце, што ў тым траплянне да Пана Бога,

---

[245] КЛ, 47Б – 48А.
[246] КЛ, 52Б.
[247] (2:223) *“Вашы жонкі – нібы ніва для вас. Таму ўваходзьце да іх, калі і як пажадаеце, але хай гэтаму папярэднічаюць добрыя справы ад вас. Бойцеся Аллага і ведайце, што сустрэнеце Яго. Узрадуй вернікаў дабравесцем!”*

таму Прарочa, семянчуй (=узрадуй) мусульман і мусульманак ласкаю Маёю».[248]

***

الطَّاعَةُ النِّسَاءِ الحُبُّ الرِّجَالِ[249]

Багамолле (=пакланенне) жаноцкае – намаз пеўшы, пост поснікаўшы, мужа ва ўсім слухаць і паважаць.[250]

***

Калі б жонка, як зямля і неба, так многа ўчынку добрага чыніла, а мужу неўнаравіла (=не дагадзіла) і не ў згодзе была б, то над той жонкай кляцьба Божая і анёльская, і людзей усіх.

***

Калі жана на мужа любячы глядзіць, нібы [дадатковы] намаз рабіла і тасбіх.

## 27. Што такое харам

**<u>Харам – гэта тое, што Пан Бог забараніў Кур’анам.</u>**

﴿ حُرِّمَتْ عَلَيْكُمُ الْمَيْتَةُ وَالدَّمُ وَلَحْمُ الْخِنزِيرِ

وَمَا أُهِلَّ لِغَيْرِ اللَّهِ بِهِ وَالْمُنْخَنِقَةُ وَالْمَوْقُوذَةُ وَالْمُتَرَدِّيَةُ وَالنَّطِيحَةُ

وَمَا أَكَلَ السَّبُعُ ﴾[251]

Пан Бог мовіў: «Харамам вам усім здыхляціна і кроў, і мяса свіное, і тое, што рэжуць, Бога не ўспамінаючы і на імя балванскае

[248] КЛ, 70Б.

[249] “Паслушэнства жонак – любоў мужоў”.

[250] Тут і да канца раздзела: КЛ, 57Б – 58А.

[251] *“Вам забаронена [ужываць у ежу] здыхляціну, кроў, свініну, а таксама тое, што зарэзана без згадкі імя Аллага, задушаную, забітую палкамі, здохлую пры падзенні [з вышыні], забітую рагамі і [жывёлу], задраную драпежнікам”* (5:3).

(=дзеля ідалаў), і [тое, што] ўтоплена, і задушана сілом, і што кяфіры б’юць, і што скацілася альбо звалілася [з вышыні], альбо быдла быдла заколе, і кроўчанае, і што звер зачаў (=задраў) і жывым не будзе, або заеў – гэта ўсё харам».

﴿ إِلَّا مَا ذَكَّيْتُمْ ﴾

«Толькі тое чыстае, што нажом зарэжуць». Мусульманін альбо жыд, хоць бы кяфірын[252], толькі б успомніў імя Божае на якой-кольвек мове.

﴿ فَمَنِ اضْطُرَّ فِي مَخْمَصَةٍ غَيْرَ مُتَجَانِفٍ لِّإِثْمٍ ﴾

«Хто бы быў вельмі галодны, што мог бы з голаду памерці, жывот тошчы маючы, будзе есць, але не ўволю і ў запас не браць, каб не зграшыў супраць прыказання Божаго, толькі тое ён з няволі, у труднасці (у цяжкі час, вымушана) еў.»

﴿ فَإِنَّ اللَّهَ غَفُورٌ رَّحِيمٌ ﴾

«Пэўна, Пан Бог адпусціць».

كُلُّ مُسْكِرٌ حَرَام [253]

«І кожнае п’янства харам». І людзей забіваць, і наеўшыся есці[254] – усё тое харам.[255]

### Блуд – харам

На чужыя жоны глядзець – атрута ест, шайтанская страла.

---

[252] У дадзеным выпадку маецца на ўвазе чалавек Пісання – хутчэй за ўсё хрысціянін (ім найчасцей прыпісваецца назва “гявурын”, “кяфірын”, магчыма, з-за відавочна шматбожніцкай ідэі “тройцы”).

[253] Араб. “Усё, што адурманьвае – забаронена”.

[254] То бок, пераядаць. Нездарма існуе выслоўе: “Абжорства – грэх”.

[255] КЛ, 68А – 68Б.

Як мовіў ‘Іса-прарок: «Не глядзі на чужыя жоны, каб не пажадаць іх. Калі пажадаеш, то ўжо пералюб учыніў – не ты сам, але сэрца тваё».

Блуднікі маюць уставаць на Суд Божы у сабачым абліччы.[256]

### Харам на чужое цела глядзець

Хто цела чужога глядзіць, або сваё людзям паказвае, хоць мужчына мужчыне або жанчына жанчыне, цела чужое – ад пупа да кален.

«Кляцьба Божая над тымі, хто глядзіць на чужое цела і хто сваё паказвае людзям».

Без *футы* (фартуха) да лазні ісці харам: хоць з айцом, хоць з братам; так і жанчыне ані з маткай, ані з сястрой, ані з лазеншчыкам без футы мыццца нягожа, запяціся (захінуцца) футой трэба.

Толькі муж на жонку, а жонка на мужа вольна глядзець.[257]

## 28. Нельга падманваць у гандлі

Як у Кур’ане піша:

﴿ وَيْلٌ لِّلْمُطَفِّفِينَ ۝

الَّذِينَ إِذَا اكْتَالُوا عَلَى النَّاسِ يَسْتَوْفُونَ ﴾[258]

*«Вэ́йлюн*-Пекла на тыя людзі, каторыя недакладныя меры-вагі дзержаць, калі яны ад людзей адмераюць або адважваюць поўнай мераю.

﴿ وَإِذَا كَالُوهُمْ أَو وَّزَنُوهُمْ يُخْسِرُونَ ﴾[259]

---

[256] КЛ, 58А – 58Б.

[257] КЛ, 58Б.

[258] (83:1-2) *“Гора тым, якія абважваюць [іншых], а [самі] бяруць спаўна, калі людзі адмерваюць ім”.*

[259] (83:3) *“[Гора тым, хто], калі самі абмерваюць або абвешваюць, то прыносяць страту [іншым]”.*

А калі самі каму прадаюць – мерацць або важаць мерай і вагай фальшывай».

Калі Прарок, яго міласць, да Медынею прыйшоў, абычай такі быў у людзей медынейскіх: меры і вагі былі ў іх фальшывыя. Пан Бог гэты *сюрэй* паслаў, потым яны сталі мусульманамі і таму каяліся, бо яны перад тым дзве меры трымалі. Адной мерай сабе куплялі, а малой мерай – прадавалі.[260]

## 29. Сцеражыцеся хараму, каб выбавіцца ад Пекла!

Пан Бог у Кур'ане паведаміў гэтым аятам:

﴿ يَا أَيُّهَا الَّذِينَ آمَنُوا إِنَّمَا الْخَمْرُ وَالْمَيْسِرُ وَالْأَنصَابُ وَالْأَزْلَامُ رِجْسٌ مِّنْ عَمَلِ الشَّيْطَانِ فَاجْتَنِبُوهُ لَعَلَّكُمْ تُفْلِحُونَ ﴾[261]

«Іман пяючыя мусульмане, Мне, Богу, верныя! Пэўна, што **<u>п'яны напой, танцы-плясы, сходкі карчэмныя, у косці, у карты гуляць, лёсы-варожкі</u>** (варажба) – гэта пракляты *харам*, то учынак з умыслу шайтанскага. **Таго сцеражыцеся, калі хочаце быць вольнымі ад Пекла**».

﴿ إِنَّمَا يُرِيدُ الشَّيْطَانُ أَن يُوقِعَ بَيْنَكُمُ الْعَدَاوَةَ وَالْبَغْضَاءَ فِي الْخَمْرِ وَالْمَيْسِرِ وَيَصُدَّكُمْ عَن ذِكْرِ اللَّهِ وَعَنِ الصَّلَاةِ فَهَلْ أَنتُم مُّنتَهُونَ ﴾[262]

«Пэўна таго хоча шайтан, каб укінуць паміж вамі непрыязнь, звады, гнеў і запальчывасць **у напою п'яным і ў гульнях – картах-**

[260] КЛ, 60Б.

[261] (5:90) *"О вернікі! Хмельны напой, майсір (азартныя гульні), [ахвярапрынашэнні] на каменных капішчах [і варажба] па стрэлах – кепскія учынкі шайтанавы. Трымайцеся ўбаку ад гэтага, каб былі вы шчаслівыя".*

[262] (5:91) *"Папраўдзе, шайтан пры дапамозе віна і азартных гульняў хоча пасеяць паміж вамі варажнечу і нянавісць і адвярнуць вас ад памінання Аллага і здзяйснення малітвы. Ці ўстоіце вы [перад імі]?"*

**костках, каб вас адвярнуць ад хвалы Божай, ад намазу.** Ці не можаце вы сцерагчыся ад тых забароненых праклятых рэчаў? То былі б вольныя ад Пекла».[263]

***

قَالَ النَّبِيُّ ﷺ : مَنْ شَرِبَ الخَمْرَ قَدَحاً
يَخْرُجُ عَنْ إِيمَانَهُ مِنْ بَدَنٍ وَلَمْ يَرْجَعُ أَرْبَعِينَ يَوْمًا[264]

Прарок, яго мілосць, мовіў: «Хто б меў віна або хмельнага напітку адзін куфаль выпіць – іман ад яго адыдзе і да сарака дней да яго не ўвойдзе».[265]

---

[263] КЛ, 62Б – 63А.

[264] Параўн. хадзіс, прыведзены імамам ат-Цірмізі (у зборніку “Джамі ат-Цірмізі”, № 1862): “Абдуллаг б. Умар распавёў, што Пасланец Божы ﷺ мовіў: “У таго, хто п’е хмельнае, не будзе прыняты намаз на працягу сарака дзён. Калі ён пакаецца, то Аллаг прыме яго пакаянне. А калі вернецца да п’янства, то Аллаг не прыме яго намаз сорак дзён. Але калі ён пакаецца, то Аллаг прыме яго пакаянне. Калі ён ізноў вернецца да п’янства, то Аллаг ізноў не прыме яго намаз на працягу сарака дзён. Калі ён пакаецца, то Алах прыме яго пакаянне. Калі ён вярнецца да п’янства ў чацвёрты раз, Аллаг не прыме яго намаз на працягу сарака дзён, і нават калі ён пакаецца, Аллаг не прыме яго пакаянне, і ён будзе напоены з ракі аль-Хаба́ль». Яны сказалі: «О Абу Абдур-Рахман, што за рака аль-Хабаль!?» Ён сказаў: «Гэта рака гною, якая выцякае з насельнікаў Агню». [Абу ‘Іса (ат-Цірмізі) сказаў:] Гэты хадзіс – *хасан* (прымальны), і падобны да яго паведамляецца са словаў Абдуллага бін Амра і Ібн Аббаса ад Прарока”.

قَالَ عَبْدُ اللَّهِ بْنُ عُمَرَ قَالَ رَسُولُ اللَّهِ صلى الله عليه وسلم

" مَنْ شَرِبَ الْخَمْرَ لَمْ يَقْبَلِ اللَّهُ لَهُ صَلاَةً أَرْبَعِينَ صَبَاحًا فَإِنْ تَابَ تَابَ اللَّهُ عَلَيْهِ فَإِنْ عَادَ لَمْ يَقْبَلِ اللَّهُ لَهُ صَلاَةً أَرْبَعِينَ صَبَاحًا فَإِنْ تَابَ تَابَ اللَّهُ عَلَيْهِ فَإِنْ عَادَ لَمْ يَقْبَلِ اللَّهُ لَهُ صَلاَةً أَرْبَعِينَ صَبَاحًا فَإِنْ تَابَ تَابَ اللَّهُ عَلَيْهِ فَإِنْ عَادَ الرَّابِعَةَ لَمْ يَقْبَلِ اللَّهُ لَهُ صَلاَةً أَرْبَعِينَ صَبَاحًا فَإِنْ تَابَ لَمْ يَتُبِ اللَّهُ عَلَيْهِ وَسَقَاهُ مِنْ نَهْرِ الْخَبَالِ " . قِيلَ يَا أَبَا عَبْدِ الرَّحْمَنِ وَمَا نَهْرُ الْخَبَالِ قَالَ نَهْرٌ مِنْ صَدِيدِ أَهْلِ النَّارِ . قَالَ أَبُو عِيسَى هَذَا حَدِيثٌ حَسَنٌ وَقَدْ رُوِيَ نَحْوُ هَذَا عَنْ عَبْدِ اللَّهِ بْنِ عَمْرٍو وَابْنِ عَبَّاسٍ عَنِ النَّبِيِّ صلى الله عليه وسلم .

[265] КЛ, 63Б.

***

Так ведайце, якое пакаранне мае быць людзям, якія без пакаяння паўміраюць [ўжыванне] напояў хмельных.

Але [дзеля выбаўлення ад той кары], уперад трэба каяціся, здароваму і пры слове стаць (=стрымаць слова), каяты датрымаць. Пакарання Божага трэба моцна баяцца.

Як піша ў Кур'ане:

﴿ اِتَّقُوا اللَّهَ حَقَّ تُقَاتِهِ ﴾[266]

«І, вернікі Божыя, мусульмане, бойцеся Пана Бога, Стварыцеля свайго праўдзіваю баязняю».

﴿هُوَ أَهْلُ التَّقْوَى وَأَهْلُ الْمَغْفِرَةِ ﴾

«Тыя людзі, каторыя ў баязні Божай, тым людзям Пан Бог грахі іх адпусціць».

Так узяўшы гэтую навуку і баязнь Божую ў нутро сваё, [трэба пазбягаць] усялякіх хмельных напіткаў, каторыя-кольвек хмельнымі называюць. На вечныя часы трэба каяту учыніць, неадваротна, паводле заказанага (забароннага) аяту[267] і хадзісу Прарока, яго міласці:

لاَ يَعُودُ إِلَى الذَّنْبِ كَمَنْ لاَ يَعُودُ الْحَلِيبِ إِلَى الضُّرْعِ[268]

---

[266] араб. *"Асцерагайцеся Аллага належным чынам"*.

[267] "Заказаны аят" – цікавасць уяўляе, што выраз, які прыводзіцца далей ад імя Прарока, перадаецца ў тафсіры да суры "ат-Тахрым" ("Забарона"): (66:8) *"О вернікі! Раскайваецца перад Аллагам як мага больш шчыра! Мажліва, ваш Госпад даруе вам вашыя дрэнныя ўчынкі"*.

يَا أَيُّهَا الَّذِينَ آمَنُوا تُوبُوا إِلَى اللَّهِ تَوْبَةً نَّصُوحًا عَسَى رَبُّكُمْ أَن يُكَفِّرَ عَنكُمْ سَيِّئَاتِكُمْ

[268] У кнізе *"Маджму'а мін ат-тафасір Байдаві, Насафі, Хазіна і Ібн Аббаса"*, т.6, с.305, прыводзіцца такі ўрывак: "Мовілі Умар б. аль-Хатаб, Убай б. Ка'б і Му'аз: "Шчырае пакаянне – каб чалавек пакаяўся, а потым не вяртаўся да граху, як не вернецца [выдаенае] малако ў вымя".

قَال عُمَر بْنُ الخَطَّاب و أُبَيُّ بْنُ كَعْبٍ وَ مُعَاذ : ﴿تَوْبَةً نَّصُوح )) أَنْ يَتُوب ثُمَّ

«Як малако не можа вярнуцца, з вымені выдаенае, не можна ў вымя [гэтае малако] назад уліць, так тыя людзі, якія ўчыняць пакаянне, не маюць таго граху [ізноў] чыніць і маюць пры слове стаяць».[269]

### Ключ да Пекла і ключ да Раю

كُلُّ الرِّبَو وَشَارِبُ الخَمْرِ مِفْتَاح جَهَنَّم

Кожны чалавек, хто бярэ ліхву і з’ядае [яе][270] і хто хмельны напітак п’е – гэта ключ да Пекла.

الْوُضُوءُ لاَ إِلَهَ إِلاَّ اللَّهُ ، مُحَمَّدٌ رَسُولُ الله مِفْتَاحُ الجَنَّةِ[271]

Хто ў чыстасці часта мовіць *«Ля іляга ілля-Ллаг»* – гэта ключ да Раю.

## 30. Небяспека хараму

Хто ўжывае харам – сем рэчаў злых, сабе шкадлівых мае мецць:
Першае – жывот яго будзе чоран,
і просьба яго да Пана Бога будзе недаходна,
і моцы мецць не будзе,
чуйнасці ў вушах,

---

لاَ يَعُودُ إِلَى الذَّنْبِ كَمَنْ لاَ يَعُودُ الْحَلِيبِ إِلَى الضَّرْعِ

[269] КЛ, 64А – 64Б.

[270] Параўн. Кур’ан, 2:275: *“А тыя, хто жарэ ліхву, паўстануць з мёртвых, нібы пабітыя шайтанскім дотыкам. Гэта ім за тое, што казалі яны: “Гандаль – тое самае, што і ліхвярства”. А Аллаг дазволіў гандаль і забараніў ліхвярства”.*

[271] “Вуду’ і *“Ля іляга ілля-Ллаг, Мухаммад расулю-Ллаг”* – ключ ад Рая”. Параўн. хадзіс, прыведзены ат-Цірмізі са словаў Джабіра б. Абдулы, што Пасланец Божы, мір над ім, мовіў:
“Ключ ад Раю – намаз, а ключ ад намазу – вуду́’ (малое ўмыванне)” (Цірмізі, 4; Ахмад).

عَنْ جَابِرِ بْنِ عَبْدِ اللَّهِ، رضى الله عنهما قَالَ قَالَ رَسُولُ اللَّهِ صلى الله عليه وسلم

" مِفْتَاحُ الْجَنَّةِ الصَّلاَةُ وَمِفْتَاحُ الصَّلاَةِ الْوُضُوءُ "

яснасці ў вачах не будзе,
краскі на твары не будзе (згубіць здаровы выгляд),
спору (баракяту, дабрабыту) ў доме мець не будзе.[272]

[272] КЛ, 56Б.

# ІХСАН

## 1. Калі Бог цябе не забудзе?

Чалавек кожны Пана Бога Стварыцеля [хай] не перастане хваліць (быць удзячным). Як Пан Бог мовіў (2:152):

﴿ فَاذْكُرُونِي أَذْكُرْكُمْ وَاشْكُرُوا لِي وَلَا تَكْفُرُونِ ﴾

«Успамінайце Мяне, Бога, малітвамі, а Я вас успомню спасеннем (узнагародай), аддавайце Мне хвалу, а не псуйце дары Мае, не будзьце нявернікамі»[273].[274]

## 2. У чым сэнс цяжкасцяў?

﴿وَلَنَبْلُوَنَّكُم بِشَيْءٍ مِّنَ الْخَوْفِ وَالْجُوعِ وَنَقْصٍ مِّنَ الْأَمْوَالِ وَالْأَنفُسِ وَالثَّمَرَاتِ ﴾

[Пан Бог так мовіў:] (2:155) «Калі часам выпрабуем вас страхам, голадам і змяншэннем скарбаў і дабыткаў і на душах вашых, і на дзецях, – хто з вас гэта выцерпіць?

﴿ وَبَشِّرِ الصَّابِرِينَ * الَّذِينَ إِذَا أَصَابَتْهُم مُّصِيبَةٌ ﴾

Узрадуй, Мухаммад, цярплівых, каторых Я наведаю часам шкодай,

---

273 Параўн. Тафсір аль-Мунтахаб да дадзенага аята: “Памятайце ж Мяне, вернікі, праз выкананне Маіх запаветаў, а Я ўзгадаю вас Сваёй узнагародай. Будзьце ўдзячныя Мне за дабро і пільнуйцеся Маіх загадаў”.

274 КЛ, 7А.

Вядома, Бог нікога і нічога не забывае. Тут гаворка пра іншае – пра тое, што кожны хоча, каб Бог асабіста яго прыгадаў, вылучыў з ліку іншых. Гэта сапраўды важна. Слава сярод людзей – ніштo, а вось добрая слава ў Бога, сярод Яго анёлаў і праведных, пабожных людзей – гэта сапраўды каштоўна, бо дорыць чалавек мноства даброт і ў сегасветным жыцці, і ў вечнасці. І калі на гэтым свеце ўсё рана ці позна сканчаецца, то вечнасць на тое і вечнасць, што яго даброты бясконцыя.

﴿قَالُوا إِنَّا لِلَّهِ وَإِنَّا إِلَيْهِ رَاجِعُونَ * أُولَئِكَ عَلَيْهِمْ صَلَوَاتٌ مِّن رَّبِّهِمْ وَرَحْمَةٌ وَأُولَئِكَ هُمُ الْمُهْتَدُونَ﴾

а яны скажуць: «Мы – для Бога (=належым Богу) і да Яго вернемся (2:156). Такія людзі – над імі блаславенне ад Бога іх, ласка і літасць Божая і такія людзі на праўдзівай дарозе» (2:157).[275]

## 3. Як вызваліцца ад грахоў?

### Бойцеся Бога

Як мовіў Пан Бог:

﴿يَا أَيُّهَا الَّذِينَ آمَنُوا اتَّقُوا اللَّهَ وَلْتَنظُرْ نَفْسٌ مَّا قَدَّمَتْ لِغَدٍ﴾[276]

«І, тыя, каторыя ўверылі ў адзіноства Божае, бойцеся Бога. Няхай глядзіць душа, што зарабіла: ці злое, ці добрае?» (59:18).

Як піша:

﴿هُوَ أَهْلُ التَّقْوَى وَأَهْلُ الْمَغْفِرَةِ﴾[277]

«Людзям, у якіх ёсць боязь Божая, тым людзям грахі адпушчу. Будуць яны збавёны ад грахоў сваіх у боязі Божай» (74:56).

Што сказана ў Кур'ане – так мае быць, без сумневу, іначай быць не можа.[278]

### Прабачайце людзям

﴿وَالْكَاظِمِينَ الْغَيْظَ وَالْعَافِينَ عَنِ النَّاسِ

---

[275] КЛ, 7Б.
[276] (59:18) *"О вернікі! Бойцеся Аллага, і хай душа паглядзіць [што падрыхтавала на заўтра]".*
[277] (74:56) *"Ён – Той, Хто варты боязі і Хто здольны прабачаць".*
[278] КЛ, 7Б.

﴿ وَاللَّهُ يُحِبُّ الْمُحْسِنِينَ ﴾[279]

(3:134): «Хто каму сваю віну і жаль адпусціць, Пан Бог таму грахі адпусціць, бо Пан Бог любіць добрых і адпусклівых (=тых, хто прабачае)».[280]

## 4. Хто будзе ў Раі?

Як пыталі ў Абу Ханіфы-імама: «Хто мае быць у Раі?» Абу Ханіфа мовіў: «Чытайце Кур'ан, у сюрэю *«Ўа-н-назі'ат»* сказана:

﴿ وَأَمَّا مَنْ خَافَ مَقَامَ رَبِّهِ وَنَهَى النَّفْسَ عَنِ الْهَوَى *
فَإِنَّ الْجَنَّةَ هِيَ الْمَأْوَى ﴾[281]

«Хто Пана Бога баяўшыся, прыказ Яго выконвае, устыдаючыся ўстаць перад Богам, хто сам сябе будзе берагчы ад злога ўчынку, – яго месца – Рай, і там ён вечна будзе» (79:40-41).[282]

---

[279] *"тыя, хто стрымлівае гнеў і даруе (прабачае) людзям, бо Аллаг любіць дабрачынцаў".*

[280] КЛ, 9Б.

[281] (79:40-41): *"А тым, хто баяўся паўстаць перад сваім Госпадам, хто ўтрымліваў сябе ад згубнай жарсці, прытулкам стане Рай".*

[282] КЛ, 8А. Імкненне да Раю – цалкам натуральнае для кожнага верніка. Але часам за знешнімі формамі губляецца існасць і мэта пакланення. Некаторыя мараць пра райскія асалоды, але забываюцца пра пякельную кару. Сапраўдныя ж вучоныя ісламу кажуць так: "Імкнуцца да Раю трэба прынамсці дзеля таго, каб не патрапіць у Пекла". Першачаргова ж трэба імкнуцца да задавальнення Аллага, бо менавіта пасля таго, як табой будзе задаволены Госпад, можна спадзявацца і на Рай.

## 5. Якая вартасць садакі?

Хто каму дае на Божую дарогу, як мовіў Пан Бог:

﴿مَثَلُ الَّذِينَ يُنفِقُونَ أَمْوَالَهُمْ فِي سَبِيلِ اللَّهِ كَمَثَلِ حَبَّةٍ أَنبَتَتْ سَبْعَ سَنَابِلَ فِي كُلِّ سُنبُلَةٍ مِّائَةُ حَبَّةٍ وَاللَّهُ يُضَاعِفُ لِمَن يَشَاءُ وَاللَّهُ وَاسِعٌ عَلِيمٌ﴾[283]

«Падабенства тых, якія ахвяруюць скарбы свае на Божую дарогу – падобныя зерню, што радзіла сем каласоў, а ў кожным коласе – сто зярнят. Так Пан Бог прыспорыць ахвяруючаму захоча, бо Пан Бог – [Валадар] шырокай ласкі і ведае, што дае» (2:261).[284]

***

Пан Бог мовіў (64:17):

﴿إِنْ تُقْرِضُوا اللَّهَ قَرْضًا حَسَنًا يُضَاعِفْهُ لَكُمْ وَيَغْفِرْ لَكُمْ وَاللَّهُ شَكُورٌ حَلِيمٌ﴾[285]

«Пэўна, садака – павіннасць са сваіх маетнасцяў даваць, а Я вам у Раі ласкі Маёй Божай без лічбы́ спасенне (=незлічонаую ўзнагроду) дам».

***

اَلصَّدَقَةُ تُطْفِئُ الْخَطِيئَةَ كَمَا يُطْفِئُ الْمَاءُ النَّارَ[286]

«Садакі даванне утушае грахі, як тушыць вада агонь».

---

[283] (2:261) "Прыклад тых, хто ахвяруе майно сваё на шляху Божым – зярнятка, з якога вырасла сем каласоў, і ў кожным коласе – па сто зярнят. Аллаг прымнажае, каму пажадае. Аллаг ахінае ўсё і ўсё ведае".

[284] Тут і далей ў гэтым раздзеле: КЛ, 8А – 9Б.

[285] (64:17): "Калі вы дасце Аллагу добрую пазыку, Ён верне вам яе шматкроць і даруе вам, бо Аллаг – Шчодры, Рахманы".

[286] Арыгінал, які змяшчае дадзены фрагмент хадзіса, прыводзяць Цірмізі, 2616 і інш., а таксама Ібн Маджа, 3973. Хадзіс хасан (прымальны).

***

У Прарока ﷺ пыталі: «[Як быць,] калі не маем, чаго даць на садаку?» Прарок ﷺ мовіў: «Хоць бы для ласкі Божай паў-яблычка даў, тое паў-яблычка ад паў-Пекла абароніць» [287].

***

Прарок ﷺ мовіў: «Хто бы не меў чаго даць, дабро чыні, дабра зыч – за садаку ідзе».

### Што губіць садаку?

﴿ ٱلَّذِينَ يُنفِقُونَ أَمْوَٰلَهُمْ فِي سَبِيلِ ٱللَّهِ ثُمَّ لَا يُتْبِعُونَ مَآ أَنفَقُوا۟ مَنًّا وَلَآ أَذًى لَّهُمْ أَجْرُهُمْ ﴾[288]

(2:262) «Хто паахвяруе скарбаў сваіх на дарозе Божай, потым таго не шкадуйце і не адымайце, што ахвяраваў. І не хваліся тым, і не папракай, і не абцяжарвай іх. Для іх адплата…

﴿ عِندَ رَبِّهِمْ وَلَا خَوْفٌ عَلَيْهِمْ وَلَا هُمْ يَحْزَنُونَ ﴾[289]

…у Пана Бога іх, і не будзе страху над імі, і яны не будуць засмучоныя на судзе Божым».

[287] Параўн. Сахіх Бухары, 1417: “Ратуйцеся ад Пекла нават паловай фініка”.

اتَّقُوا النَّارَ وَلَوْ بِشِقِّ تَمْرَةٍ

[288] (2:262): *“Хто ахвяруе на шляху Аллага, і пасля не кідае ўслед за гэтым дакоры і абразы, атрымаюць узнагароду…”*

[289] (2:262): *“…у Госпада свайго. Няма над імі страху і не будуць яны засмучаны”.*

﴿ قَوْلٌ مَّعْرُوفٌ وَمَغْفِرَةٌ خَيْرٌ مِّن صَدَقَةٍ يَتْبَعُهَا أَذًى وَاللَّهُ غَنِيٌّ حَلِيمٌ * يَا أَيُّهَا الَّذِينَ آمَنُوا لَا تُبْطِلُوا صَدَقَاتِكُم بِالْمَنِّ وَالْأَذَى كَالَّذِي يُنفِقُ مَالَهُ رِئَاءَ النَّاسِ وَلَا يُؤْمِنُ بِاللَّهِ وَالْيَوْمِ الْآخِرِ ﴾[290]

«Добрае слова пра кагосьці мовіць і адпусціць жаль свой (=прабачыць крыўду) каму – лепшай такой ахвяры, чым тому, хто меў ахвяраваць, і [потым] папракаць, і трудніць (=ствараць цяжкасці), бо да нас Пан Бог – Багаты, Лагодны.

І, тыя, каторыя [ў] Бога верыце, не губіце ахвяры вашы пахвальбой і папрокамі, як той, хто ахвяраваў скарб свой на пахвальбу людскую (=дзеля людской пахвалы) і не верыў Богу і Дню Астатняму». (2:263-264).[291]

***

آفَتْ الصَّدَقَةِ الرِّيَاء[292]

Зава́да (=перашкода[293] для міласціны): хто, даўшы садаку, хваліцца або перад людзьмі дае – для пахвалы людской.

## Што важней за садагу?

﴿ قَوْلٌ مَّعْرُوفٌ وَمَغْفِرَةٌ خَيْرٌ مِّن صَدَقَةٍ يَتْبَعُهَا أَذًى ﴾[294]

---

[290] (2:263-264): *“Добрае слова і дараванне лепш за міласціну, следам за якой ідзе крыўда. Аллаг – Багаты, Лагодны. Гэй, вернікі! Не псуйце міласціны вашае дакорам і крыўдаю, нібы той, хто раздае майно напаказ людзям, а сам не верыць ані ў Аллага, ні ў Апошні дзень.”*

[291] КЛ, 8Б.

[292] ар. “Бедства для міласціны – крывадушша”.

[293] ці парушэнне дзеяння – *муфсід*.

[294] “Добрае слова і дараванне лепш за міласціну, следам за якой ідзе крыўда.”

(2:263): «Добрыя словы зычлівым мусульманам мовіць лепей, важней за даванне садакі для Бога. Даў – даючы, не перагавары, не гневайся».[295]

### Як лепш даваць садагу?

﴿ إِن تُبْدُوا الصَّدَقَاتِ فَنِعِمَّا هِيَ وَإِن تُخْفُوهَا وَتُؤْتُوهَا الْفُقَرَاءَ
فَهُوَ خَيْرٌ لَّكُمْ وَيُكَفِّرُ عَنكُم مِّن سَيِّئَاتِكُمْ
وَاللَّهُ بِمَا تَعْمَلُونَ خَبِيرٌ ﴾[296]

(2:271): «Калі яўна даеце садаку – добра, калі моўчыкам даеце ўбогім багамольцам, то яшчэ лепей. Закят і дзесяціну трэба даваць яўна, бо гэта *фарз*, а садаку – таемна лепей, бо гэта *нафіле*. Адверне Пан Бог грахі вашыя. Пан Бог ведае, што чыніце за ўчынкі».[297]

## 6. Чаму трэба шанаваць бацькоў?

﴿يَا أَيُّهَا النَّاسُ اتَّقُوا رَبَّكُمُ الَّذِي خَلَقَكُم مِّن نَّفْسٍ وَاحِدَةٍ
وَخَلَقَ مِنْهَا زَوْجَهَا وَبَثَّ مِنْهُمَا رِجَالًا كَثِيرًا وَنِسَاءً
وَاتَّقُوا اللَّهَ الَّذِي تَسَاءَلُونَ بِهِ وَالْأَرْحَامَ﴾[298]

Пан Бог мовіў: «І, людзі, бойцеся Бога вашага, Каторы стварыў вас з душы адной Адамавай, і з таго цела і духа жонку яму стварыў і рассыпаў з двух людзей – мужчын і жанчын. Бойцеся Бога, Каторы

---

[295] КЛ, 9Б.
[296] (2:271): *“Калі вы дасце міласціну адкрыта, будзе выдатна. Але калі вы ўпотай даеце яе ўбогім, то гэта лепш для вас жа. Аллаг даруе вам некаторыя нядобрыя ўчынкі, і Аллагу вядома, што вы робіце”.*
[297] КЛ, 9Б.
[298] (4:1): *“О людзі! Бойцеся Госпада вашага, Які стварыў вас з аднае душы і стварыў з яе другую да пáры, а з іх абедзьвюх рассеяў мноства мужчын і жанчын. Таму бойцеся Аллага, імем Якога вы звяртаецеся адзін да аднаго, і трымайцеся сваяцтва (=роднасных сувязяў)”.*

будзе пытаць на судзе Сваім аб родзічах і крэўных. З-за таго бойцеся [і шануйце] мацерак сваіх, бо ляжалі ў жыватах іх» (4:1).

﴿ إِنَّ اللَّهَ كَانَ عَلَيْكُمْ رَقِيبًا ﴾[299]

«Пэўне, Пан Бог над імі быстрым стражам (4:1).[300]

***

Чытай аб павіннасці айца-маткі, як Пан Бог кажа. Пан Бог мовіў:

﴿ وَقَضَى رَبُّكَ أَلَّا تَعْبُدُوا إِلَّا إِيَّاهُ وَبِالْوَالِدَيْنِ إِحْسَانًا إِمَّا يَبْلُغَنَّ عِندَكَ الْكِبَرَ أَحَدُهُمَا أَوْ كِلَاهُمَا فَلَا تَقُل لَّهُمَا أُفٍّ وَلَا تَنْهَرْهُمَا وَقُل لَّهُمَا قَوْلًا كَرِيمًا ﴾[301]

(17:23): «Старайцеся [заслужыць] Маёй удзячнасці і старайцеся [заслужыць пахвалы] айцоў і матак сваіх, ва ўсім іх слухайце. Не засмучайце, калі прыдзе на іх старасць, гнеўна ім не адказвай. Калі відзіш – нечыстасць якая ў іх, [то] абатры, абмый, волі (=просьбы) іх чыні. Абмывайце і шануйце, як яны вам малым чынілі, тую міласць ім аддавайце. Хто айца або матку угневіць, якбы Мяне, Бога, гнявіў. За айца, за матку заўжды Пана Бога прасі:

﴿وَاخْفِضْ لَهُمَا جَنَاحَ الذُّلِّ مِنَ الرَّحْمَةِ وَقُل رَّبِّ ارْحَمْهُمَا كَمَا رَبَّيَانِي صَغِيرًا ﴾[302]

(17:24): «Божа Міласцівы, змілуйся над маімі бацькамі, над айцом, над маткай маёй».[303]

---

[299] (4:1-3): *“Папраўдзе, Аллаг назірае за вамі”.*

[300] КЛ, 10А.

[301] (17:23): *“Твой Госпад судзіў вам не пакланяцца нікому, апроч Яго, і добра ставіцца да бацькоў. Калі адзін з бацькоў ці абодва яны дасягнуць шаноўнага ўзросту, то не гавары з імі сярдзіта, не бурчы на іх і стаўся да іх з пашанаю”.*

[302] (17:24): *“І схіляй перад імі абодвума крыло з пакораю і ласкаю, кажучы: “Пане Божа! Злітуйся з іх, як і яны песцілі (=узгадоўвалі) мяне з дзяцінства”.*

[303] Тут і да канца падраздзела: КЛ, 11А – 11Б.

***

اَلْجَنَّةُ تَحْتَ أَقْدَامِ الْأُمَّهَاتِ

Рай – пад нагамі ў маткі.[304]

Хто сваіх айца-матку шануе, ні ў чым не гневіць, для такіх людзей – Рай.

## Калі можна не паслухацца бацькоў?

﴿وَإِن جَاهَدَاكَ عَلَى أَن تُشْرِكَ بِي مَا لَيْسَ لَكَ بِهِ عِلْمٌ فَلَا تُطِعْهُمَا وَصَاحِبْهُمَا فِي الدُّنْيَا مَعْرُوفًا﴾[305]

(31:15): «Калі б айцец-матка ад веры мусульманскай адводзілі, табе іх слухаць не трэба, або супраць Прарока, супраць Бога, – то іх не слухай, але [ва ўсім астатнім] айца і матку шануй».

Прарок ﷺ мовіў да Алея: «Айца-матку шануй, хоць бы яны кяфірамі (=няверыікамі) былі. Айцоўскай добрасці (задаволенасці) вельмі сцеражы, бо добрасць Стваральніка ў айца, у маткі ў сэрцу. Так [і] гнеў Божы за айца, за матку, калі іх пагневіш».[306]

***

﴿أَنِ اشْكُرْ لِي وَلِوَالِدَيْكَ إِلَيَّ الْمَصِيرُ﴾[307]

(31:14): «Калі хто айцу і матцы праціўны будзе (=будзе супраць іх), удзячнасці і прабачэння не атрымае, хоць бы ўсяму свету, [усім]

---

[304] Ад Анаса ібн Маліка перадаецца, што Пасол Божы ﷺ сказаў: "Рай – пад нагамі маці". Перадалі ас-Суюты і аль-Куда'і. Арыгінал тэксту: عَنْ أَنَسِ بْنِ مَالِكٍ رضي الله عنه قَالَ: قَالَ رَسُولُ اللهِ ﷺ: «اَلْجَنَّةُ تَحْتَ أَقْدَامِ الْأُمَّهَاتِ». رَوَاهُ السُّيُوطِيُّ وَالْقُضَاعِيُّ

[305] (31:15): "А калі бацькі будуць намагацца, каб ты стаў надаваць Мне раўнёю тое, пра што табе і невядома, то не слухайся іх у гэтым, але суправаджай іх ў сегасветных добрых справах".

[306] Тут і да канца падраздзела: КЛ, 11Б.

[307] (31:14): "Будзь удзячны Мне і бацькам сваім, бо да Мяне належыць вяртанне".

людзям добрасць чыніў; Пан Бог ад яго не будзе ўдзячан (=не будзе задаволены ім)».

﴿وَاعْبُدُوا اللَّهَ وَلَا تُشْرِكُوا بِهِ شَيْئًا وَبِالْوَالِدَيْنِ إِحْسَانًا﴾[308]

(4:36): «Хто Божым слугой будучы, Божыя паслугі (=пакланенне) аддаваў Богу, ні ў чым роўні не чыніў, айца-матку шанаваў, над тым чалавекам будзе ласка Божая, Пан Бог удзячан будзе з яго (=будзе ім задаволены)».

## 7. Як шанаваць сірот?

﴿وَآتُوا الْيَتَامَىٰ أَمْوَالَهُمْ وَلَا تَتَبَدَّلُوا الْخَبِيثَ بِالطَّيِّبِ
وَلَا تَأْكُلُوا أَمْوَالَهُمْ إِلَىٰ أَمْوَالِكُمْ إِنَّهُ كَانَ حُوبًا كَبِيرًا﴾[309]

(4:2) «Аддавайце сіротам скарбы іх. Не майце, не мяшайце нячысты харам з чыстым халялем, не ешце скарбаў сіроцкіх [змяшаўшы] са сваімі скарбамі, – пэўне, грэх вялікі».

﴿وَلَا تُؤْتُوا السُّفَهَاءَ أَمْوَالَكُمُ الَّتِي جَعَلَ اللَّهُ لَكُمْ قِيَامًا
وَارْزُقُوهُمْ فِيهَا وَاكْسُوهُمْ وَقُولُوا لَهُمْ قَوْلًا مَعْرُوفًا﴾[310]

«І не давайце неразумным людзям скарбаў сіроцкіх, каторыя не ўмеюць таргаваць, што Пан Бог учыніў вам на пажытак, штоб управілі тых сірот, покі яны на ногі паўстануць і карміце іх із таго,

---

[308] (4:36): *"Пакланяйцеся Аллагу, не надаючы Яму раўні, і як найлепей стаўцеся да бацькоў"*

[309] (4:2): *"Аддавайце сіротам іх маёмасць і не падмяняйце ліхім добрае. Не праядайце іх маёмасці разам са сваёй, бо, папраўдзе, гэта – вялікі грэх".*

[310] (4:5): *"Не давайце неразумным свайго майна, якое Аллаг зладзіў вам сродкам існавання (=пажыткам). Надзяляйце і апранайце іх з гэтай маёмасці, і кажыце ім слова добрае".*

але не ешце з іх таго, што прыйдзе з пажыткаў паводле шарыяту, моўце сіротам словы добрыя» (4:5).

﴿وَابْتَلُوا الْيَتَامَىٰ حَتَّىٰ إِذَا بَلَغُوا النِّكَاحَ

فَإِنْ آنَسْتُم مِّنْهُمْ رُشْدًا فَادْفَعُوا إِلَيْهِمْ أَمْوَالَهُمْ﴾[311]

«Вучыце іх навукам, выпрабоўвайце іх, сірот, аж покуль прыйдуць, дасягнуць паўнагадовага ўзросту і жаніцца захочуць. Калі ўбачыце іх, што ў рэчах добра справуюцца, тады ім аддайце скарбы да рук ім, а не праядайце скарбы іх шляхам заменаў, фігляў (=падменаў, хітрыкаў)» (4:6).

﴿إِنَّ الَّذِينَ يَأْكُلُونَ أَمْوَالَ الْيَتَامَىٰ ظُلْمًا

إِنَّمَا يَأْكُلُونَ فِي بُطُونِهِمْ نَارًا وَسَيَصْلَوْنَ سَعِيرًا﴾[312]

«Пэўна, каторыя ядуць скарбаў сіроцкіх крыўдаю, фіглямі (=падманам), пэўне, яны маюць есць вуголле і напоўняць жываты свае агнём і запаляцца полымем пякельным» (4:10).[313]

***

مَنْ أَحْسَنَ يَتِيماً فَقَدْ نَبِيًّا فَقَدْ كَانَ مِنْ أَهْلِ الْجَنَّةِ[314]

---

311 (4:6): *“Выпрабоўвайце (=правярайце развіццё, давайце іспыты) сірот, пакуль яны на дасягнуць шлюбнага ўзросту. І калі ўбачыце ў іх дарослае мысленне, тады вярніце ім іх маёмасць”*

312 (4:10) *“Папраўдзе, тыя, хто няпраўна праядаюць маёмасць сірот, напаўняюць свае чэравы агнём і будуць кінуты ў полымя”.*

313 КЛ, 10А – 10Б.

314 Ар. “Хто будзе клапаціцца пра сірату, нібы пра прарока, той стане адным з насельнікаў Раю”. Параўн. хадзіс Цірмізі: “Хто дасць прытулак сіраце сярод мусульман, кормячы яго, поячы і пазбавіўшы ад нястачы, таму Аллаг зробіць абавязковым Рай”. Арыгінал:

مَن آوى يَتيمًا مِن بيْن المُسلِمين إلى طَعامِه وشَرابِه حتَّى يُغْنِيَه، أَوجَبَ اللهُ له الجَنَّةَ

Хто шануе сірату, як бы шанаваў Прарока ﷺ, пэўне такія людзі – жыхары райскія.[315]

***

صِلَةُ الرَّحِمِ تَزِيدُ العُمرِ[316]

Хто бы меў даглядаць сірот убогіх і сваіх крэўных, Пан Бог яму век шырыць.

## 8. Як здабыць ласку Божую?

مَنْ وَصَلَهَا وَصَلَهُ وَمَنْ قَطَعَهَا قَطَعَهُ[317]

Хто бы паводле прыказу Божага жыў на свеце, перасцерагаючы братэрства, быў сам ласкавы, Пан Бог ласку Сваю над ім учыніць, а хто не перасцерагаў ласкі людской – той чалавек ласкі Божай не будзе мець.[318]

## 9. Як падоўжыць свой век?

صِلَةُ الرَّحِمَ تُزِيدُ فِي العُمْرِ وَالجَنَّةُ دَارُ الأَسْخِيَاءِ[319]

[315] Тут і да канца падраздзела: КЛ, 12А.
[316] Ар. "Падтрыманне сваяцкіх повязей дадае веку".
[317] ар. "Хто падтрымлівае іх (роднасныя сувязі) – падтрымаюць і яго, хто парывае – парвуць і з ім". Параўн. хадзіс, прыведзены імамам ат-Цірмізі, № 1924: "Сваяцтва *(ар-ра́хім)* – паходзіць ад імя Аллага – ар-Рахма́н, і той, хто падтрымлівае іх – падтрымаюць і яго, хто парывае – парвуць і з ім".

الرَّحِمُ شُجْنَةٌ مِنَ الرَّحْمَنِ فَمَنْ وَصَلَهَا وَصَلَهُ اللَّهُ وَمَنْ قَطَعَهَا قَطَعَهُ اللَّهُ

[318] КЛ, 10Б – 11А.
[319] Араб. "Падтрыманне сваяцтва дадае веку, а Рай – прыстанак шчодрых". Абодва выказванні ў дадзеным рукапісе справядліва не прыпісаны Прароку, мір над ім, паколькі прынамсі другое – пра Рай для шчодрых, – з'ўялецца пазакананічным. Але абодва выказванні справядлівыя і правільныя па сваім сэнсе, і пацверджаны ўскосна хадзісамі і аятамі Кур'ану. Напрыклад, імамы Бухары (1913) і Муслім (2557 б) прыводзяць цалкам варты даверу хадзіс: "Хто

Хто сваіх родзічаў крэўных любіць, таму Пан Бог дае доўгі век, а для шчодрых і праўдзівых мусульман Пан Бог дае Рай.[320]

***

﴿ وَبِالْوَالِدَيْنِ إِحْسَانًا وَذِي الْقُرْبَى وَالْيَتَامَى وَالْمَسَاكِينِ ﴾[321]

(2:83): «Чыні дабро блізкім, крэўным і сіротам убогім, [будзь тым, хто] людзей частуе, шануе, тога, хто просіць, ні з чым не адпраўуе, хоць бы [і] кяфірын быў».[322]

***

دَارُ الأَصْحِيَاءِ الجَنَّةِ تُحْفَةُ المُؤْمِن

А шчодраму мусульманіну падарунак ад Пана Бога – Рай, то мусульманскі Дом вечны.[323]

## 10. Як трэба шанаваць суседзяў?

Як кажа Пан Бог суседзяў шанаваць:

﴿ وَالْجَارِ ذِي الْقُرْبَى وَالْجَارِ الْجُنُبِ وَالصَّاحِبِ بِالْجَنبِ ﴾[324]

---

жадае, каб павялічыўся яго пажытак *(рызк)* і падоўжыўся яго век, хай падтрымлівае сваяцтва".

مَنْ أَحَبَّ أَنْ يُبْسَطَ عَلَيْهِ فِي رِزْقِهِ, وَأَنْ يُنْسَأَ لَهُ فِي أَثَرِهِ, فَلْيَصِلْ رَحِمَهُ

Пра вартасць шчодрасці сведчыць хадзіс, які прыводзіць ат-Цірмізі, № 1961: "Шчодры блізкі да Аллага, блізкі да Раю, блізкі да людзей і далёкі ад Агню. А скупы аддалены ад Аллага, далёкі ад Рая, далёкі ад людзей і блізкі да Пекла. Шчодры невук мілей для Аллага чым скупы багамолец".

السَّخِيُّ قَرِيبٌ مِنَ اللَّهِ قَرِيبٌ مِنَ الْجَنَّةِ قَرِيبٌ مِنَ النَّاسِ بَعِيدٌ مِنَ النَّارِ وَالْبَخِيلُ بَعِيدٌ مِنَ اللَّهِ بَعِيدٌ مِنَ الْجَنَّةِ بَعِيدٌ مِنَ النَّاسِ قَرِيبٌ مِنَ النَّارِ وَلَجَاهِلٌ سَخِيٌّ أَحَبُّ إِلَى اللَّهِ عَزَّ وَجَلَّ مِنْ عَابِدٍ بَخِيلٍ

[320] КЛ, 11А.

[321] (2:83): "[стаўцеся як найлепей да бацькоў], сваякоў, сірот і жабракоў".

[322] КЛ, 12А.

[323] КЛ, 35Б.

[324] (4:36) *"а таксама [як найлепей стаўцеся] да суседзяў – сваякоў і не сваякоў, – і да спадарожніка"*.

(4:36) «З суседзямі блізкімі, крэўнымі і з суседзямі блізка мешкаючы, і калі да трох дзён пры вас будуць[325] шануй і паважай, ні ў чым іх не гняві.

Калі маеш страву, а суседу пах зайдзе, або яму пашлі, або яго ў дом свой прасі, без яго не еш».

أَوْصَانِى جَبْرَائِلُ حَتَّى شَفِيه[326]

Як мовіў Джабраіль: «Вельмі суседняй удзячнасці перасцерагай, суседа шануй, хоць бы кяфірын быў».[327]

***

Хто кляне суседа, нібы кляў Прарока ﷺ, а хто кляне Прарока ﷺ – нібы кляў Пана Бога, а хто кляне Пана Бога, то над ім кляцьба Божая[328] і анёльская, і людзкая, і ўсяго стварэння Божага.

---

[325] маюцца на ўвазе госці

[326] "Джыбрыль настаўляў мяне [адносна правоў суседа], пакуль не…". Падобны слабы хадзіс гучыць так: "Джыбрыль, мір над ім, настаўляў мяне адносна правоў суседа, нават які жыве на адлегласці сарака дамоў".

أَوْصَانِي جِبْرِيلُ عَلَيْهِ السَّلاَم بِالْجَارِ إِلَى أَرْبَعِينَ دَاراً

На гэту тэму маецца і варты даверу хадзіс з кнігі імама аль-Бухары "Адаб аль-муфрад": "Мужагід паведаміў, што аднойчы для Абдуллы ібн Амра зарэзалі авечку. Той спытаў свайго слугу: «Ты даў штосьці нашаму суседу-юдэю? Ці даў ты штось нашаму суседу-юдэю? Бо чуў я, што Пасланец Божы, хай дабраславіць яго Аллаг і пашле яму мір, казаў: "Джыбрыль працягваў настаўляць мяне, каб я добра ставіўся да сваіх суседзяў да таго часу, пакуль я не палічыў, што ён загадае мне зрабіць іх сваімі спадкаемцамі".

عَنْ مُجَاهِدٍ، عَنْ عَبْدِ اللهِ بْنِ عَمْرٍو، أَنَّهُ ذُبِحَتْ لَهُ شَاةٌ، فَجَعَلَ يَقُولُ لِغُلاَمِهِ: أَهْدَيْتَ لِجَارِنَا الْيَهُودِيِّ؟ أَهْدَيْتَ لِجَارِنَا الْيَهُودِيِّ؟ سَمِعْتُ رَسُولَ اللهِ صلى الله عليه وسلم يَقُولُ: مَا زَالَ جِبْرِيلُ يُوصِينِي بِالْجَارِ حَتَّى ظَنَنْتُ أَنَّهُ سَيُوَرِّثُهُ.

[327] Тут і да канца падраздзела: КЛ, 12А – 12Б.

[328] "Праклён (або гнеў) Аллага" – выраз, які мае значэнне "адлучэння ад ласкі Божай", то бок, пакаранне.

## 11. Як шанаваць гасцей?

﴿ وَابْنِ السَّبِيلَ ﴾[329]

«І сыну падарожнаму (=падарожніку)… Будзь рад госцю ў доме сваім, рад будзь яго відзець, шануй.

مَنْ كَانَ يُؤْمِنُ بِاللَّهِ وَالْيَوْمِ الآخِرِ فَلْيُكَرِّمْ ضَيْفاً[330]

Хто бы ў доме сваім госця быў рад відзець, шанаваць, Пан Бог такіх людзей у Раі, у ласцы Сваёй Божай рад іх будзе відзець і іх шанаваць. Шануй госця, хоць бы быў кяфірын.

***

﴿ وَمَا مَلَكَتْ أَيْمَانُكُمْ إِنَّ اللَّهَ لَا يُحِبُّ مَن كَانَ
مُخْتَالًا فَخُورًا ﴾[331]

(4:36) «Гасцей шануй і чаляднікаў вашых, бо пэўне Пан Бог не любіць, хто пыхлівы і сам сябе выхваляе».

﴿الَّذِينَ يَبْخَلُونَ وَيَأْمُرُونَ النَّاسَ بِالْبُخْلِ وَيَكْتُمُونَ مَا آتَاهُمُ
اللَّهُ مِن فَضْلِهِ وَأَعْتَدْنَا لِلْكَافِرِينَ عَذَابًا مُّهِينًا ﴾[332]

---

[329] (4:36): *"...і [як найлепей стаўцеся] да падарожнага".*

[330] "Хто верыць у Аллага і ў Апошні Дзень, хай як мага лепш ставіцца да госця". Аснова – варты даверу хадзіс, прыведзены ў Сахіху аль-Бухары: "Хто верыць у Аллага і ў Апошні Дзень, хай шануе свайго госця".

مَنْ كَانَ يُؤْمِنُ بِاللَّهِ وَالْيَوْمِ الآخِرِ فَلْيُكْرِمْ ضَيْفَهُ

[331] (4:36): *"і [як найлепей стаўцеся] да чэлядзі вашай. Папраўдзе, Аллаг не любіць пыхлівых ды ганарыстых".*

[332] (4:37): *"[Аллаг не любіць тых,] хто скнарнічае (=скупіцца) і падбухторвае да скнарлівасці іншых, прыхоўваючы тое, што Аллаг даў ім са Сваёй ласкі. А Мы падрыхтавалі нявернікам ганебную кару".*

(4:37) «Каторыя скупуюць, загадваюць людзям скупасць і ўтойваюць належнае (=тое, што належыць аддаць на закят), тое, што даў ім Пан Бог з ласкі Сваёй, а яны з таго не выдаюць закят, дзесяціну. За тое прыгатаваў Пан Бог для такіх нявернікаў пакуту (кару) пякельную, ганебную.[333]

## 12. Як шанаваць старых?

Мовіў Пан Бог: «Старога кажнага шануй і паважай. У гадах яго старых яго не засмучай».

قَالَ النَّبِيُّ ﷺ: [قَالَ اللهُ تَعَالَى] :

الشَّيْبَةِ النُّورِي ، أَنَا اَسْتَحْيِ أَنْ أُحْرِقُ نُورِي بِنَارِي .[334]

Старых барадатых, каторыя прыстойна, статэчна старасць сваю праводзяць, Пан Бог мовіў: «Устыдаюся іх казаць мучыць, бо ў іх

---

[333] Усе ўрыўкі з падраздзела: КЛ, 12Б – 13А.

[334] "Мовіў Прарок, мір над ім, [перадаючы ад Аллага]: "Сівізна – святло Маё, Я саромеюся паліць святло Сваё агнём Маім". Прыведзены хадзіс, відаць, пазакананічны (частка яго згадана ў "Энцыклапедыі слабых і некананічных хадзісаў", т. 14, № 29832). Аднак маюцца ўскосныя доказы праўдзівасці яго зместу: "Сказалі вучоныя, што Аллаг пасаромеецца караць сівізну, калі чалавек будзе саромецца Аллага (пазбягаючы грахоў і шчыра пакланяючыся Яму), а ў адным паданні (ад мусульман першых пакаленняў) перадаецца (ад імя Бога): "Сівізна – святла ад Майго святла, таму Я саромеюся караць святло Маё Агнём Маім, калі раб [Божы] саромеецца Аллага".

قال اهل العلم ان الله يستحي ان يعذب الشيبة فالانسان يستحي من الله وورد في الاثر ان الشيبة نور من نوري واني استحي ان اعذب نوري بناري فالعبد يستحي من الله

(крыніца: https://alwafd.news/%D8%AF%D9%86%D9%8A%D8%A7-%D9%88%D8%AF%D9%8A%D9%86/2447167-%D8%A7%D9%84%D9%84%D9%87-%D9%8A%D8%B3%D8%AA%D8%AD%D9%8A-%D8%A3%D9%86-%D9%8A%D8%B9%D8%B0%D8%A8-%D8%A7%D9%84%D8%B4%D9%8A%D8%A8%D8%A9)

барадах яснасць Мая Божая». То праўдзівае слова Пасла Божага ﷺ. Калі Пан Бог іх шануе, [то] і мы павінны старых шанаваць.[335]

## 13. Чаму трэба шанаваць вучоных?

Усту[336] свайго, імама бо і кожнага наўчонага шануй, паважай.

مَنْ أَكْرَمَ أُسْتَاذِ أَكْرَمَ اللهُ لَهُ فِي الدُّنْيا وَالآخِرَةِ

Хто усту свайго шанаваў, пашануе яго Пан Бог на гэтым свеце і на тым свеце.

مَنْ أَكْرَمَ عَالِماً فَقَدْ أَكْرَمَنِي النَّبِيًّا لَهُ أَكْرَمَ اللهُ تَعَالَى

Хто шануе вучонага, нібы шанаваў Прарока ﷺ, як бы шанаваў Пана Бога.

﴿ وَالَّذِينَ أُوتُوا الْعِلْمَ دَرَجَاتٍ ﴾[337]

Як у Кур’ане піша: «…бо наўчоным людзям найвышэйшае месца будзе ў Раі».[338]

***

مَنْ تَعَلَّمَ الْقُرْآنَ وَعَلَّمَ بِهِ الخَيرَ إِلَى وَجْهِ[339]

---

335 КЛ, 13А.

336 Устá – майстар, шэйх.

337 (58:11): *“Аллаг узвышае тых з вас, хто стаў вернікам, і тых, каму дадзены веды па ступенях (узнагароды і задавальнення)”.*

﴿ يَرْفَعِ اللَّهُ الَّذِينَ آمَنُوا مِنكُمْ وَالَّذِينَ أُوتُوا الْعِلْمَ دَرَجَاتٍ ))

338 Тут і да канца падраздзела: КЛ,13Б – 14Б.

339 “Тому хто, вучыцца чытаць Кур’ан і навучае гэтаму – дабро да твару”. Гэта выказванне па сэнсе нагадвае варты даверу хадзіс, прыведзены у Сахіху Бухары, у Сунанах Цірмізі, Абу Давуда і Ібн Маджы: “Лепшыя з вас тыя, хто вучыцца чытаць Кур’ан і навучае гэтаму”.

خَيْرُكُم مَنْ تَعَلَّمَ الْقُرْآنَ وَعَلَّمَهُ

Хто каго вучыць Кур’ану і хто вучыцца – абодвум спасенне роўнае.

***

قَالَ النَّبِيُّ ﷺ : مَثَلُ العُلَمَاءِ كَمَثَلِ الْأَمْطَارِ[340]

Прарок ﷺ мовіў: «Вучоныя людзі падобныя дажджу: як дождж памерлую зямлю ажывіць, калі адамскі чалавек грахі ўчыніць, нутры іх памруць, а іх нутры ажывіць навучанне ў вучоных людзей».

Многа сядзець трэба разам з вучоным, навукі слухаць. Тых вучоных святло чалавеку да нутра дойдзе; як шабляй высеча, ачысціць іх ад грахоў.

***

صُحْبَةُ العَالِمُ تَزِيدُ الإِيمَان

Хто сядзіць з наўчоным (пераймаючы яго веды) – шырыцца ў ім іман.

صُحْبَةُ الجَاهِلُ تَنْقُصُ الإِيمَان

Хто сядзіць з ненаўчоным – гіне ў ім іман.

## 14. Каго хоча Рай?

كُلِّ خَلْقٍ المُشْتَاق إِلَى الجَنَّةِ وَ الجَنَّةِ المُشْتَاق[341]

---

[340] “Мовіў Прарок, мір над ім: “Вучоныя падобны на дажджы”.
Гэта выказванне пераклікаецца з падобным хадзісам, прыведзеным у імама ат-Цірмізі, № 2869 (3109): “Мая грамада падобная на дождж: невядома, ці пачатак яго лепшы, ці то канец”.

مَثَلُ أُمَّتِي مَثَلُ الْمَطَرِ لاَ يُدْرَى أَوَّلُهُ خَيْرٌ أَمْ آخِرُهُ

[341] Ар. “Кожнае стварэнне тужыць па Раю, а Рай тужыць [не па кожным]”. Г. Мішкінене звяртае ўвагу, што пачатак – алюзія на аят (36:79): *“І Ён (Аллаг) – ведае пра кожнае стварэнне”.* ﴿وَهُوَ بِكُلِّ خَلْقٍ عَلِيمٌ﴾

Кожны чалавек хоча ў Рай, але Рай каго хоча?

Тых, пра каго ў Кур’ане піша:

(23:1-9) «Шчаслівыя людзі, каторыя вернымі мусульманамі сталі, пойдуць навекі да Раю; тыя, каторыя з баязню Божаю намаз кланяюцца;

тыя, каторыя ігры (марнаслоўя) не слухаюць;

і тыя, каторыя закят-дзесяціну выдаюць;

і тыя, каторыя блуду асцерагаюцца, толькі што з жонамі сваімі, <…>, а ад іншых будуць высцерагацца, не будуць жадаць іншых. Тыя людзі прыказанне Божае моцна дзержаць;

і тыя, каторыя цалкам *аманат* (=узятае на захаванне) аддаюць, хто каму што дакляруе (абяцае), пры сваім слове стаяць;

і тыя, каторыя заўжды вахту намазу (=час намазу) не апушчаюць, з джамаатам кланяюцца.

і тыя, каторыя галодных кормяць, і тыя, каторыя любяць наўчоных,

і тых, каторыя Кур’ан-хатым многа пяюць,

і тых, каторыя поснікаюць месяц Рамадан і намаз кланяюцца.

(23:11) Гэтыя людзі удзедзічаць (=успадкуюць) Рай, будуць у Фірдэўсю-Раю, вечна застануцца».[342]

## 15. У чым вартасць Кадыр-ночы?

Аб ночы Кадыр Пан Бог паведамляе, як у «Духан» сюрэю Пан Бог мовіў:

﴿ حم ۝ وَالْكِتَابِ الْمُبِينِ ۝

إِنَّا أَنزَلْنَاهُ فِي لَيْلَةٍ مُّبَارَكَةٍ إِنَّا كُنَّا مُنذِرِينَ ۝

[342] КЛ, 36Б – 37А. Не ўсе з пералічаных згаданы ў аятах 23:1 – 9, але ў цэлым сэнс перадаецца правільна.

فِيهَا يُفْرَقُ كُلُّ أَمْرٍ حَكِيمٍ ۝ أَمْرًا مِّنْ عِندِنَا إِنَّا كُنَّا مُرْسِلِينَ

۝ رَحْمَةً مِّن رَّبِّكَ إِنَّهُ هُوَ السَّمِيعُ الْعَلِيمُ ﴾[343]

Міласэрны Пан Бог у вялікасці боскасці Сваёй, моцай Сваёю Кур’ан, зрабіў складаную справу паслання Кур’ана. *«Пэўна, Я паслаў Кур’ан шчаслівай ночы Кадыр. Пэўне, застрашу люд Свой Кур’анам, у Кур’ане адлучаючы кожную трудную рэч ад году да году, добрую рэч і злую з Майго прыказання. Пэўна, Я прарокаў, паслоў Сваіх, паслаў для набыцця ласкі ад Бога, Стварыцеля Свайго. Пэўне, твой Бог чуе і ведае ўсё»*.

Вось Кадыр-ноч што [такое] і якой пазнакі ласкі Божай стала Мухаммаду-прароку ﷺ і умметам Мухаммадавым.[344]

***

Як Пан Бог піша:

بِسْمِ اللَّهِ الرَّحْمَٰنِ الرَّحِيمِ

﴿ إِنَّا أَنزَلْنَاهُ فِي لَيْلَةِ الْقَدْرِ ﴾

«Пэўна, Я паслаў Кур’ан табе, Мухаммад, Кадыр-ночы, і ўчынкі добрыя верных мусульман да ласкі Сваёй Божай прыму».

﴿ وَمَا أَدْرَاكَ مَا لَيْلَةُ الْقَدْرِ ﴾

---

343 (44:1-6): “1. Ха. Мім.
2. Клянуся ясным Пісаннем!
3. Сапраўды, Мы паслалі яго ў дабраславёную ноч. Папраўдзе, Мы заўжды засцерагалі.
4. У гэтую ноч вырашаюцца ўсе мудрыя справы
5. паводле Нашага загаду, які Мы [заўсёды] пасылаем
6. з ласкі твайго Госпада, – папраўдзе, Ён – чуе і ведае ўсё”.
344 КЛ, 16А.

«І, Мухаммад, што такое Кадыр-ноч і якое спáсенне? Хто шануе Кадыр-ноч, умметам тваім ласку Сваю Божую ўчыню».

﴿ لَيْلَةُ الْقَدْرِ خَيْرٌ مِّنْ أَلْفِ شَهْرٍ ﴾

«Ноч Кадыр лепшая ад тысячы месяцаў, у каторых Кадыр-ночы няма».

﴿ تَنَزَّلُ الْمَلَائِكَةُ وَالرُّوحُ ﴾

«Пасылаў з сямікрот нябёс ангелаў іх і з Джабраілем».

﴿ فِيهَا بِإِذْنِ رَبِّهِم مِّن كُلِّ أَمْرٍ

سَلَامٌ هِيَ حَتَّى مَطْلَعِ الْفَجْرِ ﴾

«У той ночы па загадзе Божым усім людзям, якія шануюць Кадыр-ноч, салям Божы даючы і ласку ім Божую асвядчаючы. Аж да сабаху той загад Божы маюць выконваць».

قَالَ النَّبِيُّ ﷺ : إِنْ وِمَنْ قَائِمُ لَيْلَةُ الْقَدْرِ لِهُ القَلْبِ لاَ يَمُوتُ[345]

Прарок, яго міласць, мовіў: «Хто бы Кадыр-ночы не спаў, намазам і тасбіхамі[346] яе славіў, такога чалавека нутро не памрэ», то бок, ад ласкі Божай ніколі не аддаліцца.

Іншыя кажуць: Кадыр-ноч – дваццаць пятага вечара Рамазана-месяца, але праўдзівей, што…

جَوَاب السَّبع وَالعِشْرِينَ رَمَضَانَ

…адказ на тое: Кадыр-ноч – дваццаць сёмая ноч Рамазана-месяца. Хто бы яе не спаў, а набажэнствам быў заняты, на Дзень Судны яго нутро жывым будзе.[347]

---

[345] Араб. “Той, хто бавіў Ноч Прадвызначэння (у намазе), сэрца яго не змярцвее”.
[346] Тасбіх – словы “Субхáна-Ллаг” (Прачысты Аллаг ад любых недахопаў).
[347] КЛ, 16Б – 17А.

## 16. Як і чаму трэба шанаваць пятніцу?

Не ўшануеце святой пятніцы святкаваннем-гуляннем, але трэба шанаваць намазам ды тасбіхамі.[348]

***

У пятніцу адна гадзі́на ёсць, хто бы тае гадзіны якое жаданне чыніў (=прасіў аб чымсьці), просьбу да Пана Бога – Пан Бог прыме.[349]

## 17. Як паводзіцца ў мячэці?

Хто бы прыніжаў Пана Бога, прынізіць яго Пан Бог, хто бы смяяўся-жартаваў (здзекуючыся з людзей або з веры) у мячэці, Пан Бог пусціць яго самога на смех людскі на гэтым свеце, а на тым свеце шайтанам учыніць.[350]

***

Хто бы ў мячэці седзячы, пакорным сэрцам быў да Пана Бога, узрадуе яго Пан Бог на гэтым свеце і на тым свеце.

Хто бы співаннем-зікірамі хвалу Божую аздобіў, прыаздобіць яго Пан Бог на гэтым свеце і на тым свеце.

***

Хто б ні шанаваў Пана Бога і Дом Божы – пашануе яго Пан Бог у Раі ласкаю Сваёю.

Хто любіць Пана Бога і Дом Божы – палюбіць яго Пан Бог самаго. Хто б ні быў з-за баязні Божай заўжды ў Доме Божым, абароніць яго Пан Бог ад страху Суднага дня.

Хто б ні быў з просьбамі-тасбіхамі ахочым (бадзёрым, пільным да свайго пакланенння), пакорным сэрцам у Доме Божым, у мячэці, – адпусціць Пан Бог яму, і матцы, і айцу грахі.[351]

---

[348] КЛ, 33Б.
[349] КЛ, 33А.
[350] Тут і далей: КЛ, 30Б.
[351] КЛ, 30Б – 31А.

## 18. Як іслам ставіцца да ведаў?

Мусульманіну кожнаму трэба навукі вучыцца, уменню выконваць абавязкі веры праўдзівай, мусульманскай. Сам вучыся, жонку і дзяцей вучы веры мусульманскай, вучы чытаць.[352]

### Невук горш за быдла

Пан Бог загадаў з ласкі Сваёй Прароку, яго міласці: «Скажы кожнаму мужчыне і жанчыне, калі хто чаго спытае, а ён не ўмее адказаць, калі скажуць: «Вучыся», – а яны не хочуць, – то такія людзі – як быдла, тых людзей намазы недаходныя (=не будуць прынятыя Богам) і веры пры іх няма, калі што такое іман, не знаюць».

Калі памрэ – такіх людзей сярод мусульманскіх магіл не хаваюць.[353]

Кожнаму чалавеку павіннасць дзеці свае вучыць веры мусульманскай і як выконваць належныя віды пакланення.[354]

***

*Джа́гіль*[355] – гэта невучоны, няўмелы і ў навуцы не дасведчаны. Праз злосць сваю іншым людзям гнеў Божы ўзрушае, за сваю злосць праціўны пісьму Божаму.[356]

### Ці трэба вучыць жанчын?

Калі *іман* пакінуў (не імкнуўся да рэлігійных ведаў) і не вучыў муж жонку, то той жонцы вольна без мужняга дазвалення да школы

---

[352] КЛ, 37А.

[353] Паколькі яны грэбавалі сваімі абавязкамі, адмаўляючы іх абавязковасць – а гэта выводзіць з ісламу. Але рашэнне па такіх пытаннях выносіць вучоны або ўпаўнаважаны мусульманскім кіраўніком адмысловы суддзя.

[354] КЛ, 40Б. Гэта строгая перасцярога для кожнага легкадумнага і неразумнага чалавека, які мяркуе, што належаць да пэўнага народу, пэўнай сям'і ці "парафіі" дастаткова для таго, каб лічыцца добрым, прававерным мусульманінам. Патрэбна пацвярджаць сваю веру адпаведнымі ўчынкамі і паводзінамі, інакш ёсць рызыка страціць самае дарагое, што ёсць у чалавека – іслам і іман.

[355] Невук

[356] КЛ, 48Б.

пайсці навукі вучыцца, іману, спосабу да веры мусульманскай належнай.

Калі жанчына спосабу да веры мусульманскай не ведае, то на тым свеце тром чалавека пакута будзе: першаму – мужу, другой – [самой] жонцы, трэцяму – брату, чаму не вучыў.[357]

## Вучоны і невук

Мусульманін – той, хто ведае прыказ Божы і спосаб да веры мусульманскай. Калі хто не ўмее і не слухае, чуўшы ад наўчонага, а не прыхіляецца да тых, якія прыказ Божы перадаюць, такі чалавек горшы за быдла[358], бо быдла розуму не мае. Хто навукі не знае, не ўмее нічога рабіць паводле веры мусульманскай, або чуўшы ад наўчоных людзей, не слухае; сваім умыслам што хоча, тое і робіць, такі чалавек – як быдла нямое.

Што быдла – дзеравам б’юць і прадаюць, яно ў людзей з рук да рук ходзіць. Так і той чалавек, што нічога з веры не знае, як быдла. Або горшы за быдла, бо ён мае розум, а не хоча наўмысля знаць. З такім чалавекам нягожа размаўляць, бо няма ў таго чалавека чаго пытаць. Што з ім гаварыць?

Бо хто практыку веры знае, [таго] не павядуць да Пекла. Але трэба кожнаму знаць: кожны чалавек, хто мусульманінам патрабуе навукі сам, і жонку, і дзеці навучай. Кожнага чалавека да веры мусульманскай навучай.[359]

---

[357] КЛ, 40Б.

[358] Параўн. (Кур’ан, 7:179):

وَلَقَدْ ذَرَأْنَا لِجَهَنَّمَ كَثِيرًا مِّنَ الْجِنِّ وَالْإِنسِ لَهُمْ قُلُوبٌ لَّا يَفْقَهُونَ بِهَا
وَلَهُمْ أَعْيُنٌ لَّا يُبْصِرُونَ بِهَا وَلَهُمْ آذَانٌ لَّا يَسْمَعُونَ بِهَا
أُولَٰئِكَ كَالْأَنْعَامِ بَلْ هُمْ أَضَلُّ أُولَٰئِكَ هُمُ الْغَافِلُونَ

*“Мы стварылі для апраметнай багата джынаў і людзей. У іх ёсць сэрцы, якія не разумеюць, і вочы, якія не бачаць, і вушы, якія не чуюць. Яны падобныя да быдла (скаціны), але яшчэ больш аблудныя. Яны і ёсць нядбайныя невукі”.*

[359] КЛ, 44А-44Б.

***

Хто б навукі не хацеў вучыцца і пытацца – той чалавек у вялікім граху і проста мае ісці да Пекла.[360]

## Вучоба – абавязак кожнага

Як Прарок, яго мілосць, мовіў:

قَالَ النَّبِيُّ عَلَيْهِ السَّلاَم :

طَلَبُ العِلْم فَرِيضَةٌ عَلَى كُلِّ مُسْلِمٍ وَمُسْلِمَةٍ

«Кожнаму мусульманіну і мусульманцы навук вучыцца – абавязак».

أُطْلُبُ العِلْمَ مِنَ المَهْدِ إِلَى اللَّهْدِ

«Шукай навукі, як выйдзеш з калыскі, аж пакуль не пойдзеш да магільнай дошкі».[361]

## Якая справа найкарыснейшая?

قَالَ النَّبِيُّ ﷺ : مَنْ تَعْلَمَ العِلْمَ وَعَلَّمَ بِهِ الخَيْر[362]

Прарок, яго мілосць, мовіў: «Хто навуку вучыць і хто вучыцца – абодвум спасенне роўнае».[363]

---

[360] КЛ, 67Б.

[361] КЛ, 44Б-45А.

[362] "Хто спазнае навуку і навучае ёй – дабро [абдвум будзе]". Дакладна з такім тэкстам хадзіс не быў знойдзены, але ёсць прынамсі адзін хадзіс, які ўказвае на яшчэ большую пашану да навучання. Імам аль-Бухары (5027) і іншыя прыводзяць хадзіс: "Лепшыя сярод вас (г.зн., мусульман) – той, навучаецца Кур'ану (правільнаму чытанню і разуменню) і выкладае яго". Безумоўна, асновай любых ведаў, важных у вечным сэнсе, з'яўляецца менавіта наша Святая Кніга. Арыгінал хадзіса:

خَيْرُكُمْ مَنْ تَعَلَّمَ الْقُرْآنَ وَعَلَّمَهُ

[363] Кл, 87Б.

## 19. Якая вартасць чытання і слухання Кур’ана?

Прарок, яго міласць, мовіў: «Кур’ан – гэта Слова Стваральніка, хто пяе [яго] ў чыстасці, таго спасенне ніхто не ведае, акром Пана Бога».[364]

***

Прарок ﷺ мовіў: «Хто Кур’ан пяе, а другія слухаюць удзячна, калі пасля чытання Кур’ана, Пана Бога прасіўшы (аб дараванні грахоў), анёлы пойдуць на неба, мовіць Пан Бог да анёлаў: «Дзе вы былі?» Адкажуць анёлы: «Пане Божа, былі мы на зямлі, [адны] слугі твае Кур’ан пяюць, а другія – слухаюць удзячна».

Пан Бог мовіць анёлам: «Будзьце сведкамі, што Я тых пяючых і слухаючых ад грахоў вольнымі ўчыніў».[365]

## 20. Якая вартасць ветлівасці?

Калі мусульманін другому мусульманіну *салям* дасць[366] – нібы ўсім мусульманам салям даў, такое спасенне будзе.[367]

***

[Як] насустрач адзін аднаму [ідучы], салям даць. Хто бы правую руку на левую руку шчапіўшы абедзьве рукі ніжэй пупа і яшчэ нахіліўшыся, салям даў, нібы год цэлы намаз пеў, ласкі Божай дасягне. Салям – гэта ласка Божая. Як без намазу, так і без саляму ласкі Божай няма. Салям даў – ласку Божую прынёс, салям не прыняў – ласкаю Божаю пагрэбаваў.

Салям даць – *сюннет*, прыняць – *фарз*. Не прыняў [салям] – грэх анёлы напішуць. <…> Конны дай салям уперад пешаму, [які ідзе] насустрач; багаты – дай уперад салям беззямельнаму; ненаўчоны – дай уперад наўчонаму; здаровы – дай салям уперад хвораму. <…> Хіба калі азан пяюць, у тым часе салям даваці і прыняці нельга, бо

---

[364] КЛ, 57Б.

[365] КЛ, 35А.

[366] Павітаецца словамі *“Ас-саляму ‘алейкум!”* (“Мір вам!”)

[367] КЛ, 31А.

азан мусульманскай веры вялікая пазнака, што да Божае ласкі кліча к намазу. І з госцем вітацца нельга, сегасветныя словы гаварыць нягожа, як азан пяюць.[368]

***

Хто бы ў мусульманскі ў дом увайшоў, [а] салям не даў – есці яму не дай.

Хто намазу не пеў – садагу яму не дай.

*Хто намазу не пяе – той Бога не знае,*
*Хто саляму не дае – Божу ласку забывае.*[369]

## 22. Бяры прыклад з лепшых

*У праўдзівую дарогу ідзі,*
*Шчырай ёсць хвала на свеце.*
*Шабляй так рубай, як Алей;*
*За веру, так моцна стой, як Умер;*
*[Будзеш такім,] як Усман – то будзеш мілы Прароку;*
*Будзе таварышам табе Абу Бекір*[370].[371]

[368] Кітаб Бекіра Радлінскага. Гл.: Тарэлка М. У. Фрагмент невядомага беларускататарскага рукапісу XVII стагоддзя. // Беларуская лінгвістыка, 2015, вып. 74. с. 36 – 46. С. 37 –.39

[369] Кітаб Бекіра Радлінскага. Гл.: Тарэлка М. У. Фрагмент невядомага беларускататарскага рукапісу XVII стагоддзя. // Беларуская лінгвістыка, 2015, вып. 74. с. 36 – 46..С. 39

[370] Абу Бакр (тут – Абу Бекір), Умар (Умéр), Усман, Алі (тут – Алей), хай будзе задаволены імі Аллаг, – паплечнікі Прарока ﷺ, якія пасля яго смерці па чарзе сталі халіфамі – кіраўнікамі ўсіх мусульман. Пры гэтым усе яны – вартыя даверу, праведныя і найлепшыя людзі пасля Прарока ﷺ. Самым лепшым і па праве кіравання, і па праве праведнасці стаіць Абу Бакр, пасля яго – Умар, затым – Усман, і замыкае гэты ланцужок Алі, хай будзе задаволены імі ўсімі Аллаг.

[371] КЛ, 134Г.

## 23. Расплата за грахі

- Якія людзі ідуць супраць Божага прыказання, Пан Бог ім беднасць дасць.
- Якія людзі збыткуюць (=шалеюць з раскошы, празмернічаюць, свавольнічаюць), п'янства многа чыняць, Пан Бог ім абы-якую смерць дасць.
- Якія людзі закят не даюць, Пан Бог ім дажджу не дасць.[372]

## 24. Як здабыць дабро ўжо на гэтым свеце?

Хто бы сорак ранкаў пасля намазу сардэчна Пана Бога прасіў, раскрые Пан Бог яго нутро ласкаю і напоўніць *іманам*, навукаю, розумам і дасць Пан Бог яго языку умеласць (здольнасць добра гаварыць).[373]

***

Хто б у пятніцу трох чалавекаў частаваў, нібы ад заходу да ўсходу ўсіх людзей частаваў. Калі ў пятніцу ў каго спытаў «Як маешся?», – нібы ўсіх людзей пра здароўе пытаў.[374]

## 25. Хто шчаслівы?

Шчаслівы чалавек, які той свет не забывае і знае, што той свет лепшы за гэты свет.[375]

## 26. Хто разумны?

Разумны той чалавек, што сам сваю работу робіць, а свой язык ад перагавору аберагае і ра́дзіцца, абменьваецца парадамі са сваім домам (=сям'ёй).[376]

---

[372] КЛ, 60Б – 61А.
[373] КЛ, 31А.
[374] КЛ, 31Б.
[375] КЛ, 41А.
[376] КЛ, 41А – 41Б.

## 27. Хто такі мусульманін?

Калі спытаюць: «Мусульманін хто такі?»

Кажы так: «Пана Бога расказанне (=загаданае Богам) прызнаўшы, аплошнасці ўсялякай (любых грахоў і недахопаў) высцерагацца трэба».[377]

## 28. Каго любіць Бог?

Пэўна, Пан Бог любіць мусульман верных.[378]

## 29. Якія асноўныя чалавечыя якасці і як іх зберагчы?

Чатыры рэчы чалавеку добрыя, за якія ласкі Божай [ён] годзен будзе. Гэта – розум, вера, устыдлівасць (=сарамлівасць, сціпласць) і ўчынак добры.

Чатыры рэчы ліхіх як учыніць, тыя чатыры добрыя згінуць:

як зазлуецца, то ў ім згіне розум;

як блуд учыніць – то ў ім згіне вера;

калі на што ўлакоміцца (=паквапіцца), то згіне ў ім устыд (сарамлівасць);

як перагавор учыніць – згіне яго добры ўчынак.

Тыя грахі ўчыніўшы – усё згубіць.[379]

***

Як мовіў:

أَرْبَعَ جَوَاهِرِ بَنِي أَدَمَ يُزِينَهَا[380]

«Чатыры рэчы чалавека здобяць, як дарагі камень:

العَقْلَ وَالدِّين وَالحَيَاء وَالعَمَل الصَّالِح[381]

---

[377] КЛ, 39А.
[378] КЛ, 44А.
[379] КЛ, 36А – 36Б. Заключныя словы паказваюць на тое, што вынікам падзення маралі можа стаць нявер’е, калі чалавек пад уплывам эмоцый кажа альбо робіць штосьці нагэтулькі жудаснае, што пачынае думаць, што Бог гэта не прабачыць.
[380] Чатыры каштоўнасці сыноў Адамавых аздабляюць:
[381] гэта розум, вера, сціпласць і добры ўчынак.

розум, вера, устыдлівасць, учынак добры.

أَمَّا أَرْبَعَ أَشْيَاءٍ خَرَبَهَا[382]

А чатырма рэчамі ліхімі тыя чатыры рэчы добрыя сапсуеш:

الغَضَبُ يَذِيدُ العَقْل[383]

як зазлуецца – загіне розум,

الزِّنَا يَذِيدُ الدِّين[384]

як блуд учыніць – загіне вера,

وَالطَّمْعُ يَذِيدُ الحَيَاء[385]

Як на што пакваніцца – так згіне ўстыд

الغِيبَةُ يَذِيدُ العَمَل[386]

Як перагавор учыніць – так загіне ўчынак добры.[387]

## 30. Што ўпрыгожвае чалавека?

شَرَفَ الإِنْسَانُ بِالْعِلْمِ وَالأَدَب

لاَ بِالْمَالِ وَلاَ بِالنَّسَب[388]

[382] Аднак чатыры рэчы разбураюць іх.
[383] Гнеў адбірае розум
[384] Пералюб адбірае веру
[385] Сквапнасць адбірае сціпласць
[386] Абгавор адбірае дабрачыннасць
[387] КЛ, 58Б – 59А.
[388] араб. "Узвышаецца чалавек ведамі і добрым норавам, а не маёмасцю і шляхетнасцю рода".

Аздобіць чалавека навука і цнота, не маетнасць і не ўрода (=паходжанне)[389].[390]

---

[389] Аўтар мае на ўвазе радавітасць.
[390] КЛ, 45А.
Калі казаць пра высновы з гэтага раздзела, то добры характар – аснова не толькі ў адносінах з людзьмі, але і ў адносінах з Госпадам, іншымі жывымі істотамі і навакольным светам. Іслам як рэлігія адзінабожжа вылучаецца ўвагай да маральных прынцыпаў. Асноўнай мэтай ісламу з’яўляецца стварэнне здаровага грамадства і стабільнага свету, які складаецца з вернікаў, адпавядаючых высокім этычным прынцыпам веравызнання.
Найслаўнейшы Прарок ﷺ яшчэ да таго, як на яго была ўскладзена прарочая місія, быў вядомы сярод жыхароў Меккі сваімі бездакорнымі паводзінамі, з-за чаго яго называлі “надзейным Мухаммадам” (Мухаммад аль-Амі́н). Ён сказаў: “Я быў пасланы для давядзення добрых норава ў да дасканаласці”. Той факт, што з першых дзён свайго прароцтва ён перадаваў людзям прынцыпы веры нароўні з прынцыпамі маральнасці, паказвае, наколькі моцная сувязь паміж верай і маральнымі нормамі ў ісламскай рэлігіі.
Іслам патрабуе, каб высокая мараль адлюстроўвалася заўжды і паўсюль. Бо шлях да Аллага і атрымання Яго дабраславення ляжыць праз добрыя адносіны з людзьмі без адыходу ад маральных нормаў. І шаноўны Прарок ﷺ у шматлікіх хадзісах казаў аб тым, што Аллаг злітуецца з таго, хто спагадны да людзей; Аллаг даруе таму і абароніць таго, хто сам прабачае людзей, не раскрываючы іх таямніц; Аллаг дасць багацце таму, хто частуе людзей; Аллаг не пакіне ў адзіноце і без дапамогі таго, хто дапамагае людзям у цяжкім становішчы. А той, хто мучыць людзей, уціскае іх правы, раскрывае іх дробныя памылкі, выяўляе скупасць у адносінах да госця, вандроўнага і сваяка, будзе пакараны Аллагам гэткім жа чынам. Паводле ісламу, добрыя норавы тычацца не толькі індывідуальных адносін, але і адносін паміж рабом і Аллагам.
Мусульманіну як асобе павінны быць уласцівы такія вартасці, як справядлівасць, спагада, любоў і пашана да Стваральніка, пакора, шчодрасць, надзейнасць, прыстойная гаворка, працавітасць, гасціннасць, салідарнасць і ўзаемадапамога. Паводле ісламу, вера, маральнасць і жыццё, поўнае шчырага пакланення, робяць чалавека шчаслівым і ў гэтым свеце, і ў вечным жыцці *(Скарочана паводле кнігі “Што такое іслам?”)*.

# Тры гісторыі з кітабаў

## Гісторыя пра абіда

Быў адзін а́бід[391] – багамолец ненаўчоны. Ішоў да мячэці, міма карчмы дарога была. Карчмарка сваю чалядніцу выслала, [каб] таго абіда ў свой дом паклікаць. Скора той абід увайшоў, [а яна] зараз [жа за ім] дзверы замкнула. У тае карчмаркі адно дзіця было. Карчмарка сказала: «Эй, абід, не выпушчу цябе, калі ты адзін куфаль гарэлкі не вып’еш, або са мною добрую волю (пералюб) не ўчыніш, або дзіця не заб’еш. Калі адну з тых трох рэчаў не ўчыніш, то цябе не выпушчу, гвалт крыкну, скажу: «Гэты абід мяне гвалціць!» Абід, тыя словы чуўшы пачаў мысліць: «Блуд учыніць – як да мячэці ісці? А дзіця у нявіннасці забіць… Лепей адзін куфаль гарэлкі выпіць і пайсці ад яе!»

Як выпіў адзін куфаль гарэлкі – упіўся, потым – і другі, п’яны стаў, з шынкаркай блуд учыніў і дзіця забіў. [392]

З тых прычын карчма – шайтанскі дом нячысты, усім грахам галава.

Эй, мусульмане, слухайце! Не чыніце тых грахоў, помніце на Судны дзень, што маем памерці, ведайце, што смерць нікога не адпусціць, ад яе ўцячы нельга.[393]

---

[391] Араб. عابِد “багамольца”, “той, хто моліцца Богу [не будучы вучоным]”.

[392] Параўн. хадзіс, прыведзены ат-Табарані ў «аль-Аўсат» (357), які апавядае пра тое, як аднаго сына Ісраілевага правіцель прымусіў на выбар здзейсніць адзін з грахоўных учынкаў: забойства дзіцяці, ужыванне свініны, пералюб, піццё віна або самагубства. Вырашыўшы, што найменшым злом будзе ўжыванне хмельнага напою, ён напіўся, пасля чаго страціўшы кантроль над сабой, рабіў любыя грахі, якія яму загадвалі. Падобны хадзіс прывялі Ібн Хіббан і аль-Хакім у “Мустадраку”, 7318.

[393] Кітаб Хасяневіча (1832), 130а. Цыт. па: Несцяровіч, В. Старажытныя рукапісы беларускіх татар (Графіка. Транслітарацыя. Агульная характарыстыка мовы. Фразеалогія): Манаграфія / В. І. Несцяровіч. – Віцебск: Выдавецтва УА “ВДУ імя П. М. Машэрава”, 2003. – 104 с.

## Дыялог Мусы з Богам

Муса-прарок у Пана Бога пытаў: «Пане Божа, ці спіш Ты?»

Пан Бог сказаў: «Муса, прынясі дзве шкленіцы (=шкляныя пасудзіны), поўна вады наліўшы».

Муса прынёс, поўна вады наліўшы.

Пан Бог сказаў: «Муса, вазьмі ў абедзве рукі».

Муса ўзяў. Пан Бог мовіў: «Трымай моцна».

Пан Бог на яго сон напусціў, Муса заснуў, шкленіцы з рук выпусціў, [яны] пабіліся, вада разлілася.

Пан Бог сказаў: «Муса, што чыніш, чаму шкленіцы пабіў, ваду разліў?»

Муса мовіў: «Пане Божа, зграшыў».

Пан Бог сказаў: «[Бачыш], Муса, [ты] заснуў і шкоду зрабіў. Калі б Пан Бог заснуў, зямля і неба з усім напаўненнем з моцы рук Маіх выпала б, і шкода была б. Таму Мне, Богу, не пасуе спаць на вякі вякоў».[394]

## Прыпавесць пра падзяку

Мусульманін кажа: «Хвала Богу, што мяне Пан Бог мусульманінам стварыў, а не іўдзеем».

Іўдзей кажа: «Хвала Богу, што мяне іўдзеем стварыў, а не *кяфірынам* (нявернікам)».

Кяфірын кажа: «Хвала Богу, што мяне Бог кяфірынам стварыў, а не сабакам».

Сабака кажа: «Хвала Богу, што Бог мяне сабакам стварыў, а не свіннёй».

Свіння кажа: «Хвала Богу, што мяне Бог свіннёй стварыў, а не ліхім чалавекам».[395]

---

[394] Кітаб Хасяневіча (1832), 131а. Цыт. па: Несцяровіч, В. Старажытныя рукапісы беларускіх татар (Графіка. Транслітарацыя. Агульная характарыстыка мовы. Фразеалогія): Манаграфія / В. І. Несцяровіч. – Віцебск: Выдавецтва УА “ВДУ імя П. М. Машэрава”, 2003. – 104 с.

[395] ВЭМ-28 (1-я траціна XIX ст.). Цыт. па: Несцяровіч, В. Старажытныя рукапісы беларускіх татар (Графіка. Транслітарацыя. Агульная характарыстыка мовы. Фразеалогія): Манаграфія / В. І. Несцяровіч. – Віцебск: Выдавецтва УА “ВДУ імя П. М. Машэрава”, 2003. – 104 с.

## Выкарыстаная літаратура

1. Антонович А. К. Белорусские тексты, писанные арабским письмом, и их графико-орфографическая система. Вильнюс, 1968. – 418 с.
2. Ivano Luckevičiaus kitabas – Lietuvos totorių kultūros paminklas = Китаб Ивана Луцкевича – памятник народной культуры литовских татар / Lietuvių kalbos institutas. Vilnius, 2009. – 800 p.
3. Мухлинский, А. Изследованіе о происхождении и состоянии литовскихъ татар. СПб, 1857. – 70 с.
4. Несцяровіч, В. Старажытныя рукапісы беларускіх татар (Графіка. Транслітарацыя. Агульная характарыстыка мовы. Фразеалогія): Манаграфія / В. І. Несцяровіч. – Віцебск: Выдавецтва УА «ВДУ імя П. М. Машэрава», 2003. – 104 с.
5. Тарэлка М. У. Фрагмент невядомага беларускататарскага рукапісу XVII стагоддзя. // Беларуская лінгвістыка, 2015, вып. 74. с. 36 – 46.

## Дадатковая літаратура для самастойнага вывучэння

1. Akiner, S. Religious language of a Belarusian Tatar Kitab / Shirin Akiner. – Wiesbaden: Otto Harrassowitz, 2009. – XXVII, 457 p.
2. Беларусь і цюркска-ісламскі свет : з нагоды 615-годдзя ўзнікнення татарска-мусульманскай супольні на землях ВКЛ : зб. навук. прац. – Мінск, 2015. – 155 с.
3. Drozd, A., Dziekan, M. M., Majda, T. (2000). Katalog Zabytków Tatarskich. Piśmiennictwo i muhiry Tatarów polsko-litewskich. Warszawa: Res Publica Multiethnica. – 150 s.
4. Думін, С. У., Канапацкі, І. Б. Беларускія татары: мінулае і сучаснасць. – Мн.: Полымя, 1993. – 206 с.: іл. – (На зямлі Беларусі ў згодзе).
5. З рукапіснай спадчыны татараў ВКЛ : тэксты і даследаванні : зборнік навуковых прац / Цэнтр даследаванняў беларус. культуры, мовы і л-ры НАН Беларусі, Ін-т мовазнаўства ; навук.рэд.: І. А. Сынкова, М. У. Тарэлка. – Мінск : Беларуская навука, 2022. – 177 с.
6. Канапацкі, І. Б., Смолік, А. І. Гісторыя і культура беларускіх татар: Вучэб. дапам // І. Б. Канапацкі, А. І. Смолік. – Мн.: Бел. ун-т культуры, 2000. – 259 с.

7. Klucz do raju. Księga Tatarów litewsko-polskich z XVIII wieku w przekładzie I opracowaniu Henryka Jankowskiego i Czesława Łapicza. Warszawa, 2000. – 257 s.
8. Мишкинене, Г. Древнейшие рукописи литовских татар (Графика. Транслитерация. Перевод. Структура и содержание текстов) Учебно-методическое пособие. Издательство Вильнюсского университета, 2001.
9. Станкевіч, Я. Беларускія мусульмане і беларуская літаратура арабскім пісьмом / Я. Станкевіч. Вільня, 1933.– 34 с.
10. Сутэр, П. Альфуркан татарскі. Каран-тэфсір татараў Вялікага Княства Літоўскага / Паўль Сутэр: пер. з ням. мовы І. Сынковай, В. Свяклы, М. Тарэлкі; пад рэд. Генадзя Цыхуна. – Мн., Тэхналогія, 2009. – 530 с.
11. Тарэлка, М. У. Адкуль пайшлі ідалы / Міхась Тарэлка, Ірына Сынкова. – Мн.: Тэхналогія, 2009. – 425 с.
12. Tyszkiewicz, J. Tatarzy na Litwie i w Posce. Studia z dziejów XIII–.XVIII w. Warszawa, 1989–.s 343
13. Цітавец, А. Кітабы – захавальнікі даўняй культуры беларускіх татараў // Беларускі гістарычны часопіс. – 2006. – № 9. С. 30 – 36.
14. Цітавец, А. Рукапісныя кнігі беларускіх татараў: сінтэз кніжных культур Усходу і Захаду // Здабыткі: дакументальыя помнікі на Беларусі / Нацыянальная бібліятэка Беларусі; складальнікі: Л. Г. Кірухіна, Т. І Рошчына. – Мн, 2007. – С. 148 – 159.

# المُخْتَار

## مِنَ الْمَخْطُوطَاتِ التَّتَار

تأليف وترجمة : داود رادكَوِچ

# المختار

## مِنَ الْمَخْطُوطَاتِ التَّتَر

تأ ليف وترجمة : داود رادكَويچ